

ПРА ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ЗБІРАЮЧЫ ГРЫБЫ? 3

ЯКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ АДКРЫВАЕ ДЭКРЭТ № 7? МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЛІПЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 127 (28743)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:**

*«Што датычыцца агульнай стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, то ў гэтым годзе яна зніжацца не будзе. Цяпер шэраг краін, у тым ліку Расія, ідуць па шляху павышэння стаўкі ПДВ. Лічу, што вялікае дасягненне для нашай краіны, што ў нас нават не вядуцца такія размовы. У нас дзейнічае мараторый на павышэнне падатковых ставак, давайце пакуль будзем прытрымлівацца яго. Магчыма, за тры гады з'явяцца дадатковыя крыніцы падаткаабкладання, тады можна будзе вярнуцца да гэтай тэмы. Пытанне вельмі сур'ёзнае, таму што ў бюджэце нашай краіны ўдзельная вага ПДВ значная, і ўсе крокі тут павінны быць дасканала выверадыя».*

# ЯГАДНЫ ЛІПЕНЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхары вёскі Кардон Шумілінскага раёна — муж і жонка Леанід і Галіна ШАКАРАВЫ *(на фота)* ужо цэлы тыдзень збіраюць спелыя чарніцы, бо ягадны лес побач, а ў вёсцы адкрыты нарыхтоўчы пункт. І кожны раз па чатыры вядры ягад яны прыносяць да нарыхтоўшчыцы і суседкі Вольгі ЛІТОЎКІ. Прыносяць лясныя дары і іншыя аднавяскоўцы, а таксама жыхары суседніх вёсак Ілава, Баркоў, Лявонава, Федзькава, бо ўраджай чарніц у гэтых мясцінах селёта сапраўды багаты.**

**— Два тыдні працягваецца ягадны сезон, — кажа Вольга Літоўка, — па сорак чалавек у дзень прыходзяць на нарыхтоўчы пункт.**

## КОРАТКА

- Буйная партыя новых беларускіх камбайнаў пачала працаваць на палях Грузіі.
- **Еўрапарламент адхіліў праект рэформы ў сферы аўтарскага права. Яна прадугледжвала ўвядзенне жорсткіх абмежаванняў для інтэрнэт-рэсурсаў.**
- Выступленне легендарнага японскага барытона мужчынскага вакальнага квартэта «Роял Найтс» Мікіты Ямасіта дасць старт святочным мерапрыемствам «Купалля» ў гарадскім пасёлку Бешанковічы Віцебскай вобласці.



- **У Беларусі ў Дзень Незалежнасці нарадзілася 181 дзіця, больш за ўсё малых з'явілася на свет у Мінскай вобласці — 35.**

■ На слыху

## Плаціць за «камуналку» будзем па-новаму. Хто і колькі?

**У нашай краіне пераглядаецца парадак разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі. У апошнія дні чэрвеня ўрад прыняў пастанову № 510, якой уносяцца істотныя змены і дапаўненні ў асноўны дакумент. Карэкціроўка гэтай пастановы звязана з новымі падыходамі да выканання найважнейшых дзяржаўных задач, да праблем энергазберажэння і эканоміі прыродных рэсурсаў, паведамляе Партал камунальнай адукаванасці насельніцтва. Да якіх змен нам трэба рыхтавацца?**

### Няма гарачага водазабеспячэння — не пераплачваем за электраэнергію

— Напрыклад, — тлумачыцца на Партале камунальнай адукаванасці насельніцтва, — крыху ўшчэмленымі выглядалі інтарэсы спажыўцоў, чые жылыя памяшканні не абсталяваны сістэмамі цэнтральнага гарачага водазабеспячэння і цэнтралізаванага забеспячэння прыродным газам. Карыстаючыся электрычным бойлерам, практычна немагчыма ўкласціся ў існуючы нарматыў спажывання электраэнергіі 150 кВт гадзін для аплаты па субсідаваных дзяржаўных тарыфах.

Таму для дадзенай катэгорыі нарматыў павышаны да 250 кВт гадзін. Больш за тое, пры спажыванні ад 250 да 400 кВт гадзін аплата таксама будзе праводзіцца па субсідаваных тарыфах, але з прымяненнем павышаючага каэфіцыента 1,3. І толькі пры перавышэнні 400 кВт гадзін плаціць прыйдзецца па эканамічна абгрунтаваных тарыфах. Такім чынам павышаецца ступень дзяржаўнай падтрымкі спажыўцоў гэтай катэгорыі і ў той жа час захоўваюцца стымулы для эканомнага расходавання электраэнергіі.

СТАР. 4

■ Ініцыятывы

## ШТО МОГУЦЬ СУСЕДЗІ

### Навошта вёсцы папулярнасць і дадатковыя суботнікі?

**Што рабіць, калі ў двары не хапае спартыўнай пляцоўкі, дарогі не рамантуюць і свята на вашу вуліцу ўсё не прыходзіць? Калі коратка, то адказ такі: хочаш вырашыць праблему — займіся ёй сам. «Звязда» пабывала на фестывалі «Добры сусед» і запісала прыклады, як жыхары, аб'яднаўшыся, могуць змяніць сваё населеныя пункты да лепшага.**

### Смаўжы і арт-лаўкі

Каб на вёску звярнула ўвагу ўлада і выдзеліла грошы на яе добраўпарадкаванне, трэба зрабіць яе папулярнай. У гэтым упэўнена **Любоў ЕРМАКОВА,** жыхарка вёскі Новае Поле Мінскага раёна. Жанчына працуе ў сферы турызму 12 гадоў і ведае, як знайсці ўнікальную рысу населенага пункта, якая зробіць яго прывабным для іншых.

— Можна вывучыць гісторыю, асаблівасці рэгіёна (культурныя, прыродныя), звярнуць увагу на забыты брэнд. Напрыклад, Смаргонь некалі была вядомая абаранкамі, Івянец — цукеркамі «Кароўка». У нашай вёсцы пазнавальны знак — гэта сядзіба Друцкіх-Любецкіх XIX стагоддзя, дзе цяпер знаходзіцца каледж. Мы выбралі гэты будынак для лагатыпа. У нас таксама шмат вінаградных смаўжоў. Як аказалася, у Друцкіх-Любецкіх была адмысловая ферма, яны пастаўлялі смаўжоў у Еўропу. Мы падумалі, што можна рабіць салодкіх «смаўжоў» — у выглядзе булачак. Людзі хочуць хлеба і відовішчаў, таму кулінарны брэнд заўсёды спрацоўвае.

Любоў прызнаецца, што спачатку на абмеркаваннях некаторыя мясцовыя пярэчылі супраць «раскруткі» вёскі. Ім хацелася цішыні і чысціні, а не натоўпу прыезджых.

— Хтосьці казаў: «Якія брэнды і лагатыпы? У нас дарогі дрэнныя — спачатку з гэтым трэба разабрацца». Але праз святы мы можам прыцягнуць увагу да праблем. Гэта дапаможа развіваць мясцовы бізнес, кавярні, рамесніцтва.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

# АПРАЎДАЦЬ ДАВЕР НАРОДА

**Пашырэнне ваенных блокаў і саюзаў на шкоду бяспецы іншых краін назіраецца ў сусветнай супольнасці. Аб гэтым учора заявіў Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўшанавання выпускнікоў вышэйшых ваенных навучальных устаноў і вышэйшага афіцэрскага складу.**

«На жаль, як я ўжо неаднойчы адзначаў, новае стагоддзе не прынесла чалавецтву пазбаўлення ад войнаў, — канстатаваў беларускі лідар. — У арсенале міжнародных адносін адным з інструментаў знешняй палітыкі па-ранейшаму застаецца ўзброеная агрэсія».

У гэтых няпростых умовах Беларусь паслядоўна праводзіць міралюбную палітыку, рэалізуе меры, якія захавалі б мір не толькі ў нашым рэгіёне.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, беларусы, як ніякая іншая нацыя, цэняць мір, бяспеку і незалежнасць. І, што натуральна, гэтыя найважнейшыя дасягненні народа маюць патрэбу ў надзейнай абароне.

Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што наша краіна прапанавала сусветнай супольнасці знешнепалітычныя ініцыятывы, у аснове якіх ляжаць ідэі зніжэння напружанасці і ўмацавання мер даверу ў рэгіёне. «Быццам бы нас чуюць, але дзеянняў пакуль не робяць — ясна чаму, — сказаў Прэзідэнт. — Таму мы вымушаны ўдасканальваць нашу нацыянальную абарону і ўдзяляць пільную ўвагу нашай бяспецы».

Вырашальную ролю ў павышэнні баяздольнасці нашых Узброеных Сіл выконваюць ваенныя кадры — людзі, якія прысвяцілі ўсё сваё жыццё абароне Айчыны.

«Вам трэба будзе вырашаць складаныя і адказныя задачы па забеспячэнні высокай вывучкі і зладжанасці органаў кіравання і войскаў. Навучаць падначаленых сучасным спосабам вядзення ўзброенай барацьбы, — звярнуўся да прысутных беларускі лідар. — Асаблівую ўвагу звярніце, калі ласка, на ўмацаванне воінскай дысцыпліны, выхаванне ў вайскоўцаў пільнасці і пачуцця ўзаемавыручкі. Вы павінны служыць прыкладам для падначаленых. Памятайце, што ва ўсе часы афіцэры з'яўляліся людзьмі абавязку, гонару і ўзорам дысцыплінаванасці».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што найважнейшай задачай органаў унутраных спраў застаецца надзейная абарона асобы, грамадства, дзяржавы ад любых злачынных замахаў. Выпускнікі ВНУ сістэмы МНС асноўныя намаганні павінны засяродзіць на папярэджанні надзвычайных сітуацый. Асаблівую ўвагу трэба будзе звярнуць на безаварыйную эксплуатацыю атамнай электрастанцыі.

«Супрацоўнікі спецслужбаў павінны забяспечыць недапушчэнне праяў тэрарызму і экстрэмізму, распальвання нацыянальнай, рэлігійнай, сацыяльнай варожасці, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Няпростыя міжнародныя абставіны, звязаныя з небяспекай тэрарыстычных нападаў, наркатрафікам, незаконнай міграцыяй, патрабуюць падтрымання на высокім узроўні баявой гатоўнасці органаў пагранічнай службы».

Прэзідэнт таксама павіншаваў афіцэраў з паспяховым заканчэннем вучобы.

«Абарона Радзімы — гэта нялёгкая, але высакародная праца. Беларускі народ верыць у вас, разлічвае на вашу адказнасць і высокі прафесіяналізм. Вы павінны апраўдаць гэты давер і годна выканаць ускладзеныя на вас задачы на вашым наступным службовым этапе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, беларускі лідар павіншаваў афіцэраў Узброеных Сіл, Міністэрства ўнутраных спраў і Дзяржаўнага мытнага камітэта з прысваеннем генеральскіх званняў, пажадаў усім поспехаў у святой справе служэння Айчыне і беларускаму народу.

За выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку лепшым з ваеннаслужачых аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта.

Акрамя таго, у адпаведнасці з указамі Прэзідэнта, чарговае воінскае званне генерал-маёра было прысвоена намесніку начальніка ўзбраення Узброеных Сіл — начальніку штаба ўзбраення Андрэю Федзіну, першаму намесніку начальніка тылу Узброеных Сіл — начальніку штаба тылу Аляксандру Панфёраву і начальніку Мінскага суворaўскага вучылішча Аляксандру Навуменку. Чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра міліцыі — начальніку УУС Віцебскага аблвыканкама Івану Кубракову і начальніку УУС Брэсцкага аблвыканкама Аляксандру Астрэйку.

Персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу было прысвоена **начальніку Гродзенскай рэгіянальнай мытні Андрэю КАВАЛЬЧУКУ.** У размове з журналістамі ён адзначыў, што сёння мытная служба гатова выконваць і выконвае свае абавязкі паспяхова, пацвярджэннем гэтага з'яўляецца ацэнка кіраўніка дзяржавы. «Нягледзячы на вельмі хуткія змены ў самім працэсе кантрольных функцый, якія выконвае мытня, на аўтаматызацыю, электронныя тэхналогіі, усё ж такі на першым месцы, безумоўна, стаіць супрацоўнік, — падкрэсліў Андрэй Кавальчук. — Той чалавек, які прымае самыя важныя рашэнні, якія не даверыў машыне. На сённяшні дзень і тыя кадры, якія служаць, і тыя, якія паступаюць, валодаюць дастатковым узроўнем ведаў. Калі ўзнікае неабходнасць, то яны праходзяць перападрыхтоўку ў нашым інстытуце, дзе спасцігаюць тыя тонкасці прафесіі, неабходныя для наступнага ўжывання».

Дарэчы, ваенны парад, які прайшоў у Мінску ў гонар Дня Незалежнасці, на думку Прэзідэнта, быў найлепшым у гісторыі суверэннай Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім, хто ўдзельнічаў у арганізацыі і правядзенні гэтага маштабнага мерапрыемства.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ■ Парламенцкі дзённік

# КІТАЙСКІ ПУНКТ РОСТУ

**Дэлегацыя КНР сумесна з беларускімі дэпутатамі абмеркавала ў Мінску заканадаўчы бок будаўніцтва ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».**

У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча **віцэ-спікера Баляслава ПІРШТУКА** з дэлегацыяй Народнага палітычнага кансультатыўнага савета КНР на чале з **намеснікам старшыні Камітэта грамадства і заканадаўчых прапаноў Люй ЧЖУНМЭЙ.** Абодва бакі абмяняліся думкамі аб стане і перспектывах развіцця міжпарламенцкіх сувязяў.

Баляслаў Пірштук адзначыў, што наша краіна зацікаўлена ў далейшым павелічэнні ўзаемнага тавараабароту з Кітаем. У сферы інтарэсаў беларускага боку асаблівае месца займае развіццё супрацоўніцтва ў сферы турызму.

У эканамічным блоку ён адзначыў Кітайска-беларускі індустрыяльны парк і завод легкавых аўто «БелДжы». Нямала праектаў рэалізавана ў прамысловасці, энергетыцы, стварэнні інфраструктуры.

Закранаючы перспектывы «Вялікага каменя», дзе зарэгістравана 36 рэзідэнтаў (прыкладна палова з якіх — кітайскія кампаніі), віцэ-спікер падкрэсліў, што Беларусь вельмі разлічвае, што індустрыяльны парк стане пунктам росту беларускай эканомікі і прывабнай візітнай карткай для інвестараў з іншых краін.

Баляслаў Пірштук нагадаў, што наступным этапам удзелу Беларусі ў праекце «Адзін пояс, адзін шлях» стане стварэнне транспартнага зялёнага калідора паміж Германіяй, Беларуссю і Кітаем.

У сваю чаргу Люй Чжунмэй адзначыла, што Кітай разлічвае на дынамічнае развіццё адносін з нашай краінай у эканамічнай і гуманітарнай сферах, для чаго неабходныя канкрэтныя заканадаўчыя правілы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ** ■

# Прадстаўнікі АБСЕ азнаёміліся з беларускай ваеннай тэхнікай

**З 4 па 6 ліпеня наша краіна праводзіць дэманстрацыю новых тыпаў сістэм узбраення і ваеннай тэхнікі для прадстаўнікоў дзяржаў — членаў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Гэта робіцца згодна з падпісаным у 2011 годзе Венскім дакументам. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.**

Сярод тых, хто прыехаў у Мінск, — прадстаўнікі з 19 краін, сярод якіх Вялікабрытанія, Венгрыя, Германія, Расія, Данія, ЗША, Украіна, Італія, Францыя, і цэнтра па папярэджанні канфліктаў АБСЕ.

— Мы хочам давесці да ўсіх зацікаўленых бакоў асноўныя напрамкі нашай абароннай палітыкі, паказаць, што Беларусь — гэта міралюбная дзяржава, — зазначыў **начальнік дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны Беларусі па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва генерал-маёр Алег ВОІНАЎ.** — Мы не маем тэрытарыяльных прэтэнзій ні да кога з суседзяў. Але ў нас ёсць армія, ёсць новыя ўзоры ўзбраення і тэхнікі, якія змогуць надзейна абараніць рэспубліку. Думаю, што гэтае мерапрыемства здыме многія пытанні. І мы будзем больш давяраць адно аднаму, да чаго, уласна кажучы, і імкнёмся.

Рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз», якая паступіла на ўзбраенне ў 2016 годзе, і 120-міліметровы мінамёт 2Б23 «Нона М1» былі прэзентаваны прадстаўнікам краін АБСЕ ў размяшчэнні 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ТУРЦЫІ АБВЯСЦІЛІ КАНЧАТКОВЫЯ ВЫНІКІ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ



Вышэйшы выбарчы савет Турцыі апублікаваў канчатковыя вынікі прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў. Пераможцам прэзідэнцкіх выбараў названы Рэджэп Таіп Эрдаган з вынікам 52,59 %. Яго найбліжэйшы канкурэнт ад Народна-рэспубліканскай партыі Мухарам Інджэ атрымаў 30,7 працэнта галасоў. Турэцкі ўрад перадаў свае паўнамоцтвы прэзідэнту краіны Эрдагану ў рамках пераходу ад парламенцкай да прэзідэнцкай формы кіравання. Указ быў апублікаваны ў выданні Resmi Gazete, перадае Anadolu. Адзначаецца, што гэты дакумент уносіць змены ў шэраг законаў, якія існавалі ў рэспубліцы з 1924 года. Асноўныя змены датычацца перадачы прэзідэнту выканаўчых паўнамоцтваў прэм'ер-міністра і ўрада краіны. Яны ўступяць у сілу з моманту прынясення прэзідэнтам прысягі. 9 ліпеня ў 16.00 па мясцовым часе (супадае з мінскім) у Турцыі адбудзецца інаўгурацыя прэзідэнта, перадае Hurriyet Daily News. Чакаецца, што кіраўнік дзяржавы таксама назаве склад новага ўрада.

## КІТАЙ УСТАЛЯВАЎ СУСВЕТНАЕ ПАНАВАННЕ Ў ФІНАНСАВЫМ СЕКТАРЫ

Чатыры найбуйнейшыя банкі Кітая занялі першыя чатыры радкі штогадовага сусветнага рэйтынга Топ-1000 брытанскага часопіса The Banker. У аснове рэйтынга ляжыць паказчык капіталу першага ўзроўню. Так, ICBC захоўвае лідзіруючыя пазіцыі ўжо на працягу шасці гадоў, яго капітал ацэньваецца ў 324 мільярды долараў. На другім месцы апынуўся China Construction Bank (272 мільярды долараў), трэці радок займае Bank of China (224 мільярды долараў), а замыкае чацвёрку Agricultural Bank of China (218 мільярдаў долараў). Кітай таксама абагнаў іншыя краіны па прыросце прыбытку банкаўскай галіны, гаворыцца ў каментарыі аналітыкаў. Так, паказчык КНР склаў 29,3 мільярда долараў. На другім радку размясціліся банкі Італіі, на трэцім месцы — брытанскія банкі. Раней эканамісты выказалі меркаванне, што гандлёвая вайна ЗША з Кітаем можа не нашкодзіць, а дапамагчы азіяцкай краіне, справакаваўшы скачок яе эканамічнага развіцця.

## У КАНАДЗЕ АД СПЁКІ ЗАГІНУЛА 18 ЧАЛАВЕК



Па меншай меры 18 чалавек загінула з-за моцнай спякоты і вільготнасці ў канадскай правінцыі Квебек. Пра гэта паведамляе Global News. Па даных улад, усе ахвяры — людзі старэйшыя за 50 гадоў і грамадзяне, якія пакутуюць на хранічныя захворванні дыхальных шляхоў. Тэмпература паветра зараз складае каля 32 градусаў па Цэльсію, што на 10 градусаў вышэй за сярэднія паказчыкі ў гэты час года, паведамляюць метэаролагі. Па прагнозах сіноптыкаў, гарачае надвор'е пратрымаецца яшчэ як мінімум два дні. Прэм'ер-міністр краіны Джасцін Трудо ў сваім твітэр-акаўнце выказаў спачуванні родным і блізкім загінулых.

## ЗША ПРЫРАСЛІ НА 555 АКРАЎ

Плошча Вялікага вострава, найбуйнейшай часткі амерыканскага штата Гаваі, павялічылася больш чым на два квадратныя кіламетры з-за сцякання лавы вулкана Кілаўэа, які вывяргаецца з мая, у акіян. Пра гэта паведамляе Геалагічная служба ЗША ў твітэр-акаўнце. «Сцякаючы ў акіян, лава стварыла 555 акраў (2,25 квадратнага кіламетра) новай зямлі», — адзначыла служба. Як паведамляе Express, прафесар Адкрытага ўніверсітэта Дэвід Ротэр адзначыў, што частка новай зямлі з часам абрынецца ў мора, таму канчатковы памер вострава, магчыма, павялічыцца не вельмі моцна.

# НЕВЫРАШАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ НЕ БЫВАЕ

**У суботу ў аблвыканкамах адбудуцца традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі.**

7 ліпеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:

першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР, тэл. 80162213121;

першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ, тэл. 80212222222;

старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЯНКЕВІЧ, тэл. 80232331237;

старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ, тэл. 80152735644;

старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК, тэл. 80222501869;

кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ, тэл. 80175004160;

першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ, тэл. 80172224444.

■ Небяспека

# ЯДОМЫ ЦІ ЯДАВІТЫ?

## Пра што трэба памятаць, збіраючыся па грыбы

**Пачатак ліпеня, які выдаўся дажджлівым, даў надзею ўсім грыбнікам на хуткі ўраджай. Але каб эйфарыя знаходжання лясных дароў не зацямніла здаровы розум, нагадаем пра небяспеку атручэння грыбамі.**



Статыстыка сведчыць, што з больш чым трох тысяч шапачковых грыбоў толькі чатыры сотні прыдатныя да яды. Астатнія так ці іначай небяспечныя. Да таго ж важна памятаць, што грыбы з'яўляюцца прадуктам, які складана ператраўліваць нашаму арганізму. Таму не рэкамендуецца ўжываць іх цяжарным і кормячым жанчынам, яны супрацьпаказаныя дзецям, прычым незалежна ад спосабу і працягласці прыгатавання, а таксама людзям сталага ўзросту.

Спачатку вызначымся, што такое атручванне грыбамі. Кожны грыб змяшчае рэчывы, якія пераварваюцца або не пераварваюцца нашым арганізмам. Калі рэчывы, якія трапілі ў страўнік, аказваюцца мацнейшымі за фермент, што выпрацоўваецца нашай стрававальнай сістэмай, то разгараецца сапраўдная вайна. Хімічны элемент, вызваліўшыся з абалонкі грыба, атакуе самыя важныя чалавечыя органы: печань, ныркі, кішэчнік, страўнік. Тыя, безабаронныя перад хімічнай атакай, пачынаюць губляць клеткі, разбурацца — у выніку спыняюць сваю дзейнасць... Але гэта ў горшым выпадку. Дарэчы, мінулы ўраджайны на грыбы год стаў для беларускіх трансплантолагаў выпрабаваннем на прафесіяналізм. Паводле інфармацыі **кіраўніка РНПЦ трансплантalогіі органаў і тканак, доктара медыцынскіх навук, прафесара Алега РУМО,** летась у Беларусі было выканана чатыры тэрміновыя трансплантацыі печані пацыентам, якія атруціліся грыбамі. Адну жанчыну, маці пяцярых дзяцей, выратавалі, на жаль, не ўдалося: перасадку печані ёй паспелі зрабіць, але галаўны мозг да таго часу загінуў... Больш пашчасціла маладому мужчыну, які самастойна выхоўвае дваіх дзетак, — яго жыццё медыкі выратавалі паспелі.

Смяротна небяспечныя для чалавека, напрыклад, бледная паганка і яе сваякі па відзе, якія грыбнікі прымаюць за сыраежкі, шампіньёны, грыбы-парасонікі. Для таго каб атрымаць смяротную дозу яду, дастаткова 1 г паганкі на 1 кг вагі. Такім чынам, чалавек, які важыць 70 кг, з'еўшы ўсяго адну паганку вагой 70 г, рызыкуе не выжыць. Астатнія грыбы, нават мухаморы і валаконніцы, заражаны ядам у значна меншай ступені.

Але ў любым выпадку вострае атручэнне — цяжкае выпрабаванне для арганізма. У момант прыезду хуткай дапамогі ў такіх хворых адзначаюцца парушэнні артэрыяльнага ціску і частаты сардэчных скарачэнняў (аж да развіцця сардэчных блакад і спынення сэрца) і нават стан комы. Таму без тэрміновай медыцынскай дапамогі не абысціся: не раздумваючы выклікайце «хуткую».

**Першая дапамога**

Да прыезду ўрачоў неабходна выпіць 400—500 г вады пакаёвай тэмпературы, выклікаць рвоту (пажадана некалькі разоў, да чыстай вады), а затым прыняць актываваны вугаль (чым больш, тым лепш).

**Сімптомы**

Асноўныя прыкметы атручэння грыбамі з'яўляюцца ўжо праз 1,5—2 гадзіны пасля іх ужывання, але можа прайсці і больш часу — да 24 гадзін. Гэта млоснасць, ірвота, моцны боль у жываце з дыярэяй да 10—15 разоў на суткі, павышаная тэмпература цела, слабы пульс, халодныя рукі і ногі, запаленне страўніка і тонкага кішэчніка (вострыя гастраэнтэрыт). Могуць пашырыцца ці звузіцца зрэнкі, з'явіцца слінацячэнне. Пры атручэнні мухаморамі, сатанінскім грыбам, несапраўднымі апенькамі магчыма з'яўленне трызнення, галюцынацый, чалавек можа знаходзіцца ў стане, блізкім да вар'яцтва.

**Алена КРАВЕЦ**

# ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

**Заўтра ў Шклоўскім раёне распачынаецца міжнароднае свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»). Вось дзе можна правесці купальскія выхадныя запамінальна, цікава і весела.**




ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### НА БРЭСТЧЫНЕ СТАРТАВАЛА ЎБОРКА ЗБОЖЖАВЫХ

**Аграрыі вобласці пачалі ўборку азімых ячменю, пшаніцы, рапсу, іншых культур. З-за працяглай засухі кампанія стартавала раней за звычайнае.**

А тут яшчэ дажджы перыядычна праходзяць, якіх так чакалі, калі колас наліваўся.

Экстрэмальнай назваў сёлетнюю ўборку **намеснік старшыні Жабінкаўскага райвыканкама Аляксандр КУЧЫНСКІ:**

— Ну хоць б таму, што вынікі ў розных гаспадарках вельмі адрозніваюцца, а праца і сродкі на вырошчванне той ці іншай культуры затрачваліся прыкладна аднолькавыя. Напрыклад, ААТ «Вазнясенскі» атрымала з гектара 61 цэнтнер азімага ячменю, а сельгаспрадпрыемства «Арэпічы» — толькі 17,4 цэнтнера, бо тут палеткі з гэтай культурай літаральна выпаліла сонца. Азімы ячмень ужо ўбралі ўсе гаспадаркі раёна, ураджайнасць на круг выйшла каля 43 цэнтнераў. Зараз расліводы выйшлі на ўборку рапсу. Працягваецца і кормнарыхтоўка. Пакуль прагнозы можна рабіць вельмі асцярожна, але спадзяёмся, што зімоўку правядзём нармальна, без эканамічных страт.

У абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама паведамілі, што ўсе раёны вобласці, акрамя Маларыцкага, пачалі ўбіраць азімы рапс. Вядзецца ўборка азімых ячменю і пшаніцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ВЕЛАПРАБЕГ ДЗЕЛЯ БАРАЦЬБЫ З ХВАРОБАЙ

**8 ліпеня ў Мінску ўпершыню пройдзе велапрабег, прысвечаны барацьбе з анкалагічнымі захворваннямі ў жанчын. Ride4women праводзіцца з 2014 года, сёлета ён стартаваў у Таліне 2 ліпеня і ўпершыню пройдзе праз Мінск, а завершыцца ў Вене 15 ліпеня.**

Асноўнай мэтай акцыі з'яўляецца прыцягненне грамадскай увагі да здароўя жанчын. Вядома, што некаторыя анкалагічныя захворванні, такія як рак шыйкі маткі, у жанчын можна прадухіліць і перамагчы. *«Ён узнікае больш чым у 58 тысяч жанчын у Еўропе, з'яўляецца чацвёртай па распаўсюджанасці лакалізацыяй і штогод забірае больш за 24 тысячы жыццяў штогод. У Беларусі на рак шыйкі маткі кожныя два дні захворваюць пяць жанчын. Але калі мы будзем уважлівыя да сябе, то будзем хутчэйшыя за рак, і ён не паўстане ніколі ў 80 % жанчын», —* расказваюць арганізатары.

Для веласіпедыстаў перакрыюць першыя палосы на двух галоўных праспектах сталіцы — Незалежнасці і Пераможцаў. Далучыцца да мерапрыемства можа любы ахвотны. У 9.30 удзельнікі збяруцца каля Нацыянальнай бібліятэкі, старт запланаваны на 10.30. Завершыцца мерапрыемства канцэртам каля Палаца спорту, там будзе працаваць кірмаш-продаж вырабаў раместнікаў-анкапацыентаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

### НЕ БЯРЫЦЕ ДОЛАРЫ З РУК

**У нашай краіне ў першым квартале часцей за ўсё падраблялі долары і расійскія рублі. Пра гэта паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка Беларусі.**

Усяго па выніках першых трох месяцаў года банкаўскія работнікі выявілі 216 падробленых грашовых знакаў. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года агульная колькасць выяўленых падробленых каштоўных папер зменшылася на 20 %.

Сярод выяўленых падробленых грошай 59,7 % склалі долары, доля расійскіх рублёў — 24,5 %, еўра — 13 %, беларускіх рублёў — усяго 2,8 %. У параўнанні з першым кварталам мінулага года колькасць амерыканскіх фальшывак вырасла на 9,3 %. Колькасць выяўленых падробленых расійскіх рублёў скарацілася трохі менш чым у 2 разы, падробленых еўра стала менш на 17,6 %. А пік падробленых беларускіх рублёў у абсалютным выражэнні знізіўся на 10 банкнотаў.

Сярод падробленых даляраў, як і раней, пераважалі банкноты наміналам 100 USD — 93 %. А ў шэрагу «шэрых» расійскіх рублёў у асноўным банкноты наміналам 5 тысяч і 1 тысяча — адпаведна 62,3 % і 35,8 %. Сярод падробных еўра пераважалі банкноты наміналам 50 еўра — 57,1 %. Была выяўлена падробка і манеты наміналам у 2 еўра.

Акрамя таго, у банкаўскай сістэме былі выяўлены два падробленыя банкноты беларускіх рублёў узору 2009 года наміналамі 20 рублёў і 5 рублёў, астатнія — узору 2000 года (4 банкноты).

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Надвор'е

# ПАЦЯПЛЕЕ, АЛЕ НЕ БЕЗ ДАЖДЖУ...

## Удзень месцамі чакаецца да 25—27 цяпла

**Першыя дні ліпеня выдаліся халоднымі і дажджлівымі, але затым надвор'е палепшылася. Да канца тыдня ў нашай краіне чакаецца ўмерана цёплае надвор'е, але без дажджоў не абыдзецца, паведамляе Белгідрамет.**



Заўтра і ў нядзелю на тэрыторыю краіны працягнуць паступаць няўстойлівыя паветраныя масы з акваторыі Балтыйскага мора. У суботу ўначы ў асобных раёнах, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—15 цяпла. Удзень будзе ад плюс 18 да плюс 25 градусаў, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да 27 цяпла. У нядзелю ўначы ў асобных раёнах, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 10 да плюс 15 градусаў. Удзень будзе ў асноўным 18—24 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны — да плюс 26 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца няўстойлівае надвор'е. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 цяпла. А ўдзень будзе ад плюс 17 да плюс 23 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 25 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Падзея

# Чалавек сваёй справы

## У Мінску ўзнагародзілі найлепшых топ-менеджараў

**Найлепшых кіраўнікоў айчынных і замежных кампаній па версіі бізнес-часопіса «Дело (Восток+Запад)» назвалі падчас конкурсу «Чалавек сваёй справы — 2018». Пераможцаў вызначылі ў 15 намінацыях, а асаблівасцю сёлетняга мерапрыемства стала вялікая колькасць прадстаўнікоў з рэгіёнаў.**

Сярод лаўрэатаў — кіраўнікі прадпрыемстваў, якія ў дадатковым прадстаўленні не маюць патрэбы: генеральны дырэктар прамысловага гіганта Беларусі ААТ «БелАЗ» — кіруючая кампанія «БелАЗ-Холдынг» **Пётр ПАРХОМЧЫК**, генеральны дырэктар ААТ «Магілёўліфтмаш» **Барыс КАВАЛЕЎСКІ**, дырэктар ААТ «Віцебскі мясакамбінат» **Віктар ПАЗНЯК**, генеральны дырэктар ААТ «Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў» **Віталь ДЗЕРАШ**, старшыня праўлення ААТ «Статусбанк» **Уладзімір ДРАГУН**, дырэктар ААТ «КБ Радар» — кіруючая кампанія холдынга «Сістэмы радыёлакацыі» **Ігар САДОЎСКІ**, дырэктар ААТ «Світанак» **Юрый ЛУКАШЭВІЧ**, дырэктар ААТ «Тураўскі малочны камбінат» **Вольга ЛУЦКО**.

Кожнае з названых прадпрыемстваў дасягнула поспехаў і мае свае падставы для гонару. Прадукцыі на паўмільярда долараў паставіў на экспарт за палову бягучага года БелАЗ, і да канца года плануе гэту лічбу падвоіць. Геаграфія яго экспарту — 75 краін свету, і сёння прадпрыемства скарае Афрыканскі кантынент, беларуская самазвалы працуюць у ПАР, Зімбабвэ і Марока. Больш за 270 найменняў лекавых сродкаў 12 фармакалагічных груп выпрабляе Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў, а кожная чацвёртая ўпакоўка лекаў у Беларусі выраблена на гэтым прадпрыемстве. Амаль палова айчыннага экспарту лекавых сродкаў — 47 % — прыпадае на долю барысаўскага вытворцы, сёння яго прэпараты прадаюцца ў 22 краінах свету. Больш за 20 краін свету — такая геаграфія паставак прадпрыемства «Магілёўліфтмаш», якое сёння таксама актыўна асвойвае Афрыканскі кантынент.

Таксама лаўрэатамі конкурсу сталі генеральны дырэктар ААТ «Гомельбудматэрыялы» **Станіслаў ЖАРОМСКІ**, дырэктар ААТ «Пружанскі завод радыёдэталяў» **Віктар КАЛІХ**, старшыня ГА «Беларускае таварыства ацэншчыкаў» **Мікалай ТРЫФАНАЎ**, дырэктар ААТ «Спецжалезабетон» **Васіль БАСЕВІЧ**, дырэктар «Новага радыё» **Уладзімір БОГДАН**, генеральны дырэктар турыстычнага прадпрыемства SOLVEX **Аксана БІЧУН**, генеральны дырэктар РУП «Магілёўаблгаз» **Аляксей КУШНАРЭНКА**.

Як адзначыла в. а. генеральнага дырэктара — галоўнага рэдактара часопіса «Дело (Восток+Запад)» **Вольга ЖДАНОВІЧ**, найлепшых топ-менеджараў вызначаў рэдакцыйны савет часопіса, куды ўваходзяць аўтарытэтныя беларускія прадпрымальнікі, эканамісты, грамадскія дзеячы. Вылучалі кандыдатуры прадпрымальніцкія саюзы, міністэрствы і грамадскія аб'яднанні дзелавых людзей. Сёлета рэдсавету прыйшлося зрабіць няпросты выбар з больш чым сотні кандыдатур.

**Алена КРАВЕЦ**

# Плаціць за «камуналку» будзем па-новаму...

### Зніжкі на ацяпленне

Будзе рэалізаваны новы падыход да разлікаў за спажыванне цяпла. З 1 студзеня бягучага года ва ўсіх новых дамах жыхары абавязаныя праводзіць разлікі за цеплавую энергію па паказаннях прыбораў індывідуальнага ўліку. Пасля ўступлення пастановы ў сілу стымул для абсталявання жылых памяшканняў прыборамі ўліку з'явіцца і ў жыхароў дамоў старэйшага пакалення. Тыя, хто ўстановіць за свой кошт такія прыборы, пры аплаце рахункаў за спажытую цеплавую энергію на працягу трох гадоў атрымаюць 10-працэнтную зніжку.

Асобная размова пра дамы, якія ўжо абсталяваны прыборамі ўліку, але частка іх жыхароў так і не адважылася пакуль карыстацца дадзенымі тэхнічнымі сродкамі пры разліках. Зразумела, што за час вымушанай бяздзейнасці сістэмы маглі стаць няспраўнымі, некаторыя з іх патрабуюць правядзення працэдуры паверкі, кошт якой складае каля 70 рублёў. Так што абсталяванне, на якое калісьці былі патрачаны грошы, ператварылася ў непатрэбны атрыбут. Зніжку ў 5 % на аплату цяпла атрымаюць тыя, хто прывядзе яго ў парадак на працягу трох гадоў у якасці кампенсацыі за панесеныя выдаткі.

Тыя ж, хто па-ранейшаму збіраецца ігнараваць магчымасць разлікаў за цяпло па паказаннях індывідуальных прыбораў, рызыкуюць трапіць у катэгорыю безлікавых спажыўцоў з усімі фінансавымі наступствамі.

### Не плаціць за смецце, якога няма

Абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі адносіцца да асноўных жыллёва-камунальных паслуг, і нават адмова ад заключэння дагавора не вызваляе ад гэтай паслугі. Дадзеная норма абмеркаванню не падлягае, але ў гарадскіх жыхароў, якія маюць дачы, узнікае справядлівае пытанне: пражываю на лецішчы максімум тры месяцы, а плаціць трэба круглы год. Зараз ад вывазу смецця можна будзе адмовіцца. На час. Але не ўсім.

Пастанова прадугледжвае магчымасць прыпынення аказання дадзенай паслугі на тэрмін да шасці месяцаў у каляндарным годзе. Для гэтага трэба звярнуцца з заявай у арганізацыю, якая ажыццяўляе вываз адходаў або робіць разлік і налічэнне платы. Асабліва трэба падкрэсліць, што дадзеная норма датычыцца аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, у якіх адсутнічаюць зарэгістраваныя па месцы жыхарства грамадзяне.

### Камусьці — двухадрасная субсідыя

Асобныя жыхары зараз атрымалі права рабіць аплату за паслугі электра- і газазабеспячэння па субсідаваных тарыфах у двух жылых памяшканнях: па адрасе абавязковай рэгістрацыі па месцы жыхарства і рэгістрацыі па месцы знаходжання. Прычым другі адрас можна выбраць па жаданні: усё роўна, што гэта — кватэра ў іншым горадзе, дача або дом у садовым таварыстве. Але рабіць гэта могуць толькі непрацуючыя пенсіянеры, а таксама асобы, якія маюць права на льготы па аплаце ЖКП, або інваліды 3-й групы.

Дадзеную норму можна назваць праявай сацыяльнай палітыкі, адзначае партал gkx.by, хоць ёсць у гэтым рашэнні і эканамічная справядлівасць. Дапусцім, пенсіянер ці іншы льготнік працоўнымі адносінамі не звязаны і можа цёплы час года праводзіць у вёсцы ці гарадскім пасёлку, а на зіму перабірацца ў добраўпарадкаваную кватэру. Раней па адным з двух адрасоў ён вымушаны быў аплачваць паслугі па эканамічна абгрунтаваных тарыфах. Але ж ад пераезду сума спажывання электраэнергіі або газу ў двух памяшканнях не змяніцца.

### Асобны кранік на паліў агарода

Норма спажывання вады для аплаты па субсідаваных тарыфах складае 140 літраў у суткі на чалавека, і эканомныя грамадзяне цалкам укладваюцца ў дадзены ліміт. Але гаспадарам індывідуальных дамоў, якія трымаюць жывёлу, а летам вымушаныя палівацьагароды, краны даводзіцца адкрываць значна часцей. Страшнага ў гэтым нічога няма, паколькі перарасход вады акупляецца атрыманай сельскагаспадарчай прадукцыяй. Спрэчны момант заключаўся ў іншым.

У гарадской кватэры вада з сеткі зліваецца ў каналізацыю, а значыць, і плата за водаадвядзенне бярэцца сусразмерна. А вось пры паліве агарода і паенні жывёлы дадатковай нагрузкі на каналізацыйныя сеткі няма. Пастановай гэта пытанне ўрэгулявана: трэба толькі ўстанавіць асобны прыбор уліку, які кантралюе расход вады на паліў і ўтрыманне жывёл, і гэты аб'ём вады будзе выключацца з платы за паслугу водаадвядзення.

### Пераплацілі? Вернуць «жывыя грошы»

У выпадку памылковага ўнясення лішніх сум за спажытыя жыллёва-камунальныя паслугі па жаданні жыхара яму вернуць розніцу, калі ён звернецца з заявай у арганізацыю. Разам з заявай неабходна будзе таксама прадставіць дакумент, які сведчыць асобу, і плацежныя дакументы, якія пацвярджаюць факт аплаты. Нагадаем, што раней лішнія сумы не вярталіся, а спісваліся ў лік будучых плацяжоў.

### Даплата за тры месяцы, а не за тры гады

У дакуменце прапісаны парадак ліквідацыі дапушчаных выканаўцам памылак, у выніку якіх прыходзіцца дадаткова налічаць плацельшчыку пэўныя сумы. Цяпер гэта магчыма зрабіць толькі за тры месяцы. Раней тэрмін быў значна большы — тры гады. За такі час недаплачаныя сумы часам выраслі да астранамічных памераў, і ў выпадку выяўлення хібаў чалавек вымушаны быў напружваць сямейны бюджэт, што выклікала справядлівыя нараканні. Бо вінаваты ў падобнай сітуацыі не плацельшчык, а спецыяліст, які няправільна зразумеў заканадаўства ці не звярнуў увагі на нейкі нюанс.

З іншага боку, тэрмін даўнасці застаецца такім жа (тры гады) у выпадках, калі недастатковае налічэнне ажыццяўлялася па віне плацельшчыка. Напрыклад, калі памяняўся ўласнік, а пра гэта не было своечасова паведамлена.

**Сяргей КУРКАЧ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Экспертыза

# ХТО «ЧАСТУЕЦЦА» АНТЫФРЫЗАМ?

**У канцы сакавіка краіну ўзрушыла здарэнне, якое адбылося ў Слуцку. Адзін за адным у цэнтральную раённую бальніцу горада былі шпіталізаваны пяць чалавек. Яны паспелі расказаць, што знайшлі на звалцы бутэльку з невядомай вадкасцю, якую і распілі. І праз некалькі гадзін памерлі...**

Здавалася б, праблема атручэння алкагольнымі сурагатамі павінна адысці ў мінулае. Татальнага «сухога закону» ў Беларусі няма, ды і для таго, каб купіць спіртное, таксама не трэба шмат грошай ці прыходзіць да крамы пасля абеду, як у часы перабудовы. Але, нягледзячы на гэта, і цяпер некаторыя аматары моцнага «частуюцца» тэхнічнымі вадкасцямі. Праўда, гэты «ласунак» з вялікай доляй імавернасці становіцца апошнім у жыцці.

А пасля яго рэшткі трапляюць на разбор да спецыялістаў. Адзін з іх — **дзяржаўны медыцынскі судовы эксперт аддзела агульных экспертыз № 2 Упраўлення судовых экспертыз па горадзе Мінску Наталля ГЛІНСКАЯ**, якая даследуе небяспечныя вадкасці ўжо каля дваццаці гадоў.

— Яны складаюць прыкладна дзясятую частку ад агульнай колькасці атручэнняў. Пераважная большасць такіх здарэнняў прыходзіцца на этылавы спірт і рэшта — на сурагаты алкаголю. Увогуле ж яны — гэта спіртазмяшчальныя вадкасці, якія ўжываюцца ў побыце і выкарыстоўваюцца для тэхнічных патрэб. Яны не прыдатныя для спажывання і дзеляцца на сапраўдныя і несапраўдныя. Сапраўдныя — тыя, якія змяшчаюць этылавы спірт. Гэта — настойкі пустырніку, глогу. У склад несапраўдных жа ўваходзяць або метылавы спірт, або этыленгліколь. Метылавы спірт, напрыклад, змяшчаюць растваральнікі, антыфрыз, шклоамывальнікі. А вось этыленгліколь — адзін з кампанентаў тармазной вадкасці аўтамабіляў і антыфрызу.

Раней у гэты сумны спіс уваходзіла таксама і палітура. Гэтая вадкасць выкарыстоўвалася падчас аддзелкі мэблі. Распазнаць яе вельмі проста — дзякуючы савецкай мэблі, якая пры належным доглядзе мае ледзь не люстраны бляск. Палітура мае складаны хімічны састаў — фактычна гэта смалістыя рэчывы ў спіртавым растворы. Гэта і спакушала тых, хто працаваў на мэблевай вытворчасці, спажываць палітуру не толькі для націрання мэблі, але і ўнутр.

Але цяпер спажыванне палітуры, як кажуць, пераральным шляхам адышло ў нябыт. Як, зрэшты, і ласьёнаў з адэкалонамі. На змену ім прыйшлі «фуфырыкі» з настойкамі лекаў.

### Клін клінам выбіваюць

— Сурагаты і алкаголь процілеглыя па часе дзеяння. Этылавы спірт усмоктваецца ў кроў павольней за сурагаты. І распадаецца хутчэй, у той час як сурагаты там могуць цыркуляваць вельмі доўга. Больш за тое, менавіта прадукты распаду сурагатаў і атручваюць арганізм. Каб выклікаць сур'ёзныя парушэнні, патрэбна ўсяго толькі 7 мілілітраў метылавага спірту. Смяротная доза пачынаецца ад 50 мілілітраў. У этыленгліколю «запас трываласці» крыху большы — пры 50 мілілітрах чалавек атрымае атручэнне, пры ўжыванні ста — не выжыве.

Цікава, што антыдотам метылавага спірту з'яўляецца... звычайны этанол. Таму пры атручэнні метанолам менавіта яго «зарадзяць» у кропельніцу. І будуць перапампоўваць, пакуль канцэнтрацыя не дойдзе прыкладна да трох праміле. Вядома ж, пры гэтым пастаянна будуць браць кроў на аналізы. Менавіта з-за гэтай «канкурэнцыі» метылавага і этылавага спірту і назіраецца цікавая сітуацыя, калі ў адных людзей смяротнае атручэнне, напрыклад, пасля распіцця шклоамывальніка адбываецца хутка, а іншыя могуць пражыць і некалькі дзён. Свой адбітак, канешне, накладваюць хуткасць метабалізму і камплекцыя чалавека.

— Быў выпадак, калі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі прывезлі адразу трох чалавек, якія распівалі нейкую вадкасць. Аналізы паказалі наяўнасць метылавага спірту. З гэтай кампаніі двое памерлі — адбылося кровазліццё ў мозг, а трэці ўсё-такі выжыў.

Сам метылавы спірт падобны да этылавага — ён такі ж бескаляровы, мае амаль такі ж пах. А вось этыленгліколь — вадкасць вязкая.

**— Якая самая моцная ступень ап'янення была вамі зафіксавана?**

— Калі мы яшчэ працавалі стажорамі, то была прызначана судова-медыцынская экспертыза па двайным забойстве. Нехта забіў маці і дачку. Як правіла, эксперт мусіць адказаць — ці ўжывала ахвяра незадоўга перад смерцю алкаголь? І вось адна проба паказала нейкія фантастычныя вынікі, другая... Адным словам, усе пробы паказалі адно і тое ж — у маці было зафіксавана 11,5 праміле алкаголю, у дзяўчыны — 7. Што менавіта і колькі яны пілі, так і засталося загадкай.

**— Што не рэкамендавана рабіць пры атручэнні спіртам або сурагатамі?**

— Выклікаць рвоту, калі парушана прытомнасць. Рвотныя масы могуць трапіць у дыхальныя шляхі. Для гэтага і выкарыстоўваецца прамыванне страўніка ў стацыянары з зондам. Таксама нельга пацярпелага абліваць халоднай вадой. Алкаголь павышае тэмпературу цела, і з-за рэзкага кантрасту чалавек можа проста знепрытомнець.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**




## СТАРЫ «ВОЛ» БАРАЗНУ НЕ СКРЫВІЦЬ?

Мая стрыечная сястра Галя даўно збіралася пакінуць смуродны горад, вярнуцца назад у вёску, у апусцелую бацькоўскую хату... А што? Яна — птушка вольная, пенсію сабе зарабіла за амаль 40 гадоў, дзяцей падняла, дачку нават замуж выдала за нейкага фірмача... Трымаў жанчыну хіба шалапутны сын. Гадоў да 30 ён гуляў (у тым ліку ў «танкі»), выпіваў, перабіраў розныя работы ды розных дзевак і ўрэшце...

Як той казаў, давыбіраўся: прывёў дадому рыжую нахабную развядзёнку з двума малымі, якая з першых дзён узялася камандаваць, прычым — усімі.

Галя такім чынам стала збірацца...

Зяць яе (залаты чалавек!), пачуўшы пра гэта, завёз на сялібу будматэрыялы, людзей. Тыя з паўмесяца папрацавалі, — хату зрабілі, як лялечку! І платы вакол яе паставілі, і прыбіральню з белай цэглы злажылі, можна сказаць, нават цёплую, бо на так званае ачко зяць аднекуль сядзенне прывёз — з шэрага штучнага футра, мякенькае. На такім сядзеў бы і сядзеў!

Карацей, Галя з радасцю пераехала і зажыла: пасадзіла гарод, купіла курэй, парсючка... Але ж першым у яе на падворку з'явіўся бадзяжны кот. Пасля смерці сваёй гаспадыні — швачкі бабы Шуры — ён хадзіў ад хаты да хаты. Недзе і нешта еў — частавалі, але ж на двары: у дом яго браць ніхто не хацеў, бо кот, як казалі — равеснік... той бабы Шуры — худы, страшны. Усё, што мог, гэта нешта мяккае есці ды спаць... Мала таго, што 23 гадзіны ў суткі, ён яшчэ і легчы мог у самым непатрэбным месцы: на градцы з морквай, на падушцы, пад нагамі на ходніку ці ганку! Таму з вуснаў гаспадыні — пры ўсёй яе дабрыні ды любові да жывёл — на адрас ката ўсё часцей зрывалася міжвольнае «Каб ты здох!»

Да гэтага, падобна, усё ішло, прычым — сямімільнымі крокамі. А неяк, здалося, — нават наступіла. Галя пад вечар зайшла ў хату, убачыла, што кот, адкінуўшы лапы і хвост, ляжыць у зале на століку, пагрэла сабе і яму па катлеце, паклікала есці. Шэрык аднак не прыйшоў. Тады вячэру на сподачку яна паставіла яму пад нос. Той і вока не расплюшчыў. Пакратала за бок, — ніякіх прыкмет жыцця...

Што было рабіць? Гаспадыня адчыніла шафу, нагнулася над ніжняй шуфлядкай, каб дастаць якой старызны, загарнуць небараку ды пахаваць, — як той, падкраўшыся ззаду, скочыў ёй на спіну.

Ледзь не сканаўшы ад разрыву сэрца, Галя чарговы раз сказала сваё «Каб ты здох!» і тады ўжо хацела аднаго: каб не зашыўся недзе ў будынку ці ў садзе, каб не засмярдзеўся, бо лета на двары...

У той дзень кот не з'явіўся снедаць, але ж прагаладаецца, прыпаўзе, падумала гаспадыня. У абед яна ўжо клікала свайго шэрага, пад вечар таксама. «Значыць, сканаў», — пашкадавала жанчына і пайшла шукаць.

Спачатку яна агледзела свой падворак і сад, потым — дзе магла — сялібу нябожчыцы бабы Шуры (можа, туды запоўз?), распытала суседзяў: ката, на жаль, нідзе не было, яго ніхто не бачыў...

Затое пад вечар і неспадзеўку ў Галі з'явілася госця: аднакласніца ішла з аўтобуса, прыпынілася. І яны, вядома ж, пагаварылі б пра сваё — дзявочае, жаночае (20 гадоў не бачыліся!), калі б не кот.

— А давай яго ў бульбе паглядзім, — прапанавала госця. — Можа, дзе ў баразёнцы сканаў?

— Што ты... Не дай бог, — замахала рукамі заклапочаная гаспадыня, — бо яго там не ўбачыш. Ён жа шэры, пад колер зямлі. Ды і цямнее...

— А мы навобмацак. Ты басанож, я таксама зараз разуюся. Удзвюх тваё сем сотак мы мігам «прашнуруем». Я толькі ў прыбіральню зайду...

Усё астатняе адбылося ў адно імгненне: дзверы тога маленькага белага дамка зачыніліся і тут жа расчыніліся:

— Ко-о-от! — куляй вылятаючы ў двор, нема крычала госця.

— Дзе?

— Там, — на сядзенне паказала госця.

— Гэта не кот, гэта ўцяпляльнік такі, — засмяялася Галя. — Зяць мне прывёз...

— А я ж падумала, што на ката твайго села... Шчасце яшчэ, што кручок не накінула, а то страсенне мазгоў дакладна было б, дзверы ж я галавою выносіла!..

Жанчыны ад душы парагаталі і пайшлі ў хату. Вырашылі, што шукаць у шэрані шэрага ката — гэта тое ж, што шукаць чорнага ў цёмным пакоі, асабліва, калі яго там няма.

У тым, што гэта так, Галя пераканалася назаўтра, калі кот, стомлены і яшчэ больш змарнелы, з'явіўся на ганку.

Жанчыны ў краме потым сказалі, што бачылі яго на іншай вуліцы — хадзіў да прыезджай коткі.

**Лідзія Савосік,**
*г. Асіповічы.*

## ЧЭК — ЯШЧЭ НЕ ДОКАЗ

Самаабслугоўванне для нас, пакупнікоў, — гэта, згадзіцеся, зручна: у краму зайшоў, каляску ўзяў ды каці сабе ўздоўж паліц — выбірай, што трэба. Потым застанецца хіба аплаціць.

Самаабслугоўванне, як здавалася, зручна і для гандлю: не трэба нешта падаваць, узважваць, расказваць. Толькі грошы бяры ды сачы, каб ніхто нічога не скраў. Для гэтага ў магазінах і ахоўнікаў трымаюць, і камеры відэаназірання ставяць, але... марна: нічога не памагае.

Дык вось. Супрацоўнікі аднэй з крам заўважылі, што ў іх гандлёвай зале, апроч іншага, прападаюць... цэннікі.

Віны прадаўцоў у тым не было: тавары не пераацэньваліся, на іншы прылавак не пераносіліся, аднак такія выпадкі паўтараліся зноў і зноў, што стварала пэўныя нязручнасці: пакупнікі нерваваліся і не бралі тавар, бо не бачылі цэн, гандляры трацілі выручку і цярпенне.

З гэтым трэба было нешта рабіць. Дырэктар тэрмінова сабраў калектыў — паставіў задачу «вылічыць» так званага чорнага мерчандайзера (меркавалася, што яго «заслалі» канкурэнты, каб на сваю карысць «адбіць» у магазіна частку пакупнікоў)...

Пакуль не адбілі, ахоўнікі і гандляры прыступілі да выканання задачы: яшчэ больш пільна сталі сачыць за ўсімі, хто прыходзіць у краму. І ў хуткім часе заўважылі, што цэннікі знікаюць «з лёгкай рукі» аднаго... дзядулі. Прычым забірае ён не ўсе падрад, а толькі на тыя тавары, што купляе сам.

— Навошта? — спыталі ў гэтага «мерчандайзера».

— Дык жонцы для справаздачы бяру, — вінавата прамовіў дзядуля.

— Але ж для гэтага на касе вам чэк выдаюць. Там усё пазначана, — заўважылі гандляры.

— Чэка — мала... Вось цэннік — іншая рэч! Мая жонка толькі ім і верыць!

Размова з дзядулем была доўгай і досыць сур'ёзнай. Ён паабяцаў, што цэннікі браць болей не будзе. А вось стрымае сваё слова ці... пойдзе па іх у іншую краму, яшчэ невядома.

**Андрэй Сідарэйка,**
*г. Мінск.*

## ХТО НЕ ЛАСЫ НА КАЎБАСЫ?

Не памылюся, калі скажу, што ў кожнага вяскоўца-беларуса ёсць свая гісторыя пра свежыну. У мяне яна вось такая.

Справа, значыць, была напрыканцы вясны. Мой сусед дзядзька Мікола ў надзеі на прыезд шаноўнага зяця вырашыў закалоць парсючка-«в'етнамца». Памочнікаў не запрашаў, бо колькі там таго іншаземца — для бяседы на зуб. Ды і справа добра знаёмая: стрыножыў жывёліну, падцягнуў да грушы, прывязаў... Сам толькі за цясак, а в'етнамец...

Зразумеў ён, відаць, намер гаспадара, як нітку, парваў пастронак і цягу ў нашы палескія «джунглі».

Дзядзьку ад неспадзеўкі аж мову адняло: паслухаў, як трашчаць карчы пад нагамі парсючка, а потым па ўсіх правілах паляўнічай навукі кінуўся ладзіць пагоню. Гэта значыць, запрасіў кума з двума ганчакамі (зяць, пачуўшы аб прапажы, прыязджаць адмовіўся: не царская гэта справа свіней лавіць), клікнуў мяне, далучыўся сам і...

Пара ганчакоў, пастаўленых на след парсючка, рванулася з месца і ў... процілеглы бок (мусіць, зайца ўнюхала?). Нам у выніку нічога не заставалася іншага, як шукаць «в'етнамца» самім.

Да абеду амаль працягаліся, лазілі па гушчары, збілі ногі, стаміліся, згаладаліся, згубілі сабак і нарэшце вярнуліся дамоў: гаспадар змірыўся з прапажай. Я ж не супакоіўся: крыху адпачыў, узяў свайго дварняка і пачаў спачатку.

Трэба сказаць, не марна пачаў! Праз нейкія паўгадзіны ўцякач быў схоплены — сабакам, проста за лыч. Мне заставалася толькі звязаць «в'етнамца» ды паведаміць дзядзьку Міколу.

...Той, цягнучы парсючка ў вазку, не верыў уласнаму шчасцю. Я ж, перапоўнены гонарам, прытрымліваў свайго дварняка ды... складаў верш, якім і хачу завяршыць вось гэту гісторыю. Назваў я яго «Гарадская любоў»:

«Мой родны кут, як ты мне мілы!..»
Каб расказаць, не хопіць слоў,
Як вабіш ты, з якою сілай,
На... свежаніну да бацькоў.

Засыпаў снежань белай беллю
Палі, дарогі і лясы,
Я ж, без супынку, шпарка, бегма
Імчу на водар каўбасы.

Каб не самлець на паўдарозі
(Якая радасць, людцы, жыць!),
Хутчэй, хутчэй нясіце ногі,
Пячонка, чую, ужо сквірчыць.

Шырэй адкрыю дзверы хаты,
Здаецца, сню салодкі сон:
«Вітайце ж госця, мама, тата!..
Ужо гатовы сальцісон?»

І ўсёй не выказаць падзякі
За чаркай «вогненнай вады»,
Мой родны кут, каб не прысмакі,
Ці ж я ляцеў бы так сюды?!

**Генадзь Мішчук,**
*в. Вотчына, Маларыцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# ШТО МОГУЦЬ СУСЕДЗІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Андрэй УФІМЦАЎ** — з вёскі Касарычы Глускага раёна. І яму было шкада глядзець, як яго населены пункт паміраe.

— Школу закрылі, стаматалогію «разабралі». Насельніцтва з 600 чалавек у 1990-я скарацілася да 30. Апошнія некалькі гадоў я правёў у пошуках праекта, які б мог аб'яднаць жыхароў. На першы, другі і трэці сход прыходзіў адзін чалавек — гэта быў я. Давялося браць ініцыятыву ў свае рукі.

Ідэяй стала стварэнне парка артлавак. Эскізы аб'ектаў распрацавалі з дапамогай студэнтаў Брытанскай школы дызайну ў Маскве. Грошы на канструкцыі сабралі праз інтэрнэт на краўдфандынгу («народнае фінансаванне»). А каб устанавіць дызайнерскія лаўкі, у вёсцы правялі суботнік, каб кожны ахвотны мог паўдзельнічаць у агульнай справе. Цяпер арт-аб'екты — папулярнае месца для адпачынку і фота.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Разам з тым Андрэй перасцерагае: усе ініцыятывы павінны прапрацоўвацца. Не варта спяшацца рэалізоўваць задуму, якая вяскоўцам не патрэбная.

— У Расіі быў паказальны выпадак. Выбралі самую прыгожую вёску, паставілі ўказальнік, як даехаць да яе. Мясцовыя жыхары спачатку былі рады, а потым прасілі: «Прыбярыце ўказальнік. Мы не ведаем, што з турыстамі рабіць»... Хоць пра нашы лаўкі таксама казалі, што гэта непатрэбна, але толькі пакуль не ўбачылі выніку.

Нядаўна ў Касарычах зрабілі і кінатэатр. На паказе не было ніводнага вольнага месца! А на лета ў вёску стала прыязджаць 200—250 чалавек. Андрэй дадае, што важна таксама сябраваць з прэсай, каб пра мясціну ведалі — тады людзі будуць вяртацца ў вёску.

## Грошы — не галоўнае

— Вёска — гэта не Мінск, дзе праходзіць шмат мерапрыемстваў, і ты можаш пайсці, куды захочаш. Гэта глуш. А людзі заслужылі свята, — кажа **Марына АЛЯКСЕЕНКА** з аграгарадка Башні (Шумілінскі раён), якая вырашыла дапамагчы жыхарам навакольных вёсак арганізаваць доўгачаканыя святы.

Вось, напрыклад, сяло Саладуха. Вельмі маленькая вёска: пастаянных жыхароў там — чалавек 10. Разам са школьнікамі жанчына абышла вяскоўцаў, пагутарыла. Тыя былі вельмі рады, што пра іх яшчэ пытаюцца. З вучнямі Марына Аляксеенка арганізавала для ўсіх свята вёскі. Праграму мерапрыемства прадумалі дзеці. Сабралі выстаўку фота, зладзілі танцы. Выпісалі вяскоўцам граматы — за найлепшы дом, актыўную грамадскую пазіцыю, прыгожы кветнік. Гаспадыні напяклі пірагоў. Калі пра гэта напісалі ў мясцовай газеце, то і іншыя вёскі падцягнуліся: маўляў, давайце сумесныя святы праводзіць.

— Ніякіх грошай не было, каб арганізаваць мерапрыемствы, але атрымалася шыкоўна, бо людзі згуртаваліся, — дзеліцца Марына Аляксеенка.

У сваім родным аграгарадку яна праводзіць «Башнеўскія пасядзелкі». Іх прымяркоўваюць да розных падзей — напрыклад, да Дня пажылых людзей, Сусветнага дня пацалунку. Дзелячыся сваім вопытам, жанчына згадвае словы сузаснавальніка карпарацыі «Sony» Акіа Марыта: «Кампанія нічога не дасягне, калі думаць будзе толькі кіраўніцтва». Бо не толькі ў бізнесе важна дзейнічаць разам.

У вёсцы Аксакаўшчына (Мінскі раён) аб'яднаць жыхароў вырашылі праз сумесныя прыборкі. А пасля таго, як навялі парадак у дварах і лесе, падумалі, што грамадой могуць справіцца і з іншымі праблемамі.

— Некалі ў нас была спартыўная пляцоўка, але потым з яе зрабілі аўтастаянку. Але ж дзецям не хапае месцаў для гульняў! Мы прыцягнулі да праекта архітэктара, атрымалі сродкі з Фонду развіцця мясцовых супольнасцяў і абсталявалі пляцоўку. Самі яе ўстанаўлівалі, — расказвае **Марыя ДАШЧЫНСКАЯ.**

Цяпер у мясцовай дзятвы ёсць поле і для міні-футбола, і для баскетбола. Што цікава: пляцоўку даглядаюць самі падлеткі.

— Гэта іх месца. Калі яны будуць за яго адказваць, будуць і берагчы, — тлумачыць падыход Марыя Дашчынская.

### У тэму

Карыснымі для гараджан парадамі пра тое, як зменшыць колькасць смецця ў пад'ездзе, падзялілася **спецыяліст Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля БЛЫШЧЫК.** Так, каб пазбавіцца ад раскіданых на ўваходзе рэкламак, можна вешаць на скрыню надпіс з просьбай не апускаць у яе буклеты. Ці — што больш эфектыўна — паставіць для іх у пад'ездзе асобную скрыню. Потым сабраную рэкламную прадукцыю можна здаць на макулатуру (і атрымаць па 12 капеек за кілаграм). Не лішнім будзе і самаробны кантэйнер (са звычайнай скрыні ці каробкі) для старых батарэек.

Яшчэ адна праблема — буйнагабарытнае смецце. Часта каля ліфта жыльцы пакідаюць вокны і старыя канапы: так прасцей. Вывезці непатрэбныя рэчы дапамогуць спецыяльныя службы. У Мінску забраць мэблю можа сэрвіс 115. Халадзільнікі, тэлевізары і іншую тэхніку — арганізацыя БелВТІ (яны нават прыедуць па іх бясплатна і спусцяць з вашага паверха).

Што рабіць, калі ад смеццеправода ідзе непрыемны пах? Выйсце першае: заказаць санітарную апрацоўку. Рэгулярна праводзіць яе — абавязак ЖЭСа. Выйсце другое: заварыць смеццеправод. Трэба ініцыяваць збор подпісаў і падаць заяўку ў той жа ЖЭС. Праўда, калі на гэта згодна менш чым палова жыльцоў, а ў двары няма кантэйнераў для асобнага збору смецця, нічога не атрымаецца.

Бадай, галоўнае ў падтрыманні парадку — падаваць уласны прыклад.

— Неакуратны стан пад'езда дэматывуе. Дастаткова аднаму кінуць недакурак на лесвіцу, і астатнія таксама пачнуць так рабіць, — заўважае Наталля Блышчык. — Але маё жыллё не абмяжоўваецца толькі кватэрай. Я не саромеюся падняць за іншым паперку і данесці да смеццяніцы. Для мяне гэта звычайная ранішняя «зарадка».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Тамара ВЯЦКАЯ:

# «МІНСКАЯ ХВАЛЯ» ДЗЕЛІЦЦА РАДАСЦЯМІ

**97,4 FM — Мінск, Лагойск, Смалявічы, Жодзіна.**
**102,4 FM — Мядзел, 102,6 FM — Крупкі, 104,2 FM — Барысаў.**
**104,8 FM — Капыль, Стоўбцы, Нясвіж, Клецк, Баранавічы.**
**105,3 FM — Салігорск, Слуцк, Любань.**
**105,5 FM — Беразіно, Чэрвень. 105,6 FM — Старыя Дарогі.**
**107,4 FM — Маладзечна, Вілейка, Валожын.**

Хтосьці з мудрацоў сказаў, што радасцю неабходна дзяліцца і з сябрамі, і з ворагамі: адны пацешацца, другія засмуцяцца... Але я вельмі хачу, каб парадаваліся за нас УСЕ ЧЫТАЧЫ! Падставы ёсць, і не адна.

***1-я радасць*** — Наш стэнд на выстаўцы «СМІ ў Беларусі» у дзень адкрыцця быў адным з самых шумных, і гэта зразумела, мы ж радыё :)... У нас выступілі дзеці ад нашага аўтарскага праекта «Просты матыў», удзельнікі праекта «60+», прайшлі майстар-класы па іміджы і прамоўніцкім майстэрстве, і мы падвялі вынікі конкурсу вершаў на тэму аб малой радзіме (удзельнікаў было нечакана шмат, але ўсе тры пераможцы — члены Старадарожскага паэтычнага клуба!), а сам Дзень радыё «Мінская хваля» правяла на БелАЗе, гэта таксама радасць незабыўная.




**Начальнік рэкламна-прамоўтарскага аддзела радыё «Мінская хваля» Наталля ЯРМОЛЕНКА.**

***2-я радасць*** — Радыё «Мінская хваля», БРСМ Мінскай вобласці і творчая майстэрня «Даная» пры падтрымцы рэдакцый газет «Шапокляк», «Переходный возраст» і часопіса «DOMIK» праводзілі першы абласны фестываль-конкурс творчасці юных «Просты матыў», шэсць этапаў якога завяршыліся 27 чэрвеня суперфіналам у дзіцячым аздараўленчым лагеры «Купалінка». Дзеці-пераможцы нават пасадзілі алею з туй! Асноўныя намінацыі: эстрадны, джазавы і народны вакал; спецыяльныя намінацыі: роўныя магчымасці, патрыятычная і аўтарская песня. У журы конкурсу — медыйныя персоны, у тым ліку кампазітары Леанід Шырын і Генадзь Маркевіч, спявачка Вольга Плотнікава і сакратары БРСМ тых раёнаў, дзе праходзілі этапы. У складзе дзіцячага журы — удзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» розных гадоў Хелена Мерааі, Руслан Асланаў і аўтар праекта — спявачка Даная Шаршавіцкая. Узнагароды ўдзельнікам падрыхтавалі шматлікія партнёры «Простага матыву», штотыдзень радыё «Мінская хваля» знаёміць слухачоў з пераможцамі этапаў, якія праходзілі ў гарадах і пасёлках вобласці, а на адзін з этапаў нас запрасілі ў Магілёў. Найлепшыя арыгінальныя песні вызначаны ў ратацыю на радыё.

Аднак лаўрэаты чакаюць галоўную ўзнагароду, а гэта — удзел у канцэрце на адной з пляцовак «Славянскага базару ў Віцебску» ў Дзень моладзі 14 ліпеня! Далажу я вам, што ўдзельнікі вельмі цудоўныя: па званку яны збіраліся на дабрачынныя канцэрты. Напрыклад, двухгадзінны канцэрт лаўрэатаў «Простага матыву» адбыўся на пляцоўцы першага фестывалю «Усё сваё» ў дворыку Нацыянальнага гістарычнага музея, яны ж выступілі на выстаўцы «СМІ ў Беларусі», і вялікі канцэрт прайшоў 3 ліпеня ў Дзень Незалежнасці ў Мірскім замку — дырэкцыя адгукнулася на нашу прапанову сумесна з БРСМ правесці там свята «Мірнае дзяцінства ў Мірскім замку».

***3-я радасць*** — нашы супрацоўнікі Ксенія Куніцкая і Каця Лапіцкая скончылі Міжнародную школу журналістыкі, і вось што сказала ўладальніца сертыфіката Ксенія Куніцкая: «Кожны журналіст, нягледзячы на тое, што ўвесь час знаходзіцца ў патоку інфармацыі і бывае шмат дзе, так ці інакш сутыкаецца з руцінай у рабоце. А дзе чэрпаць натхненне, як не ў зносінах з калегамі?! Тым больш што людзі, якія сталі ўдзельнікамі гэтай міжнароднай школы, прадстаўлялі СМІ абсалютна рознага фармату (рэспубліканскія і рэгіянальныя друкаваныя выданні, інфармацыйныя агенцтвы, а таксама радыё і тэлебачанне), і ўсюды, безумоўна, ёсць свая спецыфіка. Я ўжо не кажу пра выкладчыкаў школы — людзей з надзвычай багатым вопытам у прафесіі, знакамітых майстроў слова і пяра не толькі на тэрыторыі Беларусі і Расіі, але і па-за межамі саюзнай прасторы. Вядома, пачуцці і эмоцыі перапаўняюць! На многія рэчы ўдалося зірнуць зусім іншымі вачыма: з аднаго боку, ты разумееш, што ведаеш больш, чым здавалася раней, з іншага — усведамляеш, што не ведаеш амаль нічога! Але гэта толькі падаграває цікавасць да прафесіі. Адзінае, аб чым шкадую.., — амаль год навучання праляцеў занадта хутка. Спадзяюся, што атрыманыя веды і доля энтузіязму ад мэтраў пяра дадуць мне магчымасць па-новаму адкрыцца перад слухачамі і вылюцца ў цікавыя творчыя праекты. Арганізатары школы абяцалі, што супрацоўніцтва так ці інакш працягнецца. Пра што яшчэ можна марыць?)))».

І вось меркаванне Каці Лапіцкай: «На мой погляд, Міжнародная школа журналістыкі — гэта найкаштоўнейшы вопыт для любога прадстаўніка медыясферы. А ўсё чаму? Таму што фармат «жывога дыялогу», магчымасць абмяняцца вопытам, дзесьці нават падыскутаваць, даведацца «з першых вуснаў», як працуюць журналісты Беларусі і Расіі, — карысна як журналістам-пачаткоўцам, так і тым, хто ў гэтай прафесіі ўжо не першы год. Калі гаварыць пра сябе, то мяне, вядома, уразіла такі, не пабаюся гэтага слова, «мэтр пяра», як Галіна Сапожнікава. Мне здаецца, што любы журналіст, хто працуе ў жанры расследавання, прычым робіць гэта на вышэйшым узроўні, варты нават не тое, што пахвалы, а самага сапраўднага рэспекту! Пошук інфармацыі, магчымасць знаходзіць эксклюзіўныя факты, рызыкаваць, так-так, менавіта рызыкаваць не толькі сваім жыццём, але і жыццём блізкіх, і ўсё для таго, каб дакапацца да праўды — гэта і ёсць прафесія ў самым яркім яе праяўленні. Акрамя таго, ужо калі матэрыял гатовы і выйшаў, як той казаў, «у свет», жыць з гэтай праўдай, прычым не заўсёды прыемнай, і заставацца стрыманым, як хірург, — гэта і ёсць сапраўдны прафесіяналізм. І быць часткай гэтага вопыту, пераняць сабе нейкія звычкі, вучыцца нават на нейкіх памылках калег і імкнуцца да іх дасягненняў — для мяне гэта сапраўды бясцэнна. І прыемна, што гэтая «першая ластаўка» школы будзе працягнутая, а гэта значыць, што ў нашай медыя-сферы яшчэ ўсё толькі пачынаецца. І хто яго ведае — можа, менавіта дзякуючы гэтаму журналістыка верне сабе званне «чацвёртай улады».




**Кацярына ЛАПІЦКАЯ і Ксенія КУНІЦКАЯ.**

***4-я радасць*** — асабіста са мной працягнулі кантракт яшчэ на год!



**Дырэктар радыё «Мінская хваля» Тамара ВЯЦКАЯ.**

***5-я радасць*** — мы зноў аб'явілі конкурс вершаў, гэтым разам сумесна з Упраўленнем МНС, аб ратавальніках, і для пераможцаў вызначаны добрыя прызы.

***6-я радасць*** — пачалі рыхтаваць новы сезон і будзем радаваць вас новымі праграмамі і новай музыкай, і гэта мы вам абяцаем з верасня!

***7-я радасць*** — не толькі для радыё «Мінская хваля», але і для ўсіх, хто хоча ўліцца ў цудоўны свет СМІ, і хто хоча спасцігнуць жаданую і любімую ўсёй душой прафесію радыёвядучага. Гэта вы? Тады вам да нас — вучыцца журналістыцы ў найлепшых, у тым ліку ў мяне, члена Міжнароднай акадэміі ТБ і радыё. У новым сезоне радыё «Мінская хваля» зноў пачне курсы радыёвядучых! Стартуе новы набор!

*Рэкламна-прамоўтарскі аддзел радыё «Мінская хваля»*
*+375 (17) 228 13 44; +375 (29) 365 50 21*
*reklamamv@mail.ru; reklama@mvolna.by*
УНП 690262864

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 8 августа 2018 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование лотов | Адрес лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение площадью 4,9 кв. м**, в помещении связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 7-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка — 0,2. Коэффициент местоположения — 1,0.**Условие сдачи в аренду:** установка двери между помещениями пл. 4,9 кв. м и пл. 5,2 кв. м | г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **19,73** | 1,97 |
| 2 | **Помещение площадью 24,7 кв. м**, в капитальном строении — здании районного узла связи и автоматической телефонной станции с инв. № 320/С–19733, помещение на 3-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка — 0,25. Коэффициент местоположения – 1,0. | г. Жлобин, ул. Первомайская, 76 | **99,48** | 9,95 |
| 3 | **Помещение площадью 473,1 (436,3;36,8) кв. м**, в капитальном строении — здании районного узла связи и автоматической телефонной станции с инв. № 320/С–19733, помещение на 3-м этаже. Коэффициент спроса – 1,5. Базовая ставка — 0,25. Коэффициент местоположения – 1,0. | | **1 905,41** | 190,54 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце:** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-67-44 |
| **Срок подачи заявления** | **с 06.07.2018 г. по 06.08.2018 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». **Подача документов по почте не допускается** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, **получатель — Гомельский филиал РУП «Белпочта»,** назначение платежа — задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 — 0,4 базовых величин, лот № 2—2 (две) б. в., лот № 3—25 (двадцать пять) б. в. — согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству). |

**Срок договора аренды — 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо на адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь — копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляется оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов — www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8 (029)126-66-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 24 ИЮЛЯ 2018 ГОДА повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр»

| Предмет торгов № 1 |
|---|
| «подземная насосная с артезианской скважиной № 4», инв. номер 632/С-17975 (глубина скважины — 41,5 м, площадь — 21 кв. м); «ограждение из ж/б плит 231 п. м., ворота, калитка»; «подземная насосная с артезианской скважиной № 5», инв. номер 632/С-28703 (глубина скважины — 250,0 м, площадь — 10,4 кв.м.); «здание медицинского центра» общей площадью 1281,1 кв.м, инв. номер 632/С-17288; «асфальтобетонная площадка перед медицинским центром» общей площадью 478 кв. м; «асфальтобетонная площадка за медицинским центром» общей площадью 467 кв. м |
| Сведения о земельных участках:<br>1. площадь — 0,3583 га, кадастровый номер — 622000000001000096;<br>2. площадь — 1,9549 га, кадастровый номер — 622000000001000098 |
| Местонахождение - Минская область, Воложинский район, Раковский с/с, 2, 8 км западнее аг. Раков |
| Начальная цена – 457 755,75 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 45 000,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов № 2** |
| «здание производственно-складское» общей площадью 296,4 кв. м, инв. номер 632/С-26411 |
| Сведения о земельном участке: площадь — 0,2155 га, кадастровый номер — 622000000001000094 |
| Местонахождение: Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, около д. Раков, 3Б |
| Начальная цена – 53 579,83 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 5 300,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «НПО Центр», ул. Шаранговича, 19, ком. 304, 220018, г. Минск.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
**Иные характеристики продаваемого имущества:** имущество расположено в лесном массиве. Вблизи протекает река Ислочь. Подъездные пути в виде асфальтированных дорог до второй кольцевой дороги г. Минска — 5 км и до дороги Минск—Гродно — 4 км. Вблизи расположены объекты социальной инфраструктуры Миноблисполкома. В районе размещения имущества имеются газопровод, канализация, сети электроснабжения и водоснабжения.
**Наличие обременений:** категория земель — земли лесного фонда.
Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Торги проводятся 24 июля 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.07.2018 по 20.07.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 259-05-54, (029) 686-45-13 (ОАО «НПО Центр»).

## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «NGK – УДАЧНАЯ ПОКУПКА»

Организатором Рекламной игры является Торговое унитарное предприятие «Пропеллер Медиа», УНП 391811829, зарегистрированное администрацией Октябрьского района г. Витебска от 17 февраля 2017 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 391811829.

Юр. адрес: Республика Беларусь, 210038, г. Витебск, пр-т Московский, 55Л/3, контактный телефон +375212642244.

Срок и место проведения Рекламной игры: с 14 мая по 31 июля 2018 года, по адресу: г. Витебск, пр-т Московский, 55Л/3.

**В Рекламной игре разыгрывались призы 4 видов:**

- *1 приз — Идентификационная электронная карта № 691672945 системы «BERLIO CARD» (на получение нефтепродуктов А-92, А-95, Дт, Газ в сети АЗС ИООО «ЛУКОЙЛ Белоруссия»*
- *5 призов — Видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset Black)*
- *25 призов — Кружка с логотипом NGK*
- *25 призов — Футболка с логотипом NGK*

**Призовой фонд был разыгран полностью. Было разыграно:**

- *1 приз — Идентификационная электронная карта № 691672945 системы «BERLIO CARD» (на получение нефтепродуктов А-92, А-95, Дт, Газ в сети АЗС ИООО «ЛУКОЙЛ Белоруссия»*
- *5 призов — Видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset Black)*
- *25 призов — Кружка с логотипом NGK*
- *25 призов — Футболка с логотипом NGK*

**Общее количество участников Рекламной игры составило 114 человек.**

Правила проведения Рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 88 от 11.05.2018 года. По вопросам Рекламной игры обращаться по телефону +375445046404 с 10:00 до 18:00 в рабочие дни по 31 июля 2018 года. Рекламная игра «NGK – Удачная покупка» зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, свидетельство о государственной регистрации № 3270 07.05.2018 г.

**Список победителей:**

Клюйко-Садовская В. А. — Видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset)
Калекин В. Д. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Бунель Д. В. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Степанюк Н. А. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Кравец Г. П. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Касперский П. С. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Подрез В. Н. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Рокашевич Н. В. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Валетко Е. А. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Зенченко Р. А. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Барановская Н. Н. — Видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset)
Берашевич А. Н. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Зубик В. И. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Микулич Д. В.- Фирменная кружка с логотипом NGK
Михновец О. В. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Пожелаев А. Ю. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Богруденко А. В. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Волков Н. Н. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Зыблев В. А. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Прашкович А. В. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Смирнова М. С. — Фирменная футболка с логотипом NGK (3 шт.), фирменная кружка с логотипом NGK
Воробьев П. И. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Большунов Е. В. — Фирменная кружка с логотипом NGK (4 шт.)
Абрамов А. Е. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Соловей Р. Г. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Кривошапов В. В. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Куксёнок А. А. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Холявинский А. В.- Фирменная футболка с логотипом NGK
Михеева М. Б. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Барнюк М. Л. — Видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset)
Протасич А. С. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Гриб А. Г. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Степанюк Н. А. — Фирменная кружка с логотипом NGK, фирменная футболка с логотипом NGK
Сугак В. В. — Фирменная кружка с логотипом NGK, фирменная футболка с логотипом NGK
Малыгин М. Н. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Романенко В. Э. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Кожушный А. А. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Шишло И. А. Фирменная футболка с логотипом NGK
Иванцова О. А. — Видеорегистратор (ACV GQ115 720/GP chipset)
Акулич А. А. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Шипилов Д. А. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Якубович А. М. — Фирменная кружка с логотипом NGK
Оларица А. М. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Лапицкий А. И. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Иванцова О. А. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Рокашевич Н. В. — Фирменная футболка с логотипом NGK
Носков А. В. — Идентификационная электронная карта № 691672945 системы «BERLIO CARD» на получение нефтепродуктов А-92, А-95, Дт, Газ в сети АЗС ИООО «ЛУКОЙЛ Белоруссия»

**ЗАО «УНИВЕРСАМ ВОЛГОГРАД»** уведомляет о том, что **04.07.2018 года на внеочередном общем собрании акционеров Общества принято решение о начале процесса реорганизации ЗАО «УНИВЕРСАМ ВОЛГОГРАД» в форме присоединения к нему ООО «ДЕВЕЛОПЕР-ИНВЕСТ»** (зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 790693254), с последующей передачей ЗАО «УНИВЕРСАМ ВОЛГОГРАД» всех прав, обязанностей и имущества ООО «ДЕВЕЛОПЕР-ИНВЕСТ».

Требования кредиторов могут быть предъявлены письменно в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты публикации настоящего уведомления по следующему адресу: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25-501.

УНП 100558017

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15 |

**Предмет аукциона**
**Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Промышленный, 12, в составе:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Навес-склад (литер В 1/кп)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 3433 кв. м | 500/С-29825 |
| **Цех изоляции труб и открытая площадка № 1, № 2 (литер Е 1/кп)** | Здание неустановленного назначения | 1147 кв. м | 500/С-31742 |
| **Д 1/к. Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 380 кв. м | 500/С-29823 |
| **Насосная станция. Литер Ж 1/к** | Здание неустановленного назначения (составные части и принадлежности: два подземных резервуара) | 51 кв. м | 500/С-31729 |
| **Здание административно-хозяйственное** | Здание административно-хозяйственное | 4343,8 кв. м | 500/С-29809 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 52,3 кв. м | 500/С-31254 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 26,9 кв. м | 500/С-35219 |
| **Внутренние сети связи** | Сооружение специализированное связи | 96,7 кв. м | 500/С-1025198 |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 261,8 кв. м | 500/С-1025197 |
| **Ливневая канализационная сеть** | | 1170,7 кв. м | 500/С-1025196 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке:** | Земельный участок, общ. пл. 4,6795 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административно-бытового, производственных и складских зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,2250 га; в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0210 га; обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 4,8772 га |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **1 992 336,00 белорусских рублей (снижена на 60 %)** |
| **Обременения:** | Аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведения аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.06.2018

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.07.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.07.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны:** | Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В СОБСТВЕННОСТЬ В Г. ГРОДНО (УЛ. ЗАСЛОНОВА, УЛ. РЖАНАЯ) 7 АВГУСТА 2018 ГОДА

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок * | ул. Заслонова № 17 | 0,0716 | 440100000002009428 | 3 066,52 | 28 065,94 | 5 600 |
| 2. | Земельный участок У-1* | район улиц Ржаной и Пимена Панченко | 0,0826 | 440100000001010417 | 3 397,41 | 11 256,07 | 2 200 |

* - Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».
Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».
**Аукцион состоится 7 августа 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**
Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.
Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;
заявление на участие в аукционе установленной формы;
документ, подтверждающий внесение суммы задатка;
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
дополнительно представляются:
гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан — документ, удостоверяющий личность.
**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл.Ленина, 2/1, кабинет 403 с 9 июля по 1 августа 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;
внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.
После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.
Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.
При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.
Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» вносит в извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому унитарному предприятию «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения, назначенного на 11.00 16.07.2018 г., следующие изменения: **начальная цена лота № 1 — машины плосковязальной TECHNOT EX кл. 10** (инв. № 1141) **– 2 158,42 рублей** (без НДС)**, задаток для участия в аукционе – 216,00 рубля** (без НДС).

Полный текст извещения опубликован в газете «Звязда» от 14.06.2018 г. № 112 и на сайте организатора торгов.

Дополнительная информация по тел.: (0232) 32-46-47, 32-18-95.

УНП 490318588

В суд Рогачевского района Гомельской области поступило заявление об объявлении умершей Зазерской Вероники Александровны, 8 июля 1978 года рождения, уроженки г. Рогачева Гомельской области, последнее известное место жительства: г. Рогачев, ул. Мичурина, 1, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Зазерской В. А., сообщить их суду в течение двух месяцев с момента публикации.

**Утерянные свидетельство о государственной регистрации фирмы ООО «Хаккамир» (УНП 690541937) и печать организации считать недействительными.**

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г.Минска полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0878613 считать недействительным.

УНП 100122726

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Вам, відавочна, хочацца адпачываць, а не працаваць. Магчыма, варта дамовіцца аб тым, каб выконваць частку заданняў дыстанцыйна? Выдатны тыдзень для фрылансераў. Зрэшты, адносіны з калегамі ў вас наладзіліся, гэта стварае добрую атмасферу. Аднак у чацвер лепш знізіць аб'ём працы і не планаваць нічога сур'ёзнага. Паспрабуйце быць сумленнымі з сабой і навакольнымі, лепш не прыхарашваць падзеі, што адбываюцца. Субота можа прынесці цікавыя знаёмствы.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні неабходна будзе засяродзіцца на галоўным і не марнаваць сілы на рашэнне другарадных праблем. Цяпер зручны час з усёй сур'ёзнасцю задумацца пра будучыню і прыняць важнае для вашай сям'і рашэнне. Пажадана, каб рост актыўнасці і прадпрымальнасці не ператвараўся ў імітацыю бурнай дзейнасці. У канцы тыдня добра было б адправіцца ў адпачынак.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вас чакае паспяховая рэалізацыя ідэй і ажыццяўленне жаданняў. Дакладна будзе нагода для радасці. Паспрабуйце вызваліць больш часу для сябе і звесці зносіны з калегамі і сябрамі да разумнага мінімуму. У сярэдзіне тыдня не выключаны рамантычныя спатканні і прыемныя сюрпрызы ад блізкіх людзей.



**РАК.** Калі вы не будзеце прыспешваць падзеі або праяўляць залішнюю нервовасць і нецярпенне, то тыдзень абяцае быць спакойным і мерным. Калі адпраўляецеся ў адпачынак, то вас чакаюць прыемныя ўражанні і выдатная кампанія. Калі працягваеце працаваць, то лепш не прад'яўляць прэтэнзій ці патрабаванняў да начальства — гэта прывядзе да канфліктнай сітуацыі. У чацвер і пятніцу пажадана паступова завяршаць пачатыя справы, не перашкаджаючы калегам сваімі парадамі.



**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні зможаце палепшыць любое са сваіх дасягненняў. Для гэтага ўсяго толькі спатрэбіцца развіць назіральнасць і інтуітыўнае разуменне інтарэсаў навакольных і стаць крыху больш мудрымі і цярплівымі. Да чацвярга варта ўціхамірыць ганарыстасць і прыслухацца да разумных парадаў калег па працы. Найлепшымі днямі ў прафесійнай сферы могуць стаць аўторак і пятніца. Выхадныя дні правядзіце з дзецьмі.



**ДЗЕВА.** Пры ўмелым спалучэнні аптымізму і гнуткасці на гэтым тыдні зможаце прыцягнуць да сябе ўвагу навакольных. Працуйце, і ваш прафесійны поспех забяспечыць вам годнае існаванне. Не кажучы ўжо пра маральнае задавальненне. Можна запісацца на моўныя або кулінарныя курсы. Яны могуць спатрэбіцца. Збірайцеся ў дарогу. Нават самая кароткая дарога парадуе нейкай прыемнай падзеяй.



**ШАЛІ.** Будзьце прадбачлівыя, сачыце за сваімі словамі. Нават адно неасцярожнае слова можа павярнуцца супраць вас. Калі вы ў адпачынку, то паспрабуйце разгледзець за ўласнай расслабленасцю і задаволенасцю жыццём магчымыя падводныя камяні. Іх, зразумела, лепш пакінуць убаку. Калі вы на рабоце, тады не забывайце, што пры прыняцці якіх бы там ні было рашэнняў трэба іх спачатку старанна абдумваць. Не разлічвайце на хуткае рашэнне праблем. У выхадныя не адмаўляйцеся ад паездкі да сяброў, не пашкадуеце.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні выкарыстоўвайце сваю камунікабельнасць на сто працэнтаў, гэта дапаможа ў рэалізацыі планаў і задум. У аўторак будуць удалымі паездкі, не выключаны замежныя камандзіроўкі. Пятніца вельмі падыходзіць для пабудовы падмурка будучых праектаў. У выхадныя варта заняцца сямейнымі і хатнімі праблемамі, уважліва прыслухайцеся да парадаў сваякоў.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні магчымы актыўны ўдзел сяброў і аднадумцаў ва ўсіх вашых справах. Займіцеся кар'ерай, але не грэбуйце і сям'ёй. У панядзелак і сераду могуць паступіць выгадныя прапановы, якія абяцаюць прыбытак. У пятніцу верагодныя пэўныя спрэчкі з начальствам з-за розных падыходаў да вырашэння незакладнага пытання. У выхадныя дні наўрад ці варта сур'ёзна браца за выхаванне дзяцей.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні з'явіцца рэальны магчымасць для карэкцыі свайго лёсу, унясення ў яго чагосьці новага, незвычайнага. Давярэцеся голасу сваёй інтуіцыі, і яна вас не падвядзе. Высокі творчы патэнцыял. Але ці ёсць час яго рэалізаваць? Паспрабуйце не звязваць сябе ніякімі абяцаннямі, будзьце больш абачлівымі ў асабістым жыцці, каб пазбегнуць непаразуменняў. Калі вы збіраецеся ў адпачынак, то яго добра правесці ў камфортнай для вас кампаніі.



**ВАДАЛІЎ.** Наступіў спрыяльны момант для актыўнай дзейнасці. Неабходна сабрацца з сіламі і не дазваляць сабе расслабляцца і ўпадаць у роспач. Абдумайце ўсё, не выпускайце з-пад увагі дробязі, перш чым прымаць канчатковае рашэнне, і тады ўсё абавязкова атрымаецца. У сераду лепш не сустракацца з начальствам, а тым больш не спрабаваць яму нешта даказваць, не спрачайцеся і са сваёй другой палавінкай. У пятніцу верагодныя добрыя навіны ад родных. Выхадныя лепш правесці на прыродзе.



**РЫБЫ.** Настаў час ненадакучліва заявіць пра сябе і нагадаць пра свае ідэі начальству. У панядзелак і аўторак пажадана нічога кардынальнага не рабіць, а вось пачынаючы з серады можаце дасягнуць добрых вынікаў. Злучыўшы свае жаданні і магчымасці, правільна сплянаваўшы дзеянні, вы здабудзеце стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. У чацвер будзьце асцярожныя, вас можа падвесці даверлівасць. Выхадныя лепш правесці ў знаёмай абстаноўцы, якая вам даспадобы.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.46 | 21.42 | 16.56 |
| Віцебск — | 4.28 | 21.40 | 17.12 |
| Магілёў — | 4.36 | 21.32 | 16.56 |
| Гомель — | 4.42 | 21.20 | 16.38 |
| Гродна — | 5.03 | 21.55 | 16.52 |
| Брэст — | 5.13 | 21.47 | 16.34 |

## Месяц

*Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

***Пр.*** *Соф'і, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Георгія, Германа, Дзяніса, Сямёна, Фёдара.*
***К.*** *Дамінікі, Люцы, Тэрэзы, Эдварда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Ганна з Вовам ляжаць на канапе, яе тэлефон на кухні. Чуе, прыйшло sms. Устае, ідзе на кухню. Бачыць, што паведамленне ад Вовы. Чытае: «Калі ты ўсё ж паднялася, прынясі, калі ласка, піва!»

**Першае правіла маладой жонкі:**
**«Есць — значыць кахае!»**

— Чым адрозніваецца стос папрасаванай бялізны ад стоса непрасаванай?
— На стосе папрасаванай адпачывае кот.

**Калі ў цябе на працы пастаянна стаіць спісаная бочка са спіртам, у цябе адначасова і няма праблем з алкаголем, і ёсць праблемы з алкаголем.**



К. Малевіч

## Даты | Падзеі | Людзі

### 6 ЛІПЕНЯ



У краіне

**1788** год — нарадзіўся Дамінік Манюшка, беларускі асветнік. Стрыечны брат кампазітара Станіслава Манюшкі. Пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта атрымаў навуковую ступень доктара права. Прымаў удзел у вайне 1812 года. З 1816-га жыў у маёнтку Радкаўшчызна ў Ігуменскім павеце (цяпер Чэрвеньскі раён). Уласны маёнтак і зямельныя ўгоддзі аддаў у карыстанне сваім сялянам, пакінуўшы сабе толькі невялікі ўчастак. Заснаваў у павеце вучылішча, пансіянат для ўтрымання і выхавання сялянскіх дзяўчынак. Вучылішча было закрыта ў 1838-м, жаночы пансіянат праіснаваў да 1853-га дзякуючы матэрыяльнай дапамозе брата Ігната.

**1888** год — нарадзіўся Іван Баранкевіч, празаік, нарысіст, перакладчык, удзельнік рэвалюцыйнага руху. У 1913—1914 гадах працаваў у кааператыўных арганізацыях Магілёўскай губерні, супрацоўнічаў у часопісе «Вестник Могилевскага земства». Быў рэдактарам часопіса «Беларуская крыніца» (Петраград). Аўтар біяграфіі Уладзіміра Леніна, выдадзенай у Петраградзе ў 1919 годзе пад псеўданімам Беларус. У 1920-я жыў у Магілёве, працаваў настаўнікам, у 1923—1925 гадах — супрацоўнік газет «Соха и молот», «Магілёўскі селянін». З 1927-га — у Ленінградзе, уваходзіў у літаратурную групу «Разец», працаваў бібліятэкарам. Пераклаў на рускую мову творы Якуба Коласа.

**1923** год — нарадзіўся Валянцін Панамароў, беларускі пісьменнік. У 1949—1976 гадах — карэспандэнт «Правды», «Огонька», «Вестей», «Литературной газеты» па Беларусі, на Дзяржтэлерадыё Беларусі. Аўтар апавесцяў, апавяданняў, нарысаў.

**1953** год — нарадзіўся Барыс Залескі, беларускі матэматык. Распрацаваў камбінаторныя метады ў распазнанні малюнкаў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола.



У свеце

**1898** год — нарадзіўся Ханс Эйслер, нямецкі кампазітар і грамадскі дзеяч, член Нямецкай акадэміі мастацтваў, аўтар музыкі гімна ГДР.

**1918** год — у Маскве падчас работы V Усерасійскага з'езда Саветаў левыя эсэры паднялі антыбальшавіцкі мяцеж, які завяршыўся іх паражэннем. У выніку члены леваэсэраўскай партыі былі выдалены з органаў савецкай улады. У краіне ўсталявалася поўнаўладдзе кіруючых вярхоў бальшавіцкай партыі.

**1923** год — быў сфарміраваны першы савецкі ўрад — Савет Народных Камісараў СССР.

**1928** год — у Нью-Ёрку адбыўся першы ў свеце поўнасцю агучаны кінасеанс.



**1973** год — англійскі гурт Queen выпусціў свой першы сінгл Keep Yourself Alive.

**1988** год — 166 рабочых загінулі падчас найбуйнейшай аварыі на плывучай нафтавай вышцы ў Паўночным моры.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2355.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
6 ліпеня 2018 г. № 27 (460)

**Бліжэй да людзей**



У Пружанскім раёне ўпершыню правялі дзень Саветаў стар. 2

**Мільёны ў рэгіёны**



Якія вынікі інвестфоруму ў Магілёве стар. 3

**«Свая палічка»**



Як гамяльчанка дапамагае стаць рамеснікам стар. 14

**Карціна, вазон і кардонка...**



Што нельга захоўваць на лесвічнай пляцоўцы? стар. 15

**Шчупак стане сімвалам**



У Шчучыне рыхтуюцца да незвычайнай падзеі стар. 16

ТЭМА ТЫДНЯ

# ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ БІЗНЕСУ: ШТО ДАЛЕЙ?

## У дэпартаменце па прадпрымальніцтве Мінэканомікі расказалі пра перспектывы работы над укараненнем Дэкрэта № 7



Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Вольная рэгістрацыя сваёй справы, прэферэнцыі і мінімум праверак. Сёлета бізнес атрымаў новы драйвер для развіцця ў выглядзе дэкрэта №7. Самі прадстаўнікі дзелавой супольнасці назвалі новы дакумент па лібералізацыі прарыўным і беспрэцэдэнтным. Разам з тым працэс па ўкараненні дэкрэта працягваецца, бо пад яго прынцыпы прыйшлося літаральна падладжваць працу многіх міністэрстваў. Аб прамежкавых выніках і пра перспектывы паляпшэння дзелавога клімату на найбліжэйшую будучыню карэспандэнту МС расказалі ў дэпартаменце па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі.**

стар. 4

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# ПЕРАВОД ЭКАНОМІКІ Ў «ЛІЧБУ» — НЕ ПРОСТА МОДНЫ ТРЭНД

## Сенатар — аб новым дэкрэце



**На мінулым тыдні члены Савета Рэспублікі разгледзелі нашумелы Дэкрэт № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі».**

На думку Уладзіміра Панцухова, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, менавіта гэты дакумент абмяркоўвалі часцей за ўсё з тых, што ўключаны ў пакет мер па лібералізацыі бізнесу. «Трэба разумець, што перавод эканомікі ў «лічбу» — не проста модны трэнд, гэта пытанне нашай нацыянальнай бяспекі і глабальнай канкурэнтаздольнасці. Ад гэтых працэсаў мы не павінны заставацца ўбаку», — упэўнены парламентарый.

Сапраўды, даныя ў лічбавай форме сёння становяцца ключавым фактарам вытворчасці ва ўсіх сферах дзейнасці, што павышае канкурэнтаздольнасць краіны, якасць жыцця грамадзян, забяспечвае эканамічны рост і нацыянальны суверэнітэт. Развіццё IT-сектара, высокаканкурэнтнага і дынамічнага, змяняе стаўленне да ведаў, да самаадукацыі і да будучыні.

«Такім чынам, Дэкрэт № 8 варта разглядаць як фактар глабальных змен, як «драйвер» развіцця, і не толькі эканамічнага, — лічыць сенатар. — Лічбавая эканоміка павінна «ісці па дарозе права». На падставе нормаў Дэкрэта № 8 рыхтуецца шэраг паправак у дзеючае заканадаўства ў мэтах фарміравання прававых умоў для эфектыўнага развіцця айчыннага IT-сектара. У выніку ў нас павінна з'явіцца паўнавартаснае лічбавае асяроддзе».

Па словах Уладзіміра Панцухова, яно і цяпер развіваецца. І таму нельга сказаць, што мы знаходзімся на абочыне. У Беларусі на вачах цяпрашняга пакалення сыходзіць у нябыт эпоха папяровых дакументаў. АРІП, электронны гандаль, электронныя рахункі-фактуры, электроннае дэклараванне — усяго толькі частка інструментаў «лічбавай» Беларусі, якая шырока ўжываецца насельніцтвам і бізнесам. У нашу эканамічную лексіку таксама ўвайшлі такія словы, як блокчэйн, штучны інтэлект і іншыя новыя паняцці, якімі ўсяго пару гадоў таму апераравала толькі вузкае кола спецыялістаў.

«За апошнія гады мы зрабілі даволі сур'ёзны крок наперад, тым не менш трэба гэты рух істотна паскорыць. Важныя пытанні, на якія трэба будзе адказаць самім сабе ў самы кароткі час: якія з кірункаў для нас прыярытэтныя, у што мы будзем укладваць сродкі ў першую чаргу, які ёсць патэнцыял камерцыялізацыі ў лічбавых праектаў», — адзначыў сенатар.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Мэты — у рэгіёны

*Як урад можа дапамагчы рэалізацыі МУР*

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна Шчоткіна выступіла з дакладам на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Яна праінфармавала аб тым, якая работа праводзіцца ў Беларусі па дасягненні Мэт. Абмеркаваны перспектывы далейшай дзейнасці ў гэтай сферы.**

Мар'яна Шчоткіна падкрэсліла, што ўрад адыгрывае вядучую ролю ў пытаннях забеспячэння ўстойлівага развіцця: «Уключэнне ўрада ў работу па дасягненні МУР у нашай краіне павінна быць накіравана на забеспячэнне ўліку глабальных мэт і задач, замацаваных у Парадку-2030, пры распрацоўцы стратэгічных і праграмных дакументаў у эканамічнай, сацыяльнай і экалагічнай сферах, выразнай увязцы нарматыўных праватых актаў з МУР, а таксама гарманізацыі асноўных палажэнняў Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года з Парадкам-2030».

Было прапанавана ўвесці ў практыку разгляд не радзей аднаго разу на год вынікаў дасягнення замацаваных за кожным дзяржаўным органам МУР на калегіях рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, пасяджэннях абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, пасяджэннях Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі.

Асаблівую ўвагу Мар'яна Шчоткіна надала пытанням работы па дасягненні МУР у рэгіёнах. У найбліжэйшы перыяд прапануецца змясціць акцэнт дзейнасці Савета па МУР з нацыянальнага на рэгіянальны ўзровень. І тут неабходная падтрымка і ўрада, і мясцовых органаў улады, падкрэсліла яна. «Устойлівае развіццё краіны цесна звязана з устойлівым развіццём рэгіёнаў. Для арганізацыі работы ў рэгіёнах сфарміраваны рэгіянальныя групы ўстойлівага развіцця, якія ўзначальваюць члены Савета па ўстойлівым развіцці ад абласцей і Мінска, — нагадала нацыянальны каардынатар. — Асаблівая ўвага будзе ўдзелена ўзмацненню патэнцыялу рэгіянальных груп, укараненню нацыянальных паказчыкаў дасягнення МУР у праграмныя дакументы мясцовага ўзроўню, а таксама правядзенню інфармацыйнай кампаніі ў рэгіёнах».

## Увага кожнаму, хто звярнуўся

*Сенатар правёў асабісты прыём грамадзян і адказаў на іх пытанні па тэлефоне*



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Васіль Маркевіч правёў асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію.**

Тых грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, якія звярнуліся да парламентарыя, хвалявалі пытанні працаўладкавання, стварэння бяспечнага асяроддзя ў дзіцячых дашкольных установах раёна, размеркавання выпускнікоў прафесійна-тэхнічных каледжаў, работы сельскіх дамоў культуры і іншыя. На большасць пытанняў сенатар даў вычарпальныя адказы падчас зваротаў.

## Абмен адукацыйным вопытам

*Парламентарый правяла міжнародную сустрэчу*

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына Дулава сустрэлася з Прэзідэнтам Чарнагорскай акадэміі навук і мастацтваў Драганам Вукчэвічам.**

На сустрэчы абмяркоўваліся шляхі ўзаемадзеяння ў навуковым і міжкультурным супрацоўніцтве, пытанні адукацыі і падрыхтоўкі кадраў у галіне культуры і мастацтва, удзел у навуковых канферэнцыях Чарнагорыі і Беларусі.

Дэлегацыя Чарнагорыі запрошана кіраўніцтвам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з мэтай наведвання яе арганізацый, азнаямлення з іх дзейнасцю, абмеркавання перспектывых кірункаў і механізмаў развіцця супрацоўніцтва паміж бакамі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# АБАРАНІЦЬ ІНТАРЭСЫ ЛЮДЗЕЙ У ПРАЦОЎНЫХ ЗНОСІНАХ

Дэпутаты прынялі ў першым чытанні змены ў Працоўны кодэкс



**Адным з распрацоўшчыкаў законапраекта стала Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, якая ўнесла ў яго каля 40 прапаноў. Мы запыталі ў лідара нацыянальнага прафцэнтра, члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Міхаіла Орды, якія навелы, на яго думку, з'яўляюцца найбольш істотнымі.**

«Працоўны кодэкс для прафсаюзаў — гэта асноўны дакумент. Галоўная задача, якую мы, як нацыянальны прафцэнтр, ставілі падчас работы над гэтым законапраектам, — забяспечыць абарону інтарэсаў людзей у працоўных зносінах.

Дарэчы, намі было зроблена каля 40 прапаноў у згаданы законапраект. Усе яны сфарміраваны на аснове тых запытаў і праблем, з якімі да нас звяртаюцца члены прафсаюза і працоўныя калектывы.

У выніку сумеснай і, трэба адзначыць, дастаткова грунтоўнай работы з іншымі зацікаўленымі бакамі большая частка нашых ініцыятыў была ўлічана», — адзначыў Міхаіл Орда.

У прыватнасці, лідар нацыянальнага прафцэнтра падкрэсліў, што прафсаюзы настаялі на захаванні тэрміну папярэджання работніка аб змене істотных умоў працы ў колькасці 30 дзён, адзначыўшы, што папярэдняя рэдакцыя законапраекта прадугледжвала скарачэнне гэтага тэрміну да 7 каляндарных дзён.

Гаворка аб тым, што пасля папярэджання аб зменах істотных умоў працы (напрыклад, заробку, працягу працоўнага дня ці іншага) работнік павінен вырашыць, працягваць работу з новымі ўмовамі ці звольніцца. Такім чынам, калі работнік прымае рашэнне аб звальненні, больш працяглы перыяд папярэджання дае яму больш магчымасцяў для пошукаў новай працы.

«Значным для нас з'яўляецца і далучэнне да законапраекта палажэнняў, згодна з якімі будзе заканадаўча забяспечана магчымасць для прафсаюзнай арганізацыі прымаць удзел у абмеркаванні кантракта з работнікам — членам прафсаюза. Гэта дапаможа пазбегнуць сітуацый, калі работніку прапануюць заведама нявыгадныя ўмовы працы і нормы, якія дзесьці ідуць уразрэз з заканадаўствам. Таксама законапраект прадугледжвае апавяшчэнне прафсаюза пры намеры наймальніка не працягваць кантракт з работнікам», — адзначыў старшыня ФПБ.

Сярод іншых не менш істотных прапаноў нацыянальнага прафцэнтра, уключаных у законапраект, — абмежаванне матэрыяльнай адказнасці работнікаў. Як адзначылі ў прэс-службе ФПБ, прафсаюзы не аднойчы ўздымалі гэтую праблему на сустрэчах з сацыяльнымі партнёрамі.

«Гэта несправядліва, калі два работнікі працуюць у аднолькавых умовах, але з таго, хто працуе на працоўным дагаворы, матэрыяльная адказнасць можа абмяжоўвацца калектыўным дагаворам, а з таго, што прыняты па кантракце, — не абмяжоўваецца. І ён плаціць у некалькі разоў больш. У сувязі з гэтым мы прапанавалі ўнесці змены ў Працоўны кодэкс, і на сённяшні дзень законапраектам устаноўлены адзіныя падыходы прымянення матэрыяльнай адказнасці да работнікаў пры прычыненні імі шкоды наймальніку пры выкананні працоўных абавязкаў, — растлумачыў Міхаіл Орда. — Таксама законапраектам прадугледжана, што штрафы, якія накладаюцца на наймальніка, пазней не будуць спаганяцца з работнікаў».

Згодна з прапановай Федэрацыі прафсаюзаў у новай рэдакцыі Працоўнага кодэкса атрымалася таксама захаваць права за пенсіянерамі, якія патрабавалі скасавання працоўнага дагавора з прычыны вінаватых дзеянняў наймальніка, на атрыманне кампенсацыі ў памеры трохмесячнага заробку. Дарэчы, у першапачатковай рэдакцыі законапраекта гэтай нормы не было.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

# Стаматолаг, цырульнік і прыватызацыя жылля

На Пружаншчыне ўпершыню прайшоў дзень сельскага Савета

**Жывой работай на месцы і з насельніцтвам, і з працаўнікамі сацыяльнай сферы, і з кіраўнікамі суб'ектаў гаспадарання назваў дзень Савета старшыня Пружанскага райсавета Мікалай КУДРАВЕЦ. Гэтую новую для сябе форму работы ён падгледзеў на Гродзеншчыне. Вопытам падзяліўся старшыня Свіслацкага райсавета Віктар СУБОТКА. Першым для правядзення новага мерапрыемства быў абраны Хараўскі сельсавет.**

### РАБОЧЫЯ ГРУПЫ

Паводле слоў Мікалая Кудраўца, распараджэннем райвыканкама былі створаныя чатыры аналітычныя рабочыя групы па вывучэнні сітуацыі і выпрацоўцы рэкамендацый для Хараўскага сельсавета. Першая група цікавілася добраўпарадкаваннем, падтрыманнем належнага стану на вытворчых аб'ектах, машынных дварах, а таксама на могілках ды ў іншых месцах. Гэтую групу ўзначаліла першы намеснік старшыні райвыканкама начальнік райсельгасхарча Алена Лапыка. Другая група пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Сяргея Гука вывучала бяспеку ўмоў пражывання грамадзян. Трэцяя група маніторыла праблемы медыцыны і адукацыі, яе ўзначаліў Руслан Супрыновіч, намеснік па сацыяльных пытаннях. Чацвёртая група пад кіраўніцтвам Святланы Ханавец цікавілася работай прадпрыемстваў гандлю, поштай, аддзяленнямі банка. Згаданыя намеснікі разам са спецыялістамі, кіраўнікамі структурных падраздзяленняў пачалі сваю дзейнасць некалькі тыдняў таму. Яны вывучалі работу кожнага аб'екта, гутарылі з людзьмі, праводзілі маленькія нарады з кіраўнікамі прадпрыемстваў, што функцыянуюць на тэрыторыі. На некаторыя заўвагі ўдзельнікаў рабочых груп аператыўна адрэагавалі, і недахопы былі ліквідаваныя вельмі хутка.



**Старшыня Хараўскага сельскага Савета Алена ПСТЫГА і старшыня райсавета Мікалай КУДРАВЕЦ.**

На пленарным пасяджэнні, якое і назвалі днём Савета, былі агучаны вынікі работы груп, праведзены аналіз стану спраў і выпрацаваныя рэкамендацыі надалей. На пасяджэнне запрасілі ўсіх старшынь сельскіх Саветаў раёна, яны азнаёміліся з сацыяльна-культурнымі аб'ектамі аграгарадка Кабылаўка, дзе і праходзіла пасяджэнне. Тут даволі цікава працуюць Дом культуры і сельская бібліятэка, школа — адна з найлепшых не толькі ў сваім раёне.

### ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН

А за некалькі гадзін да пленарнага пасяджэння прайшоў прыём грамадзян. У розных населеных пунктах сельсавета яго правялі старшыня райвыканкама Міхаіл Крэйдзіч, яго намеснікі і старшыня райсавета Мікалай Кудравец.

*(Заканчэнне на 15-й стар. «МС»)*

# 100 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

## Менавіта на такую суму падпісаны пагадненні і кантракты на X Міжнародным інвестыцыйным форуме «Млын поспеху» ў Магілёве

Мерапрыемства выклікала вялікую цікавасць з боку міжнароднай бізнес-супольнасці. На форум завітала 600 удзельнікаў, хоць чакалася каля 500. Ганаровымі гасцямі сталі 150 прадстаўнікоў 25 краін свету. Сярод тых, хто прыехаў упершыню, дэлегацыя з японскага горада Сіраісі на чале з мэрам Юіці Ямадам. Шырока былі прадстаўлены гарады і рэгіёны Расійскай Федэрацыі — Масква, Санкт-Пецярбург, Смаленск, Бранск і іншыя.

У рабоце форуму прымалі ўдзел міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Зіноўскі, пастаянны каардынатар ААН, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Іаана Казана-Вішнявецка, кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Аляксандр Крэмер, кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай фінансавай карпарацыі ў Беларусі Вольга Шчарбіна.

Падпісанню дагавораў, пратаколаў намераў і пагадненняў значна пасадзейнічала выстаўка інавацыйна-прамысловага патэнцыялу Магілёўскай вобласці, якая праводзілася на плошчах СК «Алімпіец». Свае дасягненні тут дэманстравала больш за 50 удзельнікаў.

— Упершыню ў рамках устаноўленых дыпламатычных пагадненняў падпісана пагадненне аб рэгіянальным супрацоўніцтве з Румыніяй, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.** — Прыемна адзначыць, што менавіта Магілёўская вобласць першая пачынае развіваць супрацоўніцтва на такім узроўні. І тыя сустрэчы, якія ў найбліжэйшы час пройдуць на румынскай тэрыторыі, а потым тут, дазволяць усталяваць больш цесныя камерцыйныя кантакты.

— Гэту падзею можна назваць прарыўной у развіцці беларуска-румынскага супрацоўніцтва, — пацвердзіў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Румыніі Андрэй ГІНКЕВІЧ.** — Упершыню ў гісторыі нашых зносін два вельмі буйныя, ключавыя румынскія рэгіёны прыехалі на Магілёўшчыну на чале са сваімі кіраўнікамі. У складзе дэлегацый таксама вельмі вядомыя бізнесмены. Патэнцыял супрацоўніцтва вельмі вялікі. Члены дэлегацыі азнаёміліся з экспанатамі на выстаўцы, правялі канкрэтныя перагаворы. Яны пажадалі наведаць канкрэтныя прадпрыемствы, каб працягнуць размову пра наладжванне супрацоўніцтва.



**На фота (злева направа):**
**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Румыніі Андрэй ГІНКЕВІЧ, губернатар Магілёўскай вобласці Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктар НЕКРАШЭВІЧ.**

**Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктар НЕКРАШЭВІЧ** паведаміў, што форум дапамагае рэалізацыі дзяржаўнай праграмы развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці. Падпісаны пратакол намераў паміж Магілёўскім аблвыканкамам і таварыствам з абмежаванай адказнасцю «Натуральная вада» аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве завода для разліву пітной і мінеральнай бутыляванай вады на тэрыторыі Чэрыкава. Група кампаній ARVI бярэцца рэалізаваць маштабны праект па вытворчасці і перапрацоўцы мяса індычкі на клімавіцкай зямлі. У рамках праекта будзе створана больш за 100 працоўных месцаў і інвеставана каля 50 мільёнаў долараў.

Упершыню ў рамках форуму адбылася цырымонія ўзнагароджання асоб, якія ўнеслі значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Магілёўскай вобласці і фарміраванне яе інвестыцыйнага іміджу. Памятнай узнагароды ўдастоены старшыня Беларускай арганізацыі «Пароднення гарады» Барыс Батура, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікалай Снапкоў, старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Цумараў, генеральны консул Рэспублікі Беларусь у горадзе Шанхай (КНР) Валерый Мацэль і іншыя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ІТ-ТЭХНАЛОГІІ РАЗАМ З МТС

## Кампанія «МТС» выступіла нацыянальным партнёрам ІІ Еўрапейскіх гульняў у Мінску

**Адпаведны дагавор кампанія «МТС» падпісала з фондам «Дырэкцыя ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года». Гэты апаратар прыме ўдзел у забеспячэнні інавацыйных рашэнняў і будаўніцтве тэхнічнай інфраструктуры для галоўнай спартыўнай падзеі наступнага года ў краіне.**




### ПЫТАННІ САЦЫЯЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

— Жыхары нашых краін жывуць у свеце, які вельмі дынамічна развіваецца, дзе тэхналагічнасць з'яўляецца адным з вызначальных фактараў у арганізацыі буйных падзей. Мы рады, што ў падрыхтоўцы ІІ Еўрапейскіх гульняў нашым партнёрам выступіць кампанія «МТС» — адзін з прызнаных лідараў рынку, — адзначыў **дырэктар фонду «Дырэкцыя ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій КАТУЛІН.** — Але яшчэ больш мы рады таму, што гэтае супрацоўніцтва скіравана ў першую чаргу на развіццё інфраструктуры краіны ў цэлым, а гэта стане выдатнай спадчынай для жыхароў.

«Вельмі прыемна, што сям'я нашых партнёраў папоўнілася кампаніяй, чыімі сацыяльнымі прыярытэтамі з'яўляюцца развіццё інфраструктуры краіны, падтрымка масавага спорту і здаровага ладу жыцця», — лічыць дырэктар фонду.

Акрамя таго, Георгій Катулін сказаў, што кампанія «МТС» з'яўляецца даўнім партнёрам Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Пры яе дапамозе была арганізавана маса значных сацыяльна-спартыўных мерапрыемстваў. «І нам прыемна, што вы не здраджваеце традыцыям і працягваеце падтрымліваць спорт у Беларусі», — пахваліў мабільнага аператара Георгій Катулін. Ён тут жа заўважыў, што госці ІІ Еўрапейскіх гульняў будуць мець патрэбу ў якаснай тэлекамунікацыйнай інфраструктуры.

«Комплекснае забеспячэнне гульняў ІТ-тэхналогіямі прадугледжвае ў тым ліку наяўнасць на кожным з аб'ектаў свайго мабільнага прэс-цэнтра, распаўсюджанне інфармацыі аб выніках спаборніцтваў сярод спецыялістаў і балельшчыкаў. Усё гэта немагчыма рэалізаваць без удзелу аднаго з нашых найбуйнейшых партнёраў на рынку мабільнай сувязі — кампаніі «МТС», — дадаў дырэктар фонду.

**Генеральны дырэктар СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» Уладзімір КАРПОВІЧ** адзначыў, што кампанія «МТС» традыцыйна з увагай ставіцца да пытанняў карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, развіцця спорту.

Безумоўна, ІІ Еўрапейскія гульні — знакавая падзея для Беларусі. Для таго каб яны прайшлі сапраўды на высокім узроўні, перад краінай пастаўлены ў тым ліку інавацыйныя задачы.

«Мы як кампанія — пастаўшчык інавацыйных паслуг уносім свой уклад у тое, каб новыя тэхналагічныя платформы працавалі на рэалізацыю задач, ускладзеных на фонд. Яшчэ адзін важны момант — паляпшэнне інфраструктуры сувязі, паляпшэнне сэрвісаў, звязаных з месцамі правядзення спаборніцтваў. Наш праект ахоплівае ўсе спартыўныя і трэніровачныя пляцоўкі, месца размяшчэння спартсменаў, гасцей, транспартныя калідоры. Перад намі стаіць комплексная задача. Хачу адзначыць, што прынятыя меры будуць і ў далейшым працаваць на інтарэсы нашых грамадзян, на развіццё прывабнасці нашай краіны», — расказаў Уладзімір Карповіч.

— Як кампанія — пастаўшчык інавацыйных паслуг, мы бачым для сябе адказнасць і ўносім свой уклад у забеспячэнне маштабнага спартыўнага форуму перадавымі тэхналогіямі, якія дазволяць стварыць неабходную ІТ-інфраструктуру для правядзення Гульняў, — адзначыў генеральны дырэктар аператара. — Сёння намі рэалізуюцца праекты, якія дадуць магчымасць забяспечыць якаснай галасавой сувяззю і мабільным інтэрнэтам важныя для спартсменаў, журналістаў і балельшчыкаў аб'екты — стадыёны, трэніровачныя базы, фан-зоны, гасцініцы і дарогі, каб зрабіць знаходжанне гасцей у беларускай сталіцы максімальна камфортным.

### НОВЫ СТАДЫЁН «ДЫНАМА», «СТАЙКІ» І ІНШЫЯ

Агульнавядома тое, што першым замежных гасцей прыме абноўлены стадыён «Дынама». Тут пройдзе цырымонія адкрыцця Гульняў. Кампанія «МТС» выступіла адным з забудоўшчыкаў тэлекамунікацыйнай інфраструктуры спартыўнай арэны.

Рэалізуючы праект, спецыялісты кампаніі выкарысталі сусветны вопыт: базавыя станцыі спланаваны з улікам пропуску пікавага трафіка і дазволяць забяспечыць галасавой сувяззю і мабільным інтэрнэтам больш за 20 тысяч чалавек. Асаблівая ўвага трыбунам — з-за асаблівасцяў канструкцыі аб'екта абсталяванне змантавана нестандартным спосабам: частка спецыяльных антэн размешчана непасрэдна над трыбунамі па ўсім перыметры стадыёна, частка — унутры памяшканняў арэны (vip-залы, памяшканні для прэс-канферэнцый), што дазваляе забяспечыць максімальнае пакрыццё і гарантаваць якасную сувязь балельшчыкам, каментатарам і спартыўным журналістам.

Абсталяванне паспяхова прайшло тэсціраванне і гатовае да працы падчас спаборніцтваў з шматтысячнай аўдыторыяй. Акрамя таго, МТС павялічыць ёмістасць сеткі на іншых спартыўных аб'ектах краіны, у тым ліку трэніровачных. Сярод іх: «Мінск-Арэна», «Чыжоўка-Арэна», Палац спорту, Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе, лёгкаатлетычны стадыён, Палац мастацкай гімнастыкі, алімпійскі спарткомплекс «Стайкі», вучылішча алімпійскага рэзерву і іншыя. Сетку рыхтуюць да вялікіх нагрузак і на іншых лакацыях, якія прымуць значную колькасць наведвальнікаў: у месцах пражывання спартсменаў і балельшчыкаў, а таксама ў фан-зонах, дзе будуць выкарыстоўваць у тым ліку і перасоўныя базавыя станцыі.

### МАБІЛЬНАЯ СУВЯЗЬ У ДАРОЗЕ...

Для камфорту гасцей нашай сталіцы ў дадатак да ўжо рэалізаванага з Беларускай чыгункай праекта па забеспячэнні ўсіх 19 чыгуначных вакзалаў краіны грамадскім Wi-Fi, да Еўрапейскіх гульняў плануецца палепшыць сувязь па маршрутах руху цягнікоў у асноўных напрамках. Гэта: Гомель — Жлобін — Асіповічы — Мінск — Маладзечна — Гудагай; Брэст — Баранавічы — Мінск — Орша; Жлобін — Магілёў — Орша — Віцебск — Езярышча. Усяго сувяззю плануецца пакрыць не менш за 1,3 тысячы кіламетраў чыгуначных шляхоў зносін. Дадатковыя базавыя станцыі з'явяцца і ўздоўж буйных магістраляў — каля сотні вышак, што забяспечаць якасны доступ да хуткаснага мабільнага інтэрнэту па тэхналогіі 3G па крытэрыі «унутры аўтамабіля».

Ёмістасць сеткі павялічаць і ў міжнародных пунктах пропуску, тут таксама запрацуюць новыя базавыя станцыі. Ужо забяспечана стапрацэнтнае пакрыццё 4G трасы М2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск. Сувяззю чацвёртага пакалення абаненты МТС могуць карыстацца і ў будынку аэрапорта, што дае яшчэ больш камфорту пры карыстанні інтэрнэт-сэрвісамі і паслугамі аператара.

### ...І ПАД ЗЯМЛЁЙ

Да Еўрапейскіх гульняў мабільная сувязь з'явіцца ў тунэлях мінскага метро, паведаміў **кіраўнік тэхнічнага дэпартамента сотавага аператара Аляксей ЦЯЖКІХ.**

«Паляпшэнне якасці сувязі ў Мінскім метрапалітэне, у прыватнасці забеспячэнне беспярэбыннай сувязі ва ўсіх тунэлях метро, з'яўляецца неад'емнай часткай падрыхтоўкі да ІІ Еўрапейскіх гульняў. Сёння гэта сумесны праект з іншым аператарам, які мы плануем рэалізаваць да гульняў. Вынікам будзе суцэльнае пакрыццё ўнутры вагонаў на ўсім працягу тунэляў Мінскага метрапалітэна», — сказаў Аляксей Цяжкіх.

**Сяргей КУРКАЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**

УНП 800013732

# ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ БІЗНЕСУ: ШТО ДАЛЕЙ?

## Згодна з новымі правіламі

Дзякуючы, так званаму лібералізацыйнаму пакету дакументаў, галоўным з якіх, вядома, з'яўляецца Дэкрэт № 7, у краіне быў пашыраны пералік відаў дзейнасці, якімі можна займацца без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Акрамя таго, павялічыўся пералік відаў рамеснай дзейнасці, нададзены дадатковыя правы суб'ектам гаспадарання, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы аграэкатурызму — было дадзена права найму супрацоўнікаў па працоўных або грамадзянска-прававых дагаворах.

«Для таго каб Дэкрэт № 7 пачаў працаваць, неабходна было перагледзець існуючы пласт заканадаўства. Прадстаўнікі органаў дзяржкіравання правялі маштабную работу за кароткі тэрмін. Гэта закранула ўсе аспекты, пачынаючы ад законаў, актаў кіраўніка дзяржавы і заканчваючы ведамаснымі дакументамі», — адзначыла **дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Ірына БАБАЧОНАК.**

Так, ужо падрыхтаваны змяненні ў шэсць кодэксаў, 21 закон, 13 указаў Прэзідэнта. Прыняты шэраг рашэнняў урада, скарэктаваны ведамасныя, лакальныя дакументы. Большасць афіцыйных папер рэгулююць канкрэтныя віды напрамкаў дзейнасці. Разам з тым ёсць і тыя, якія закранаюць шырокі пласт грамадскіх адносін.

Важна і тое, што сёння максімальна спрошчана магчымасць увайсці ў бізнес. З'явіўся паведамляльны парадак пачатку ажыццяўлення дзейнасці — няма неабходнасці атрымліваць вялікую колькасць дазволаў, даведак. Прадпрымальнік сам ацэньвае сваю адпаведнасць правілам гульні і заяўляе аб жаданні працаваць.

«У гэтага механізма былі тыя, хто і за, і тыя, хто супраць. Ён не бясспрэчны, і мы гэта прызнаём. Але сёння можна канстатаваць, што ён спрацаваў. І дзейнічае амаль чатыры месяцы, за гэты час працаваць па паведамляльным прынцыпе па стане на 1 чэрвеня пачалі 1891 суб'ект. Лідарам тут з'яўлялася сфера гандлю, перавозак пасажыраў і багажу», — растлумачыла Ірына Бабачонак.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)*

## Ставіць кропку яшчэ рана

Бізнес-супольнасць сёння актыўна далучылася да нарматворчага працэсу. Асноўнай пляцоўкай, на якой гэта можна назіраць, з'яўляюцца грамадска-кансультатыўныя саветы, якія створаны практычна пры ўсіх органах дзяржкіравання, абласных і раённых выканкамах.

«І бізнес, і ўлада слухаюць адно аднаго. Усе ключавыя рашэнні праходзяць праз узгадненне з ГКС. Працэс дазваляе выключаць аднабокія нормы і патрабаванні, якія маглі б не задавальняць усіх удзельнікаў працэсу», — растлумачыла суразмоўніца.

На справе любое рашэнне па фарміраванні дзелавога клімату праходзіць некалькі абмеркаванняў. Напрыклад, на ўзроўні Міністэрства эканомікі на працягу месяца ў інтэрнэце размяшчаецца дакумент. Пры гэтым ідзе яго адкрытае абмеркаванне і збіраюцца думкі.

«Далей збіраецца ГКС, дзе мы вырашаем усё ў працэсе дыялогу. Потым пытанні разглядаюцца на Савеце па развіцці прадпрымальніцтва, без ўзгаднення з якім нарматыўна прававы акт не можа пайсці далей. Такое ўзгадненне абавязкова па рэгламенце Савета Міністраў. Сістэма дазваляе ўкараніць прадстаўнікоў бізнесу — практыкаў на ўсіх этапах», — расказала Ірына Бабачонак.

Пры гэтым яна адзначае, што ставіць кропку ва ўкараненні прынцыпаў Дэкрэта № 7 у працы заканадаўства краіны яшчэ рана. Аднак ужо сёння можна бачыць станоўчую дынаміку па колькасці самазанятых і зарэгістраваных суб'ектаў гаспадарання. Па даных адзінага дзяржаўнага рэгістра за студзень — май 2018 года зарэгістравана 4303 камерцыйныя арганізацыі. Гэта на 398 адзінак больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Зарэгістравана і 14 980 індывідуальных прадпрымальнікаў (на 637 больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года). Самазанятых, паводле інфармацыі МПЗ, на 1 красавіка налічвалася 16 195 чалавек, што на 5440 больш, чым за гэты перыяд летась.

«Мы ўжо бачым аддачу ад лібералізацыйнага пакета дакументаў. І чакаем значнага росту рамеснікаў. За 1 квартал рамесны збор выплацілі 7236 чалавек. Прыток занятых чакаецца і ў сферу аграэкатурызму. Лічбы ўсяляюць аптымізм», — канстатавала Ірына Бабачонак.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

> Ужо сёння можна бачыць станоўчую дынаміку па колькасці самазанятых і зарэгістраваных суб'ектаў гаспадарання. Па даных адзінага дзяржаўнага рэгістра, за студзень — май 2018 года зарэгістравана **4303** камерцыйныя арганізацыі. Гэта на 398 адзінак больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Зарэгістравана **14 980** індывідуальных прадпрымальнікаў (на 637 больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года). Самазанятых, паводле інфармацыі МПЗ, на 1 красавіка налічвалася **16 195** чалавек, што на 5440 больш, чым за гэты перыяд летась.

## Інкубатары па прынцыпе «якасць важнейшая за колькасць» і новыя задачы

Для таго каб забяспечыць вялікую глыбіню ўкаранення ў краіне духа Дэкрэту №7, працягваецца праца па асобным напрамкам, якія непасрэдна ўплываюць на ўмовы дзеля бізнесу. Так падрыхтаваны і знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта праект указа аб ліцэнзаванні. Ён прадугледжвае адмену ліцэнзавання пэўных відаў дзейнасці, скарачае патрабаванні і ўмовы да іх ажыццяўлення.

Акрамя таго, мяркуецца выключна судовы парадак спынення дзеяння ліцэнзіі. Пры гэтым, пры допушчэнні грубых парушэнняў не будзе неадкладнага спынення ліцэнзіі. Суб'екту гаспадарання дадуць шанц выправіцца. Таксама нормы ўказа прадугледжваюць цыфравізацыю гэтага працэсу — пераход да ліцэнзавання ў электронным выглядзе.

Яшчэ адзін глабальны дакумент закліканы зацвердзіць адзіны пералік адміністрацыйных працэдур для суб'ектаў гаспадарання. Ён аб'ядноўвае ўсе адміністрацыйныя працэдуры.

«Таксама органамі дзяржкіравання ў цеснай сувязі з бізнесам падрыхтаваны праект «Стратэгіі развіцця МСП да 2030 года: Беларусь — краіна паспяховага прадпрымальніцтва». Сёння гэты дакумент знаходзіцца ва ўрадзе, і ён вызначае будучыя крокі па развіцці ўсіх бізнес-працэсаў, рэфарміраванне сістэмы інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва», — расказала Ірына Бабачонак.

Дарэчы, на 1 ліпеня 2018 года ў краіне дзейнічала 99 цэнтраў падтрымкі і 27 інкубатараў. З іх каля трох чвэртак ад агульнай колькасці з'яўляюцца арганізацыямі прыватнай формы ўласнасці, астатнія — камунальнай альбо рэспубліканскай. Пры гэтым у мінэканоміцы лічаць, што колькасць інкубатараў сёння не кажа аб эфектыўнасці іх работы.

«Мы лічым, што неабходна забяспечыць умовы, пры якіх яны змогуць працаваць у адзінай сістэме. Сёння інкубатары сканцэнтраваны на выдзяленні плошчаў і абсталявання для пачаткоўца бізнесу на льготных умовах. Яны запатрабаваныя, але зрабіць іх больш эфектыўнымі магчыма», — растлумачыла кіраўнік дэпартамента.

Паводле яе слоў, з'явілася неабходнасць звярнуць увагу на магчымасць удасканалення інфраструктуры падтрымкі бізнесу ўвогуле. Зараз у дэпартаменце ідзе работа над пераглядам тых крытэрыяў, якія прад'яўляюцца цэнтрам падтрымкі і інкубатарам да сістэмы падтрымкі інфраструктуры. Будзе ўдзяляцца больш увагі якасці аказання паслуг і таму, каб гэтыя паслугі былі патрэбныя бізнесу.

«У дэпартаменце па прадпрымальніцтве ўжо працуюць над падрыхтоўкай дакументаў, якія вызначаць пералік патрабаванняў да цэнтраў падтрымкі і інкубатараў. Ёсць розныя бачанні перспектыў. Гэта можа быць як перарэгістрацыя, так і сертыфікацыя паслуг на пэўных узроўнях. Пытанне адкрытае. Мы аналізуем міжнародны вопыт. У хуткім часе могуць з'явіцца дакументы, якія будуць прадстаўлены на грамадскае абмеркаванне», — рэзюмавала Ірына Бабачонак.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Zамор'е

## «Я магу пераначаваць у метро?»

Пра што пытаюцца замежнікі на ЧС-2018



**Супрацоўнікі Маскоўскага метрапалітэна склалі спіс самых незвычайных і папулярных пытанняў, якія балельшчыкі задаюць валанцёрам, паведамляецца на сайце мэра Масквы.**

«Самымі папулярнымі пытаннямі сталі «Як дайсці да Краснай плошчы?» і «Дзе Нікольская вуліца?», прычым часта балельшчыкі проста паказваюць фатаграфію вуліцы з натоўпам з інтэрнэту. Акрамя таго, пасажыры з іншых краін цікавяцца, дзе станцыя з сабачкамі, маючы на ўвазе «Плошчу Рэвалюцыі», — расказаў намеснік мэра Масквы Максім Ліксутаў. Самымі незвычайнымі, на думку валанцёраў, пытаннямі турыстаў сталі: «Дзе спіць Ленін?», «Вы выйдзеце за мяне?» і «Калі ў мяне ёсць безлімітны білет на суткі, я магу пераначаваць у метро?» Больш за 100 валанцёраў штодня дапамагаюць балельшчыкам, адказваючы на іх пытанні і вырашаючы праблемы, якія ўзнікаюць у замежнікаў. Напрыклад, на станцыі «Барыкадная» адзін фанат выпусціў банкаўскую картку ў рашотку вадасцёка, і валанцёры дапамаглі яе дастаць. А турысту з Аргенціны вярнулі страчаны пашпарт.

## Жаніх спалохаўся навальніцы, нявеста адмяніла вяселле

**Жыхарка Індыі адмовілася браць шлюб з жаніхом падчас вясельнай цырымоніі, калі ён спалохаўся навальніцы, паведаміла выданне The Mirror.**



Інцыдэнт адбыўся ў штаце Біхар на ўсходзе краіны. Нявеста наадрэз адмовілася выходзіць замуж пасля таго, як яе выбраннік «павёў сябе дзіўна» падчас вымаўлення вясельных клятваў, убачыўшы, як маланка ўдарыла на полі непадалёку. Сваякі жаніха пачалі шумна пратэставаць, таму што святар ужо правёў некаторыя з вясельных рытуалаў, але на іх напалі блізкія нявесты. Усё скончылася жорсткай масавай бойкай. У выніку інцыдэнту былі арыштаваныя трое сваякоў нявесты.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 47

Наш сённяшні госць — **Міхаіл Уладзіміравіч Паляшчук** з Лідчыны. Нарадзіўся ён у 1961 годзе, тэхнік-нафтавік па прафесіі, аўтар больш чым 20 задач. Вось адна з іх ***(гл. дыяграму).***




**Белыя:** Крс1, Фg7, Сg8, Ка6, пп. d4, е2, f4 (7).

**Чорныя:** Крс3, Лd6, п. h4 (3).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

**У Мінску адначасова адбыліся другі чэмпіянат свету па бліцы і хуткіх шахматах сярод кадэтаў (хлопчыкаў і дзяўчынак да 8, 10 і 12 гадоў) і «дарослы» Мемарыял Віктара Купрэйчыка па хуткіх шахматах.**

Пра дзіцячыя спаборніцтвы — у наступным выпуску, а ў Мемарыяле гуляў 101 шахматыст (55 з Беларусі, 29 з Расіі, астатнія — з Азербайджана, Арменіі, Інданезіі, Латвіі, Манголіі, Узбекістана і Украіны: 12 гросмайстраў, 10 міжнародных майстроў, 9 майстроў ФІДЭ). Прызавую тройку склалі гросмайстры Рауф Мамедаў (Азербайджан), Антон Корабаў (Украіна) і Дзмітрый Андрэйкін (Расія). Найлепшыя з беларусаў — Аляксей Фёдараў (4-е месца), Уладзіслаў Кавалёў (6-е), Аляксей Аляксандраў (7-е) і Вячаслаў Зарубіцкі (9-е). Адбыўся таксама «турнір ветэранаў» — шматгадовых паплечнікаў В. Купрэйчыка па спаборніцтвах, у тым ліку легендарных гросмайстраў Уладзіміра Тукмакова, Юрыя Балашова, Рафаэла Ваганяна, Яўгена Свешнікава ды іншых (з 13 удзельнікаў — 8 гросмайстраў, 3 міжнародныя майстры). 1-2-е месцы падзялілі Уладзімір Тукмакоў (Украіна) і Валерый Чэхаў (Расія), трэці быў Нухім Рашкоўскі (Расія). З беларусаў найлепшыя — Вячаслаў Дыдышка (5-е месца) і Андрэй Кавалёў (6-е).

**Юрый Балашоў — Вячаслаў Дыдышка.** 1. е4 с5 2. Ке2 Kf6 3. Kbc3 d6 4. g3 Кс6 5. Cg2 Cg4 6. h3 Cd7 7. d4 cd 8. K:d4 е6 9. 0-0 Се7 10. Се3 0-0 11. Фе2 а6 12. Лаd1 Фс7 13. g4 K:d4 14. C:d4 Сс6 15. f4 Kd7 16. g5 е5 17. fe K:e5 18. h4 Лfe8 19. Kd5 C:d5 20. ed Cf8 21. с3 g6 22. Лf4 Cg7 23. Лdf1 Ле7 24. Се4 Лае8 25. Фf2 Кс4 26. C:g7 Кр:g7 27. Фd4+ Kpg8 28. C:g6 hg 29.Ф:с4 Фb6+ 30. Л1f2 Фе3 31. Фd4 Фg3+ 32. Kph1 Ле1+ 33. Лf1 Л:f1+ 34. Л:f1 Ле2, 0:1.

**Андрэй Кавалёў — Валерый Жыдкоў.** 1. е4 е5 2. Kf3 Кс6 3. Сс4 Kf6 4. d3 h6 5. 0-0 d6 6. с3 g6 7. Ле1 Cg7 8. d4 0-0 9. h3 Ле8 10. de K:e5 11. K:e5 de 12. Фb3 Се6 13. Kd2 Лb8 14. Kf3 C:c4 15. Ф:с4 а6 16. В3 Фd7 17. Cb2 Фе6 18. Ф:с7, 1:0.

* * *

**Беларускія школьнікі з Бабруйска занялі дзявятае месца сярод 100 камандаў на міжнародным турніры «Белая ладдзя» ў Сочы.**

На рэспубліканскай спартакіядзе школьнікаў у Ждановічах прызавую тройку склалі Мінск, Магілёўская і Гомельская вобласці. У Рагачове (85 удзельнікаў) прызёрамі ў бліцы сталі Юрый Борсук, Міхаіл Спіжарны і Максім Царук, у хуткіх шахматах — Юрый Борсук, Арцём Сіняўскі і Дзмітрый Кананенка. Бліц-турнір у Магілёве (47 гульцоў) выйграў Арцём Скрыбук.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Kf3. Першыя правільна адказалі Аляксандр Сямерыч, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

■ Сядзі і глядзі

## ВЕЦЕР ПРЫГОД



### «ЗАБОЙСТВА НА ТРАІХ»

**«Беларусь 1», 10—13 ліпеня**

Чатырохсерыйны іранічны дэтэктыў — частка кінасерыі, знятай паводле цыкла дэтэктываў Наталлі Аляксандравай. У цэнтры падзей фільмаў і кніг — тры сяброўкі: рэпетытар Ірына, уладальніца натарыяльнай канторы Жанна і мастачка Каця. У гэтага трыа ёсць агульны талент: трапляць у заблытаныя і небяспечныя крымінальныя сітуацыі, а потым бліскуча, хоць часам пры поўнай адсутнасці логікі, іх вырашаць і дапамагаць правасуддзю караць злачынцаў.



### «БРАТЫ ГРЫМ»

**«Беларусь 3», 13 ліпеня**

Даўней жылі-былі два браты, авантурысты па натуры і амаль што прафесійныя падманшчыкі, якія за грошы «праганялі нячысцікаў» з дамоў забабонных сялян. Гэты занятак прыносіў Уільяму і Якабу неблагі прыбытак і рэпутацыю, якая ў адзін цудоўны дзень і «падвяла іх пад манастыр».

Напалеонаўскія ўлады, даследуючы серыю загадкавых знікненняў маладых дзяўчат у лясным гушчары на мяжы Францыі і Германіі, прымусілі братоў да супрацоўніцтва, — і тыя неўзабаве зразумелі, што маюць справу з сапраўдным чараўніцтвам, да таго ж, мякка кажучы, недружалюбна настроеным да пабочнага ўмяшання... Будучым казачнікам давядзецца праявіць усю сваю фантазію і здольнасці, каб перамагчы зло, інакш іх саміх чакае гільяціна...



### «СКАРБЫ О. К.»

**«МІР», 12 і 13 ліпеня**

У старыя часы — страшна падумаць, 500 гадоў таму, — падчас асады Казані Іванам Грозным тагачасная ўладарка горада і ханства наогул, ханша Сююмбіке, загадала схаваць незлічоныя скарбы на дне возера Кабан. Так лёс ханскай казны і згубіўся б у каламутнай вадзе, калі б цалкам выпадкова таямніца скарбаў не стала вядомай Кірылу — нашаму сучасніку, заўзятаму лавеласу, авантурысту і бязмежна ўпэўненаму ў сабе хлопцу. Падчас пошукаў схаваных багаццяў ён сустракаецца з прыгажуняй Гульнарай — і калі напачатку ўспрымае яе непрыступную стрыманасць як выклік, то пасля шэрагу пройдзеных разам дарог і пражытых выпрабаванняў усведамляе, што, магчыма, скарбы — далёка не самая галоўная ўзнагарода для яго...

Што цікава, гісторыкі і вопытныя скарбашукальнікі сцвярджаюць, што скарб у возеры сапраўды ёсць, але ўкрыты ён надзейна — у 20-метровай тоўшчы глею, прытым што глыбіня самога возера на асобных участках дасягае 40 метраў.




## Як двойчы два?

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**ка́йстра —** дарожная торба;

**трыснёг —** балотная расліна;

**дасці́пны —** востры, смешны;

**самаві́ты —** мажны, дужага целаскладу;

**глю́га —** дзюба драпежнай птушкі;

**скру́ха —** жаль, шкадаванне.

**Як двойчы два —** усё вельмі зразумела, проста, бясспрэчна. Беларусы яшчэ скажуць: *як свет божы, як піць даць.* Рускія: *как дважды два, как божий день.*

**Ні села ні пала —** неспадзявана, нечакана, без якіх-небудзь на тое падстаў. Беларускія адпаведнікі: *не знай не ведай, без нічога ніякага.* Рускія: *ни с того ни с сего, с бухты-барахты.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!

**13 ліпеня сярод сваіх падпісчыкаў на трэці квартал або другое паўгоддзе «Звязда» разыграе сем дубовых бочак ёмістасцю 10 літраў і адну (суперпрыз) — ёмістасцю 30!**

**Не забудзьцеся запоўніць купон *(глядзіце справа),* выразаць яго і да 11 ліпеня даслаць у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а. А ўжо далей...**

**Вам пашанцуе!**

***Падрабязныя правілы гульні змешчаны ў нумары за 31 мая. Тэрміны правядзення гульні — з 01.06.2018 да 30.09.2018.***

***Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3284 ад 25.05.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.***



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______

______

Падпіска аформлена і аплачана ў ______
(аддзяленне сувязі)

на III квартал або II паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ______ (індэкс)

______

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**7.00, 16.35 Меладрама «Кафэ на Садовай» (16+).**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал». (12+).
9.45 «Код нацыі». Фільм 4-ы.
10.25 «Народная раніца» (6+).
11.05 «Вакол планеты».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «50 рэцэптаў першага» (12+).
**13.15 Меладрама «Сакрэт неприступнай прыгажуні» (12+).**
15.15 «Твой горад».
**15.30 Серыял «Таткі» (16+).**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 «Галоўны эфір».
22.00 XXVII Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2018». Фінал. Дзень другі «Фестывальны хіт».
**0.00 Меладрама «Пуанты для плюшкі» (16+).**

## Беларусь 2

6.55 М/с «Усё пра Розі» (0+).
**7.05 Камедыя «Ханна Мантана: кіно» (12+).**
8.50, 20.10 «Тэлебарометр».
8.55 «Свет навыварат. Непал» (16+).
9.50 «На нажах. Атэлі» (16+).
10.50 «Спатканне для мамы». (12+).
11.45 М/с «Качыныя гісторыі» (0+).
13.00 «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
13.55 «Вяселле ўсляпую» (16+).
**15.20 Прыгоды «Піраты Карыбскага мора: куфар мерцвяка» (12+).**
17.45 «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон» (16+).
20.45 «Мяняю жонку» (16+).
22.00 «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
**22.05 Меладрама «Пакуль ты спаў» (12+).**
23.50 «Не злуйце дзяўчынак». Скетчкам (16+).

## Беларусь 3

7.35 «Святыні Беларусі».
8.00, 12.20 Навіны культуры.
8.15, 12.35 Гэты дзень.
8.20 М/ф (0+).
**8.45, 21.05 «Тры таполі на Плюшчысе». Меладрама (12+).**
10.05 «Наперад у мінулае».
10.30 «Нацыянальны хіт-парад».
11.25 «Майстры і куміры». Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Валерый Анісенка.
**12.40 «Корцік». Маст. фільм (6+).**
16.15 «Жывая культура». Неглюбскія народныя тэкстыльныя традыцыі. Веткаўскі раён.
**16.40 «У квадраце 45». Драма (12+).**
**17.50 «Соль зямлі». Маст. фільм (12+).**
19.00 «Славянскі базар у Віцебску-2018». Канцэрт «International Voice in Vitebsk».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.20 «Славянскі базар — 2017». Прысвячэнне Аляксандру Ціхановічу.
23.55 «Святыні Беларусі».

## Беларусь 5

7.00 Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Беларусі на кароткай вадзе.
8.45 Тэніс. Уімблдон. Жанчыны. Фінал.
10.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Матч за 3-е месца.
13.05 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (U-20). Дзённая сесія.
16.10 Піт-стоп.
16.40 Гульні «навырост».
17.15 Футбол. Чэмпіянат свету. Прэв'ю.
17.45 Футбол. Чэмпіянат свету. Фінал.
20.40 Тэніс. Уімблдон. Мужчыны. Фінал.
23.20 Вынікі тыдня.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10 Серыял «Праменьчык» (16+).**
9.10 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.25 «Здароўе» (16+).
10.35 «Бесталковыя нататкі» (12+).
10.55 «Зінаіда Кірыенка. «Я ў кіно напакутавалася» (12+).
12.00 «Слова гонару» (12+).
12.50 «Аляксандр Дамагараў. Рыцар сумнага вобразу» (16+).
**13.55 Маст. фільм «Белая ноч, пяшчотная ноч...» (16+).**
16.20 «Лепш за ўсіх!» Выбранае (6+).
20.00 «Контуры».
21.05 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Летні кубак ва Уладзівастоку (16+).

## СТБ

6.35 «Глядзець усім!» (16+).
**6.55 Прыгоды «Ягуар» (12+).**
**8.35 Драма «Гульня ў імітацыю» (16+).**
10.30 «Цэнтральны рэгіён».
**11.00, 13.45, 16.40 «Участак лейтэнанта Качуры». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
**20.35 Трылер «Мемента» (16+).**
22.30 Дакументальны спецпраект (16+).
23.30 «Соль. Класіка. Частка 2» (16+).
1.15 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).

## МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду» (6+).
6.10, 7.30 М/ф (0+).
6.30 «Такія дзіўныя» (16+).
7.00 «Захавальнікі тайн» (12+).
9.00 «Здабытак рэспублік. Васьмідзясятыя» (12+).
9.30 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
10.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Як у рэстаране» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Вялікі перапынак» (0+).**
**16.05, 18.00 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!» (12+).**
17.00, 0.00 «Разам».
**22.45, 1.00 Маст. фільм «Прага помсты» (16+).**
2.30 «Пра што базар». Дзённік Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» (12+).
2.40 «XXVII Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2018». Фінал. Дзень першы: «Славянскі хіт» (12+).

## РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху» (16+).
**7.30 Маст. фільм «Шчасце па дагаворы» (12+).**
11.00, 16.00 Весткі.
11.20 «Сам сабе рэжысёр» (16+).
12.15 «Ранішняя пошта» (16+).
13.00 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна» (16+).
13.30 «Калі ўсе дома» (12+).
**14.30 Маст. фільм «Сыходзячы — сыходзь...» (12+).**
**17.30 Маст. фільм «Ад смутку да радасці» (12+).**
**20.45 Маст. фільм «Легенда № 17» (12+).**
**23.00 Маст. фільм «Паддубны» (12+).**
1.00 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

6.15 «Астрапрагноз».
**6.20 Серыял «Час Волкава» (16+).**
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 «Сёння».
8.20 «Аднойчы...» (16+).
8.55 «Іх норавы» (0+).
9.20 «Хто ў доме гаспадар?» (16+).
10.25 «Першая перадача» (16+).
11.05 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.00 «Дачны адказ» (0+).
13.10 «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.15 Серыял «Круты» (16+).**
16.20 «Следства вялі...» (16+).
18.05 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.30 Дэтэктыў «Мядзведжая хватка» (16+).**
**22.40 Серыял «Казакі» (16+).**

## 8 канал

9.00, 16.00, 18.50, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
9.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
9.15 «Мой любімы гадаванец» (0+).
9.45 «Сад і агарод».
**10.00 Трылер «Місія невыканальная-2» (16+).**
**12.05 Баявік «Брыльянты назаўжды» (12+).**
**14.10 Прыгоды «Кон-Цікі» (6+).**
16.05 Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.10 «Глядзім усёй сям'ёй». Маст. фільм «Сёрфер душы» (12+).**
**18.00 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**18.55 Камедыя «Шукальнікі прыгод» (16+).**
20.50 «Вечарніца» (0+).
**21.05 Трылер «Крывавы дыямент» (16+).**



## ВТБ

6.00 «Паспець за 24 гадзіны». (16+).
7.00, 16.15 Серыял «Варонін». (12+).
8.30 М/ф «Скубі Ду». (6+)
9.00, 4.15 М/ф «Дуда і Дада». (0+)
9.25, 4.35 М/ф «Смяшарыкі». (0+)
10.00 «Ералаш». (6+).
10.45, 17.50, 22.35 «Уральскія пельмені». (16+).
12.25 «Мужчынская справа». (16+).
13.00, 5.10 Серыял «Ранеткі». (12+).
14.00, 1.50 Серыял «Маладзёжка» (12+).
20.00 Камедыя «Чаго хочуць жанчыны». (12+).
23.00 Серыял «Геймеры». (16+).
0.00 Серыял «Вечны водпуск». (16+).
1.00 Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
3.35 «Проста кухня». (16+).

## Культура

6.30, 7.00, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15 Навіны культуры.
6.35, 17.30 «Палонніца лёсу». Жанета Ловіч.
7.05, 18.00 «У лясах і на гарах». Серыял.
7.50 «Герард Меркатар». Дак. фільм.
8.05 «Пешшу...» Масква італьянская.
8.30 Юбілей Ліі Ахеджакавай. «МамаАнуш». Маст. фільм.
9.40, 14.15, 2.35 Сусветныя скарбы.
10.15 «Назіральнік».
11.15 85 гадоў з дня нараджэння Элема Клімава. «Прыгоды зубнога ўрача». Маст. фільм.
12.30 Каханне ў мастацтве. «Марыя Калас і Арыстоцель Анасіс». Дак. фільм.
13.15, 0.05 «Дзікенсіяна». Серыял.
14.30 «Урокі малявання».
15.10 «Пісьмы з правінцыі». Петушкі (Уладзімірская вобласць).
15.40, 19.45 «Свет Стоўнхэнджа». Дак. фільм. 1-я серыя.
16.35, 1.40 Уладзімір Федасееў і БСА імя П. І. Чайкоўскага. М. Рымскі-Корсакаў. Сімфанічная сюіта «Шэхеразада».
18.45, 1.00 «Вочы. Тайна зроку». Дак. фільм.
20.40 «Добрай ночы, малыя!»
20.55 Успамінаючы мастака. «Ілья Глазуноў. Расійская акадэмія жывапісу, скульптуры і дойлідства». Дак. фільм.
21.35 «Кацярына». Серыял.
23.00 Колер часу. Леон Бакст.
23.35 «Дваццатае стагоддзе. Страта нявінасці». Дак. серыял. (16+).

## Настальгія

6.00, 0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год. 1960. 2009 год (12+).
**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Савецкі аўтамабіль — сябар сям'і». 2006 год (12+).
**6.50, 8.35, 9.40, 11.00, 11.40, 14.25, 15.40, 17.00, 18.40, 20.40, 21.40, 23.00, 23.40, 0.50, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 13.05, 19.20, 1.10** Маст. фільм «Цыган» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.30, 23.30** «Сядзі і глядзі» (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (12+).
**18.00** «Яловая субмарына». Жанна Агузарава. 2005 год (12+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Тбілісі-80». 2005 год (18+).
**5.35** Маст. фільм «Глыбокія сваякі» (16+).

## EuroSport 1

**4.00, 7.00, 9.30, 13.00, 14.00, 20.00, 22.00, 0.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**6.00, 11.00, 18.50, 23.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**8.00, 21.00, 2.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**9.00, 21.30** Аўтагонкі. Формула Е.
**12.30** «Дух парусная спорту».
**13.55, 18.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.

## Кінакамедыя

**0.55** Дзень выбараў. (16+).
**3.25** Падкідыш. (0+).
**4.30** Газелі. (16+).
**6.25** Авечка Долі была злая і рана памерла. (6+).
**8.40** Гіпапатам. (18+).
**10.20** }{от@бь)ч. (16+).
**12.10** Пра што гавораць мужчыны. (16+).
**14.00** Пра што яшчэ гавораць мужчыны. (16+).
**16.00** Жывёла. (12+).
**17.30** Гульні. (16+).
**19.30** Краіна цудаў. (12+).
**21.05** Гульня. (12+).
**23.00** Рэальныя ваўкалакі. (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.35** «Паехалі!» (12+).
**8.05** «Доктар І...» (16+).
**8.40, 19.00, 2.30** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**13.00, 16.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.00** «Адкрыта» з Аксанай Байрак» (16+).
**14.55** «Простыя складанасці» (12+).
**15.25** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Алмазы Цырцэі». Серыял (12+).
**21.50** «Савецкія мафіі» (16+).
**22.40, 5.30** «Рэальныя гісторыі» (16+).
**23.10** «Грань». Серыял (16+).
**0.00** «Троя». Драма (16+).



## ТБ1000

**6.10, 17.55** Анёлы Чарлі: толькі наперад. (12+).
**8.25** Гонка. (16+).
**10.55** Пакуль не згуляю у скрыню. (12+).
**13.05** Даспехі бога: у пошуках скарбаў. (12+).
**15.20** Дзённік памяці. (16+).
**20.10** Яшчэ адна з роду Балейн. (16+).
**22.25** Акадэмія вампіраў. (12+).
**0.30** Холад у ліпені. (16+).
**2.35** Іншы свет: абуджэнне. (18+).
**4.20** Больш, чым жыццё. (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Прагулка. (12+).
**8.10** Купрын. Упоцемку. (16+).
**10.20** Арда. (16+).
**12.50** Мой сябар Іван Лапшын. (0+).
**14.45** Аднакласніцы: новы паварот. (16+).
**16.20, 4.20** Усё да лепшага. (12+).
**18.20** Тайна чатырох прынцэс. (0+).
**20.20** Галасы вялікай краіны. (6+).
**22.20** Бывайце, доктар Фрэйд! (12+).
**0.30** Маёр. (18+).
**2.25** Вайна полаў. (16+).

## National Geographic

**6.00, 5.10** Найцяжэйшы ў свеце рамонт. (12+).
**6.50** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.40, 13.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25, 17.10, 21.10, 2.45** Аўта-SOS. (12+).
**9.15, 14.00** Дзікі тунец. (12+).
**11.45, 2.00** Золата Юкана. (12+).
**12.30, 20.25** Інстынкт выжывання. (16+).
**16.25, 23.30** Геній: Пікаса. (16+).
**18.00, 22.00, 1.10, 4.20** Ледзяная дарога. (12+).
**19.35, 0.25** Расследаванні авіякатастроф. (16+).

## Discovery

**8.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00, 19.00, 0.00, 5.30** Паляўнічыя на рэліквіі. (16+).
**12.00** Маланкавыя катастрофы. (16+).
**13.00, 3.50** Вулічныя гонкі. (16+).
**14.00** Узрываючы гісторыю. (12+).
**17.00, 7.10** Разбуральнікі легенд. (16+).
**18.00, 6.20** Хуткія і гучныя. (12+).
**20.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**1.00** Амерыканскі чопер. (12+).
**2.00** Не спрабуйце паўтарыць. (16+).
**2.55** Як устроены Сусвет. (12+).

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# БІЗНЕС У ГЛЫБІНЦЫ — ЁСЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ!

**Прыкладна чвэрць падаткаў у бюджэт Віцебшчыны — ад прадпрымальніцтва. Бізнес Прыдзвінскага краю забяспечвае прыкладна палову экспарту і больш за 60 % экспартных паслуг. У прадпрымальніцкай сферы занята прыблізна 29 % ад усіх, хто працуе, — каля 140 тысяч. Гэтая статыстыка, канешне, не поўнасцю характарызуе недзяржаўны сектар эканомікі. На сённяшні дзень у вобласці дзейнічае прыблізна 8,6 тысячы малых і сярэдніх бізнес-арганізацый і 21,5 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў.**

Каб яны працавалі больш эфектыўна, з'яўляліся новыя, развіваліся, багацелі, многае робіцца на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях улады.

## Толькі заяві

Апошнім часам шмат пішуць і гавораць пра паслабленні для бізнесу. І зроблены рэальныя крокі насустрач.

**Старшыня камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА** канстатавала, што, напрыклад, значна паменшылася колькасць ветэрынарных патрабаванняў, як і санітарных. А ў цэлым па розных кірунках — у 10—13 разоў.

А паводле слоў **начальніка Віцебскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, дэпутата абласнога Савета Аляксандра КЛАБУКА,** у прыватнасці, у пытаннях пажарнай бяспекі патрабаванні знізіліся ў 12 разоў.

**Начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Віцебскай вобласці Валерый ЛАБАЦЭВІЧ** адзначыў, што дзякуючы Указу № 337, дзелавыя людзі атрымалі прэферэнцыі. Размова ідзе пра грамадзян, якія могуць аказваць розныя паслугі: цырульніцкія, касметычныя, рамонтныя і гэтак далей — без афармлення ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. А толькі па заяўным прынцыпе. Дарэчы, у гэтым назіраецца актыўная станоўчая дынаміка. У прыватнасці, калі ў пачатку года такім чынам працавала больш за 270 грамадзян, то на пачатак чэрвеня іх ужо налічвалася 850.

## А ў вёсках выгадней

Між іншым, становіцца ўсё больш ахвотных працаваць рамеснікамі. За год іх колькасць павялічылася на чвэрць. У канцы мінулага года было каля 3,8 тысячы. Па прыблізных падліках, сёлета іх на 1,2 тысячы больш.

На 35 % павялічылася на Віцебшчыне колькасць грамадзян, якія аказваюць паслугі агратурызму — каля 610. Пры гэтым, у Талачынскім раёне, дзе ёсць многа чаго паказаць турыстам, прырода не горшая, чым у суседніх, чамусьці ахвотных займацца выгадным бізнесам не знайшлося. А ў Дубровенскім і Лёзненскім, паводле інфармацыі падаткавікоў, ёсць па дзве сядзібы.

Наконт прывабных умоў для вядзення бізнесу ў глыбінцы. Ва Указе № 345 гарантаваныя вельмі прывабныя ўмовы для тых, хто займаецца гандлем, грамадскім харчаваннем і аказвае бытавыя паслугі. У спісе населеных пунктаў, якія выбраны і трапляюць пад дзеянне ўказа, каля 90 % ад усіх. А гэта — каля 5,7 тысячы вёсак, пасёлкаў...

У вобласці шмат будынкаў, збудаванняў, якія трэба выкарыстоўваць. Эканамісты аблвыканкама падлічылі, што ва ўсёй Віцебшчыне з 521 тысячы «квадратаў» плошчаў прадпрымальнікамі арандуецца толькі 3 %.

## Веды — аснова поспеху

Актуальныя пытанні наконт стану і развіцця прадпрымальніцтва на перыферыі абмяркоўваліся на чарговай сесіі абласнога Савета дэпутатаў.

**Старшыня Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** патрабаваў больш актыўна зацікаўліваць тых, хто хоча распачаць сваю справу. Падтрымка бізнесу ў ліку іншага можа дапамагчы спыніць адток з вёскі моладзі, у цэлым працаздольнага насельніцтва — у райцэнтры і вялікія гарады. Неабходна больш актыўна растлумачваць усе нюансы і патэнцыйную выгаду, весці пастаянную інфармацыйную работу. Гэта трэба, каб як мага больш людзей ведалі пра льготы, магчымую падтрымку ў фінансаванні, перадачу маёмасці.

Будзе развівацца бізнес, у бюджэт пералічаць больш паступленняў. Апошняе дазволіць больш эфектыўна вырашаць самыя розныя сацыяльныя і іншыя пытанні. Але практыка паказвае, што, напрыклад, інвестары вырашаюць укладваць грошы туды, дзе адчуваюць большую зацікаўленасць прадстаўнікоў мясцовай улады. Чаму менавіта ў канкрэтны, а не суседні раён? Пытанне, якое застаецца адкрытым.

У пачаткоўцаў ёсць магчымасць навучыцца зарабляць і даць работу іншым. Напрыклад, бясплатнаўым прапаноўваюць паспрабаваць сябе ў новай сферы. У населеных пунктах праводзяць бясплатныя бізнес-трэнінгі пад эгідай розных фондаў і праграм.

У вобласці дзейнічаюць тры інкубатары і восем цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ДА ВЕДАМА

# ЯК ЖЫХАРАМ РЭГІЁНАЎ СТАЦЬ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМІ

## У малых гарадах набываюць папулярнасць семінары па навучанні асновам бізнесу

Адзін са спосабаў вырашэння праблемы занятасці ў рэгіёнах — адкрыццё ўласнай справы. Тым больш што дзякуючы Дэкрэту № 7, бізнес-клімат у краіне спрыяльны. Аднак час дылетантаў прайшоў, без ведаў разлічваць на поспех не даводзіцца. Менавіта таму ў рамках праекта «Садзейнічанне занятасці і самазанятасці насельніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Рэспублікі Беларусь» праводзяцца навучальныя семінары.



Сёлета такія семінары прайшлі ўжо ў 15 гарадах Магілёўскай і Віцебскай абласцей. 3 491 удзельніка было 57 беспрацоўных і 9 супрацоўнікаў рэгіянальных цэнтраў занятасці. Таксама цікавая статыстыка па гендарнай прыкмеце: найбольш актыўна вучацца жанчыны — іх было 309.

Слухачы семінараў абмеркавалі нюансы псіхалогіі прадпрымальніцтва і метады ацэнкі бізнес-ідэй, навучыліся складаць бізнес-планы і даведаліся, дзе атрымаць фінансаванне для пачатку сваёй справы. Асновы права і падаткаабкладання, шляхі прасоўвання тавараў і паслуг — гэтым тэмам таксама ўдзялялася шмат увагі. Акрамя таго, удзельнікі даведаліся аб рабоце кантактна-кааперацыйных біржаў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях з мэтай пошуку партнёраў у Расіі і Казахстане.

Тэматыка новых заняткаў вызначаецца ў тым ліку па выніках вывучэння анкет. Два семінары па франчайзінгу пройдуць у ліпені: 12 — у Мінску і 16 — у Віцебску. Выступаючы перад слухачамі, Вольга Лявонцьева, старшыня Асацыяцыі франчайзераў і франчайзі «Белфранчайзінг», абавязкова падзеліцца гісторыямі поспеху рэгіянальных прадпрымальнікаў. У прыватнасці, піцэрыя «Pizza Smile» у Жодзіне стала першай установай у нашай краіне, адкрытай па беларускай франшызе ў сферы грамадскага харчавання. Прадпрымальнік, які набыў франшызу, не меў ніякага вопыту ў грамадскім харчаванні, але праз тры месяцы пасля адкрыцця змог вывесці сваю ўстанову ў тройку лідараў сеткі па выручцы і працягвае ўтрымліваць свае пазіцыі. Піцэрыя атрымала грамату Жодзінскага выканкама як найлепшая ўстанова грамадскага харчавання горада ў 2017 годзе. Інвестыцыі прадпрымальнікаў вяртаюцца ў адпаведнасці з бізнес-планам, распрацаваным на самым старце.

Веды ў сферы прадпрымальніцтва зараз вельмі запатрабаваныя, і важна, каб яны былі даступныя ў рэгіёнах. Таму ў пяці пілотных гарадах Віцебскай і Магілёўскай абласцей будуць створаны бізнес-інкубатары або навучальныя цэнтры для прадпрымальнікаў. Ужо вызначаны іх адрасы: Барань, Глыбокае, Мсціслаў, Крычаў і Чавусы.

Застаецца дадаць, што праект ПРААН «Садзейнічанне занятасці і самазанятасці насельніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Рэспублікі Беларусь» фінансуецца Расійскай Федэрацыяй. Партнёрамі праекта з'яўляюцца Дэпартамент па прадпрымальніцтве Мінэканомікі, Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў і Банк Развіцця Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнік праекта Марына Каліноўская адзначае, што завочна прайсці пачатковае навучанне можа кожны ахвотны. Для гэтага трэба зайсці на старонку www.by.undp.org, у раздзеле «Наша дзейнасць» знайсці «Праекты ПРААН у Беларусі» і спампаваць дапаможнік па асновах прадпрымальніцтва «Малы бізнес з вынікам».

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

РЭГІЯНАЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА

# У НЯСВІЖЫ, ЯК У ТОЙ ГРЭЦЫІ, ЁСЦЬ АМАЛЬ УСЁ

**Нясвіж ведаюць як турыстычны горад. Але тыя, хто цікавіцца развіццём рэгіёнаў, могуць сказаць, што аграпрамысловы комплекс раёна па-за канкурэнцыяй у краіне, што тут моцная прамысловасць. Адны з найлепшых у Беларусі сферы аховы здароўя, адукацыі, культуры. А сам горад на працягу апошніх гадоў павялічыўся на тысячу жыхароў. У Нясвіжы актыўна будуецца жыллё: арэнднае, па дзяржзаказе, індывідуальнае. Моладзь ганарыцца сваім горадам і ахвотна прыязджае сюды на работу пасля заканчэння сярэдне-спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. А гэта не толькі кадравы патэнцыял, але і надзея на тое, што ў будучыні яны, магчыма, адкрыюць сваю справу, створаць новыя рабочыя месцы для землякоў і памножаць бюджэт раёна.**

— У Нясвіжы ёсць ўсё ці амаль ўсё. Тут прэстыжна і камфортна працаваць, — кажа **намеснік старшыні райвыканкама Людміла МЯДЗВЕДЗЕВА.** — Стабільна развіваецца малы і сярэдні бізнес. У раёне налічваецца 876 індывідуальных прадпрымальнікаў і 244 юрыдычныя асобы недзяржаўнай формы ўласнасці. Утрымліваецца амаль баланс паміж прыватнікамі: колькі рэгіструецца, столькі іх і закрываецца. Справа ў тым, што, паводле Указа Прэзідэнта № 337, фізічныя асобы могуць аказваць розныя паслугі без рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Таму людзі карыстаюцца такой магчымасцю. Тое ж самае датычыцца юрыдычных асоб: прадпрыемствы, што створаны, паспяхова развіваюцца. Хто не вытрымлівае канкурэнцыю, няпростыя рынкавыя ўмовы, — закрываюцца. Але для нашага невялікага раёна, дзе 39 тыс. жыхароў, такая колькасць юрыдычных асоб і прадпрымальнікаў гэта не так і мала.

Ініцыятыўныя людзі раёна займаюцца рознымі відамі дзейнасці: гандлем — трэць ад агульнай колькасці, будаўніцтвам, транспартнымі ды іншымі паслугамі — адпаведна каля 30 %. Асобныя развіваюць вытворчасць: выпускаюць шклопакеты, плітку, агароджу, мэблю, медыцынскія прэпараты, дзіцячае харчаванне.

Нясвіж адносіцца да малых гарадоў, і тут адпаведна дзейнічаюць ільготы, якія вызначаны ва ўказах, дырэктывах, пастановах. Таму сваю справу ў населеным пункце рэгіструюць нават жыхары з вялікіх гарадоў, напрыклад Мінска.

— Цяпер вельмі актуальнае пытанне, як для Беларусі, так і для нашага рэгіёна, — прыцягненне ў гаспадарчы абарот нявыкарыстанай маёмасці. У невялікіх вёсках закрываецца частка магазінаў, дзесьці — клубы, школы, бібліятэкі. І гэтыя будынкі стаяць незапатрабаваныя. Таму ў першую чаргу прапаноўваем іх прыватнаму бізнесу для адкрыцця вытворчасці, аказання паслуг. І людзі ў прынцыпе купляюць або бяруць у арэнду нерухомасць, — канстатуе Людміла Віктараўна. — Напрыклад, у вёсцы Быхаўшчына чалавек набыў будынак былой школы і вырошчвае вешанкі. Людзі выкупляюць памяшканні былых вясковых крамаў у райспажыўсаюза і зноў жа адкрываюць свае гандлёвыя пункты. Такія прыклады ёсць у вёсках Мацылёўшчына, Квачы, дзе пражываюць адпаведна каля 70 і 130 чалавек. Калі ў населеным пункце налічваецца менш за 200 жыхароў, адпаведна сацыяльным стандартам тут можа і не быць магазіна наогул, а пакупнікоў абслугоўвае аўтакрама. Разам з тым прыватніку выгадна ў малакалкасных вёсках арганізоўваць гандлёвыя паслугі.

*(Заканчэнне на 14-й стар. «МС»)*

СВАЯ СПРАВА

# З ХЭШТЭГАМ «НА ПАЛІЧКУ»

**— У нашу краму з ласкавай мілагучнай беларускай назвай «Свая палічка» людзі прыходзяць па сапраўдную творчасць, — кажа індывідуальны прадпрымальнік Лілія КАЛЮЖНАЯ.**
**Хутка год як яна ў цэнтры Гомеля адкрыла невялічкае памяшканне, якое працуе не толькі як гандлёвая зала, але і як пляцоўка, дзе збіраюцца майстры «з рукамі». Не толькі для таго, каб сваю творчасць прадэманстраваць, але і павучыцца адзін у аднаго. Напрыклад, таму, як правільна весці акаўнты ў сацыяльных сетках.**

— Як ставіць хэштэгі, як пазначаць лакацыі, — тлумачыць ужо дасведчаная Лілія. — Каб сюды да нас прыходзілі, а не шукалі каларытныя падарункі ў месцах, дзе іх няма. Для мяне асноўная тэма — самазанятасць людзей. Паліца можа быць рэальная і віртуальная. Сёння многія не ведаюць, як навучыцца трапляць у віртуальную прастору. Фестывалям з удзелам рамеснікаў таксама трэба абгрэйдзіцца — каб людзям захацелася ехаць.

Некаторыя майстры, пакуль яшчэ невядомыя, прыносяць у крамку вырабы «на спробу». Яны і самі пакуль не ўпэўнены, ці будзе карыстацца попытам у пакупніка тое, што яны робяць. Дарэчы, экспертызу рэчы праходзяць строгую. Але ж Лілія і падкажа, як лепей зрабіць, каб рэч набыла статус мастацкай. Напрыклад, модная вышыўка знойдзе шлях да прыхільніка куды хутчэй, калі будзе размешчана на пэўных вырабах адзення ці аксесуарах.

Пасля набыцця вопыту, у якім ёсць месца памылкам, некаторыя самадзейныя творцы пачынаюць адчуваць смак да такой работы. І нават рашаюцца зрабіць адказны крок: зарэгістравацца ў якасці рамесніка. Тут Лілія Калюжная дапаможа ўсімі неабходнымі кансультацыямі:

— Зарэгістравацца ў якасці рамесніка сёння вельмі проста. У людзей ёсць жаданне, але няма ўяўлення — як працаваць. Не хапае нашым рамеснікам адукацыі. Калі маё ўяўленне дапаможа некаму, гэта так добра. Мы ж тут не толькі разліковы рахунак падкажам, але і ўсё бізнес-вядзенне, крэатыўнае суправаджэнне ажыццявім. У нас штодзень мазгавы штурм. Да таго ж кожны, хто сюды прыходзіць, мяне эмацыянальна напаўняе, і я такая шчаслівая ад гэтага!

Лілія расказвае, што вакол hand made-палічкі збіраюцца людзі самых розных прафесій. Тут, напрыклад, тусуюцца майстры з каледжа мастацкіх промыслаў, што заканамерна. Але ж не менш цікавыя вырабы сюды прыносяць урачы, псіхолагі, прыбіральшчыцы ці нават судмедэксперты:

> Каворкінг-праект для рамеснікаў — гэта, па сутнасці, некалькі дзясяткаў невялічкіх крамак пад адным дахам. Пры гэтым рамеснік аплачвае арэнду толькі за маленькую плошчу — паліцу.





— У нас ёсць такая форма работы — дзень з майстрам. Ён можа прысці ў краму, паразмаўляць з пакупнікамі. Ці проста інкогніта паглядзець, што людзі кажуць пра яго вырабы, і такім чынам атрымаць зваротную сувязь. Пры адкрыцці вакол нас сабралася чалавек 70. Потым гэтая лічба павялічылася, і было каля 120 чалавек. Менавіта яны запоўнілі анкеты, атрымалі кансультацыі, а таксама пляцоўку для сваіх работ, стасункі з калегамі... Штосьці для сябе зразумелі, у нечым разабраліся.

Каворкінг-праект для рамеснікаў — гэта, па сутнасці, некалькі дзясяткаў невялічкіх крамак пад адным дахам. Пры гэтым рамеснік аплачвае арэнду толькі за маленькую плошчу — паліцу. Сам выстаўляе на ёй вырабы, сам вешае цэннікі, прасоўвае свае работы. Пры гэтым Лілія Калюжная дапамагае яшчэ і скласці цікавыя гісторыі, якія спрыяюць у продажы скрыначак, упрыгожванняў для валасоў, лялек ці расписных шалікаў.

Стымпанк, пэчворк, дэкупаж, тапіарый, фааміран... Дзівосныя іншаземныя словы знаходзяць рэальнае ўвасабленне на драўляных палічках-скрынках. І ўсё аказваецца не так страшна.

— Прынамсі, як і рэгістрацыя ў якасці рамесніка, якой спрыяе сённяшняе беларускае заканадаўства, — кажа Лілія. — Людзі вельмі актывізаваліся. Але і бізнес таксама зразумеў, што трэба працаваць у гэтым кірунку. Напрыклад, раней ніхто не ўяўляў, як гэта — здаваць у арэнду паліцы. Цяпер здаюць. Многія з рамеснікаў зарэгістраваліся афіцыйна.

Пра кожнага з тых, чые вырабы з'явіліся на палічках, прадпрымальнік Калюжная расказвае з гонарам і бляскам у вачах. Яны для яе сталі нават не калегамі, хутчэй — сяброўкамі. Разам яны ладзяць не толькі бізнес, але і шматлікія дабрачынныя мерапрыемствы. Напрыклад, нядаўна сабралі 40 «Скрынак адвагі» для дзяцей, хворых на анкалогію.

— Мяне саму праект моцна змяніў, — гаворыць Лілія. — Ён мяне напоўніў. Многія гады я была музай мужа. Калі ён загінуў, у мяне на пэўны час заставалася толькі работа. Трэба было трымаць сям'ю на тым жа ўзроўні, як трымаў ён. Я стала канём, які свету белага не бачыў. Які сэнс у такой працы? Пэўны час шчыльна займалася адукацыяй дачкі, але цяпер ёй 12, а сыну 25 і трэба прыпыніць апеку. Думала, чым надалей заняцца. У мяне некалі былі вясельныя салоны, але штосьці не зрасталася. Цяпер ёсць творчасць і штодзень — адкрыццё.

Між тым многа яшчэ тых, хто сумняваецца: ці атрымаецца зарабляць на жыццё сваім творчым хобі ў афіцыйнай якасці рамесніка? На што прадпрымальнік Калюжная раіць:

— Пачынайце! Ідзіце рэгістравацца, дакладна вывучыўшы заканадаўства. Абавязкова трэба спрабаваць. Рамесніцтва — толькі прыступка для раскрыцця далейшых магчымасцяў. Яно можа такой прыступкай і застацца, але можа развіцца ў свой бізнес. І я ведаю такія прыклады. Атрымліваецца ў тых, хто хоча ўдасканальвацца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**❍ ДАРЭЧЫ**

**Як паведамілі ў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Гомельскай вобласці, з моманту прыняцця Указа «Пра ажыццяўленне фізічнымі асобамі рамеснай дзейнасці» ў кастрычніку 2017 года больш за 1000 жыхароў Гомельшчыны зарэгістраваліся ў якасці рамеснікаў.**

РЭГІЯНАЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА

# У НЯСВІЖЫ, ЯК У ТОЙ ГРЭЦЫІ, ЁСЦЬ АМАЛЬ УСЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 13-й стар. «МС».)*

Улічваючы, што Нясвіж — турыстычная зона, шмат іншагародніх жадаюць зарабляць на продажы сувеніраў, уласнай прадукцыі. Для гэтага вызначаны канкрэтныя пляцоўкі. Але грамадзяне хочуць працаваць менавіта там, дзе найбольш турыстаў, — у зоне ад касцёла Божага Цела да палаца Радзівілаў. Іншыя месцы іх не цікавяць, нават цэнтр горада.

— І ўсё ж, якую дзейнасць варта развіваць: гандаль, вытворчасць? — пацікавілася ў намесніка старшыні райвыканкама.

— У нас дастаткова розных формаў гандлю: спажывецкая кааперацыя, дзяржаўныя, прыватныя, ведамасныя, — лічыць Людміла Віктараўна. — Толькі гандаль «Агракамбіната «Сноў» займае каля 30 % ад агульнага тавараабароту. Практычна ўсе сельгаспрадпрыемствы таксама маюць свае крамы. У горадзе працуюць крамы «Дабраном», «Еўраопт». Прычым сеткавікі прыходзяць і ў сельскую мясцовасць. Напрыклад, той жа «Еўраопт» адкрыў свае пункты ў вёсках Студзёнка, Аношкі. Акрамя таго, вяскоўцаў абслугоўваюць і тры аўтакрамы гэтай сеткі.

У раёне зацікаўлены ў больш актыўным развіцці вытворчасці: тут можна стварыць нашмат больш рабочых месцаў, чым у гандлі. Для гэтага ёсць неабходныя плошчы, дастаткова вялікае памяшканне былога льнозавода. У раёне дастаткова кваліфікаванай рабочай сілы.

Дадам, што доля паступленняў ад малога і сярэдняга бізнесу ў раённы бюджэт штогод павялічваецца і дасягнула амаль 30%.

> Нясвіж адносіцца да малых гарадоў і тут адпаведна дзейнічаюць ільготы, якія вызначаны ва ўказах, дырэктывах, пастановах. Таму сваю справу ў населеным пункце рэгіструюць нават жыхары з вялікіх гарадоў, напрыклад Мінска.

Гэта немалая сума. І мясцовыя ўлады імкнуцца дапамагаць прыватнаму бізнесу развівацца, ідучы яму насустрач, фарміруюць зямельныя пляцоўкі для арганізацыі вытворчасці, гандлю, іншых паслуг. У Нясвіжы разумеюць, што гэта яшчэ і новыя працоўныя месцы. У эканоміцы раёна занятыя 19 тыс. работнікаў, у тым ліку каля 6 тыс. — на прадпрыемствах і ў арганізацыях недзяржаўнай формы ўласнасці. Разам з тым новыя вытворчасці — гэта дадатковая магчымасць пашырэння экспарту тавараў. Сёння доля прадпрыемстваў пазаведамаснай падпарадкаванасці займае больш 60 % ад агульнага экспарту тавараў раёна.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Стаматолаг, цырульнік і прыватызацыя жылля

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар. «МС».)

Апошні прымаў грамадзян у вёсцы Харава. Да Мікалая Пятровіча прыйшлі некалькі жанчын — работніц ААТ «Айчына» са сваёй бядою. Менавіта так яны назвалі прыватызацыю жылля, праведзеную гаспадаркай некалькі гадоў таму. Яны ў свой час падпісалі дакументы на выкуп сваіх дамоў на працягу 10 гадоў. І цяпер пенсіянеркі вымушаны працаваць у паляводстве, бо плацяжы ў памеры каля 300 рублёў кожны месяц для іх выглядаюць непад'ёмнымі. Гэту сітуацыю ведаюць у раёне, але дапамагчы людзям пакуль не змаглі. Справа ў тым, што названая гаспадарка раней падпарадкоўвалася адной рэспубліканскай структуры, а калі фінансавыя справы пайшлі ўніз, сельгаспрадпрыемства вярнулі раёну. Відавочна, пра людзей тут раней не асабліва дбалі. Жанчыны прыводзяць прыклад, што ў суседнім ААТ «Агра-Калядзічы» такія ж работнікі за прыватызацыю такіх жа дамоў плацяць капейкі. «А я з 16 гадоў кароў даіла, — гаворыць адна з заяўніц. — У гэты дом за дзесяцігоддзі ўклала столькі грошай на рамонт! Цяпер павінна ўсю чыста пенсію аддаваць за прыватызацыю. А за што жыць?» Калі рыхталіся дакументы, работнікаў запэўнівалі, што інфляцыя вельмі хутка ўсё з'есць, і плацяжы стануць невялікімі. Насамрэч выйшла не так... Яны ўжо былі многа ў каго на прыёмах, але не трацяць надзеі, што нехта ўсё ж дапаможа. Старшыня райсавета паабяцаў правесці кансультацыі з парламентарыямі ад свайго рэгіёна, каб знайсці рашэнне праблемы на рэспубліканскім узроўні. Бо гаспадарка з яе сённяшнім эканамічным станам не можа нават выкупіць акцыі ў названых работнікаў, каб яны маглі накіраваць гэтыя грошы на плацяжы за прыватызацыю.

Іншыя звароты мелі не такі глабальны маштаб, і пытанні па іх будуць вырашаныя на мясцовым узроўні. Напрыклад, супрацоўнікам Хараўскога дома культуры паабяцалі нарэшце падсыпаць тэрыторыю, каб не стаяла лужына каля ўвахода.

## КУРС НА ЎРБАНІЗАЦЫЮ

Як расказала старшыня Хараўскога сельскага Савета Алена Пстыга, сельсавет сёння складаецца з 20 вёсак, у іх пражывае амаль 2700 чалавек. Па сельсавеце налічваецца 116 пустуючых дамоў. Па некалькі за год іх разбіраюць сельгаспрадпрыемствы і ўводзяць землі ў севазварот. Цікавымі звесткамі можна назваць і такія: на ўліку ў спісе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, стаяць 63 сям'і. Але ніхто з іх не выказаў жадання ўзяць участак пад будаўніцтва ў сваім сельсавеце. Ніхто сёлета не ўзяў участак зямлі для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. У 62 працэнтаў дамашніх гаспадарак на падворку няма ніякай жывёлы. Выходзіць, што насельніцтва трымае курс на ўрбанізацыю?

## КАРЫСНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

І ў той жа час на пасяджэнні прыводзіліся факты, якія сведчаць, што асабістая падсобная гаспадарка вітаецца на тэрыторыі сельсавета. Напрыклад, на ўсёй тэрыторыі ўтрымліваецца 46 прыватных кароў. Збор малака ад іх арганізаваны Пружанскім малочным заводам, і наракання ад насельніцтва не паступае. Цікава вырашылі праблему апрацоўкі прысядзібных участкаў у двух вёсках, што ўваходзяць у ААТ «Айчына». Гаспадарка заключыла дагаворы з двума вяскоўцамі на ўтрыманне калгасных коней. Гэтыя гаспадары трымаюць коней ва ўласных хлявах. І ўсе ахвотныя бяруць цяглавую сілу для апрацоўкі сваіх прысядзібных участкаў. А старасты вёсак кантралююць працэс, бяруць невялікую плату за карыстанне коньмі. Палова гэтых сродкаў ідзе на пакупку аўса для жывёлы, другая палова — на аплату працы тых, хто даглядае коней. Такім чынам вырашаецца пытанне апрацоўкі агародаў, а таксама прыдамавых сотак, і людзі задаволеныя.



Былы староста Віктар АМЕЛЬЯНЧУК.

Яшчэ раз згадвалі добрую ініцыятыву ААТ «Айчына», калі гаворка ішла пра бытавое абслугоўванне насельніцтва. Як высветлілася, гаспадарка ў сваім штаце трымае цырульніка. Гэта зроблена па просьбе пажылых людзей, якім цяжка за бытавой паслугай ехаць у райцэнтр. А так і людзям зручна, і гаспадарка не страчвае, цырульнік на сваё ўтрыманне зарабляе.

## ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ І Ў ГАНДЛЁВАЙ СФЕРЫ

А вось за стан некаторых гаспадарчых аб'ектаў, за машынныя двары гэтую гаспадарку крытыкавалі. Паводле інфармацыі кіраўніка рабочай групы Алены Лапыка, не паўсюль яшчэ наведзены прывабны выгляд. Алена Харытонаўна прадэманстравала фотаздымкі, на якіх адлюстраваныя стыхійныя звалкі ды іншы непарадак на зямлі. На адным з такіх несанкцыянаваных сметнікаў нават былі мэбля і халадзільнік. Гэта сведчыць найбольш аб нядобрасумленнасці грамадзян, якія выкідаюць былыя ва ўжыванні рэчы дзе заўгодна. Але разбірацца з гэтым давядзецца мясцовай уладзе разам з камунальнікамі. Найбольшую занепакоенасць выказала кіраўнік райсельгасхарча станам ачышчальных збудаванняў крухмальнага завода, які скідвае сцёкі ў поле. У выніку пацярпелі пасевы кукурузы. Гэта ўжо не толькі эканамічныя страты канкрэтнай гаспадаркі, а экалагічная праблема, якую трэба вырашаць неадкладна.

Атрымаў заўвагі і раённы гандаль, бо выяўлены факт, калі аўтакрама прыйшла ў пункт прызначэння каля дзясяці гадзін вечара. І хоць кіраўнік райспажыўсаюза запэўніў, што гэта факт адзінкавы, але атрымаў даручэнне скарэктаваць графік руху аўтамагазінаў, каб гандлёвае абслугоўванне было зручным для пакупнікоў.

## АЎТАРЫТЭТНЫ СТАРАСТА

Дарэчы, заўвагі членам рабочых груп падчас іх работы не раз выказвалі старасты вёсак. Яны ў поўным складзе былі запрошаныя на пленарнае пасяджэнне. Прыйшлі не толькі тыя старасты, якія працуюць у гэтым скліканні, запрасілі і ветэрана. Віктар Васілевіч Амельянчук — былы дырэктар Навасёлкаўскай школы, 18 гадоў быў старастам вёскі Кабылаўка. Акрамя гэтага, Віктар Васілевіч пэўны час узначальваў раённы савет старастаў, вёў вялікую грамадскую работу. Яму якраз споўнілася 70 гадоў, з чым яго шчыра павіншавалі ў такой вялікай аўдыторыі і падзякавалі за вялікую сумесную работу па добраўпарадкаванні свайго населенага пункта. У гэтай вёсцы ён карыстаецца велізарным аўтарытэтам. І ўшанаванне былога старасты і сельскага педагога стала прыемным і прыгожым момантам афіцыйнага мерапрыемства.

## ПЕРАЛІК ДАРУЧЭННЯЎ

Старшыня райвыканкама Міхаіл Крэйдзіч, які выступіў напрыканцы пасяджэння з кароткім аналізам дня сельскага Савета, яшчэ раз засяродзіў увагу на справах, што патрабуюць аператыўнага вырашэння. Напрыклад, паводле меркавання кіраўніка раёна, можна арганізаваць работу стаматолага ў Навасёлкаўскай амбулаторыі хоць бы раз на тыдзень, як таго просяць людзі. Ён лічыць таксама, што не варта зацягваць з рамонтам і пашырэннем плошчы крамы ў аграгарадку Калядзічы, бо гэты гандлёвы аб'ект запатрабаваны ў жыхароў. Патрабуюць рамонту і іншыя магазіны буйных населеных пунктаў. Былі таксама прыведзены прыклад эфектыўнасці рабочых груп. Ён датычыўся работы гандлёвых аб'ектаў ААТ «Айчына». Калі група пад кіраўніцтвам Святланы Ханавец наведвала крамы больш за два тыдні таму, быў выказаны шэраг заўваг. А калі зазірнулі туды ў дзень Савета, упэўніліся, што амаль усе хібы выпраўлены. Ну і, вядома, рыхталіся да мерапрыемства, у Калядзічах нават паставілі частку новай агароджы па цэнтральнай вуліцы.

Па выніках дня Савета ў Хараве складзены пералік мерапрыемстваў і неабходных спраў з тэрмінамі іх выканання і адказнымі асобамі. Падчас наступнага дня Савета на іншай тэрыторыі Алена Пстыга паведаміць калегам, што зроблена з таго пераліку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Пружанскі раён.*

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

# КВЕТКАМ У ВАЗОНАХ ТУТ НЕ МЕСЦА

## У пад'ездзе забараняецца ўтрымліваць жывёл і... пчол

**Што можна захоўваць на лесвічнай пляцоўцы? Здавалася б простае пытанне... Вось толькі спецыялісты ЖКГ у адзін голас паўтараюць — на лесвічнай пляцоўцы ўвогуле нічога не павінна стаяць і вісець. Так, рэчы жыхароў — шафы, камоды, веласіпеды, калыскі, ролікі і іншая маёмасць — ні тут, ні ў тамбурах, якія прымыкаюць да кватэр, захоўваць нельга. Аб гэтым паведамляе партал камунальнай адукаванасці насельніцтва gkx.by**

Датычыцца забарона і кветак у вазонах, і ўборачнага інвентару, і нават дыванкоў каля парога. Хіба што на рэпрадукцыі на сценах і абутак каля парога камунальнікі могуць заплюшчыць вочы. Рэгулюецца такое катэгарычнае стаўленне да захламленасці лесвічных пляцовак і тамбураў Правіламі карыстання жылымі памяшканнямі.

— У прыватнасці, пункт 16 згаданых Правілаў абвяшчае, што загрувашчванне калідораў, лесвічных маршаў і пляцовак, праходаў, запасных выхадаў і іншых дапаможных памяшканняў не дапускаецца, — расказвае **загадчыца сектара інфармацыйна-кадравай і прававой работы ЖКГ № 1 Фрунзенскага раёна Мінска Вольга БАРАНОЎСКАЯ.** — Камунальныя службы рэгулярна вывешваюць на сценах аб'явы з рэкамендацыямі прыбраць лішнія рэчы з пад'ездаў, часам даводзіцца рабіць паквартэрны абход, каб растлумачыць жыхарам неабходнасць захавання правілаў пражывання і ўтрымання агульнай маёмасці.

Але задумваемся мы аб выкананні правілаў тады, калі непасрэдна нас «прыцісне». Вось у гэтым выпадку самі жыхары і скардзяцца на суседзяў, якія ўсё непатрэбнае выстаўляюць за дзверы кватэр.

Акрамя Правілаў карыстання жылымі памяшканнямі існуюць і Правілы пажарнай бяспекі для жылых будынкаў, у адпаведнасці з якімі кватэранаймальнікі абавязаныя «не дапускаць захоўвання асабістай і іншай маёмасці ў месцах агульнага карыстання». Звязана гэта з тым, што шляхі эвакуацыі пры пажары ці іншым здарэнні павінны быць вольныя для праходу. Дарэчы, за парушэнне правілаў пажарнай бяспекі могуць вынесці папярэджанне або накласці штраф у памеры да 30 базавых велічынь.

А пакуль запамінаем, чаго ў пад'ездзе і дапаможных памяшканнях шматкватэрнага жылога дома рабіць нельга. Усяго дзевяць пунктаў.

Першае, парушаць умовы жыцця суседзяў, іх правы і законныя інтарэсы, ды і псаваць самі памяшканні таксама натуральна нельга. **Другім, досыць ёмістым пунктам будзе курэнне. Як з ім змагацца на практыцы?** Лёгка. Ва ўсіх ёсць сотавыя тэлефоны з рэжымам відэа. Знялі і прыгразілі пайцы з заявай на парушальніка ў ЖЭС. Паўторнае курэнне будзе каштаваць яму дорага. Хто жадае праверыць?

Потым ідзе «нельга» на — сушыць бялізну; загрувашчваць калідоры, лесвічныя маршы і пляцоўкі, праходы, запасныя выхады; утрымліваць жывёл, у тым ліку пчол; самавольна ўсталёўваць на дахах і фасадах антэны і іншыя канструкцыі.

І, зразумела, у месцах грамадскага карыстання забараняецца:

— захоўваць выбухованебяспечныя, атрутныя і такія, якія забруджваюць паветра, рэчывы і прадметы, а таксама лёгкаўзгаральныя рэчывы (гэта датычыцца таксама балконаў і лоджый);

— рабіць склепы і іншыя памяшканні пад балконамі і лоджыямі, на паверхах, у падвалах і тэхнічных падполлях;

— займацца пераўладкаваннем або перапланіроўкай, выконваць работы, звязаныя са змяненнем архітэктурна-планіровачных рашэнняў будынкаў, якія ўплываюць на апорную здольнасць іх канструкцый.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СВЯТА Ў ХАТУ

**Сапраўднае свята народнай песні і творчасці аматараў фальклору Іванаўскага, Кобрынскага, Бярозаўскага і Драгічынскага раёнаў адбылося на гасціннай Опальскай зямлі. Рэпартаж адтуль зрабіла газета «Янаўскі край».**




Распачалася святочная праграма ўрачыстым шэсцем. Шчырая гаспадыня фэсту пані Габрыэла Залеўская вітала ўсіх удзельнікаў, запрашаючы да сябе ў маёнтак. Асноўнае дзеянне разгарнулася на некалькіх канцэртных пляцоўках. Гістарычная пастаноўка суправаджалася музычнымі выступленнямі творчых калектываў.

«Наш абавязак — упрыгожыць аграгарадок, зрабіць жыццё ў ім утульным і прыемным», — падкрэсліў ураджэнец аграгарадка, **намеснік старшыні Іванаўскага райвыканкама Віталь КЛЫШКО.** Прадоўжылася свята этна-вечарынай «Опальская саля», на якую нарэшце прыбыў сам пан Багуслаў. Кожны гарманіст падчас выхаду на сцэну павязваў стужку на кола і граў свае музычныя кампазіцыі. Астатнія ў гэты час танцавалі і весяліліся, змагаючыся за званне найлепшага танцора салі.

## ПОЛАЦКАЙ ГЭС СПАЎНЯЕЦЦА ГОД

**Карэспандэнт «Полацкага весніка» завітаў на станцыю, каб высветліць, як яна гэты час прапрацавала.**



— За першы год эксплуатацыі мы выпрацавалі больш за 120 мільёнаў кВт/г электрычнай энергіі і на 8 мільёнаў кВт/г перавысілі праектныя даныя, — расказвае **начальнік Полацкай ГЭС Васіль ВЯЛЮГА.** — Гэты паказчык абумоўлены тым, што мінулы год быў досыць шматводным, таму і гадавы план выканалі без асаблівага напружання. 2018-ы пачаўся таксама досыць бурна, з вясновымі паводкамі, але май і чэрвень выдаліся даволі засушлівыя. На сёння з улікам запасу вады ў вадасховішчы плошчай 1710 га, якое размешчана перад Полацкай ГЭС і з'яўляецца адзінай крыніцай для выпрацоўкі энергіі, у нас працуюць тры гідраагрэгаты з пяці.

Як адзначаюць спецыялісты, сур'ёзных адхіленняў, збояў ці парушэнняў у рабоце ГЭС не выяўлена. На станцыі працуюць 18 чалавек, дзесяць з іх — гэта аператыўны персанал, які забяспечвае кругласутачнае дзяжурства. Сістэма кіравання гідраэлектрастанцыі ў аўтаматычным рэжыме дазваляе кантраляваць усе параметры.

## СМЕЦЦЕ — НА КАРЫСЦЬ

**На Жлобіншчыне плануецца рэалізаваць інвестыцыйны праект па будаўніцтве смеццеперапрацоўчага завода. Пра гэта паведамляе раённая газета «Новы дзень». На прадпрыемстве з камунальных адходаў будуць атрымліваць паліва.**

Тэхналогія дазволіць звесці да мінімуму пахаванне камунальных адходаў на палігоне ў Праскурнях, прыярытэт будзе аддадзены іх другаснаму выкарыстанню і перапрацоўцы. У раёне вядзецца вялікая работа па асобным зборы адходаў і адабранні з іх другасных матэрыяльных рэсурсаў. Зараз атрымліваюць 28 % другаснай сыравіны, у сярэднім па рэспубліцы — 14 %. Да таго ж у рамках праекта па «зялёнай» эканоміцы праводзіцца ўкараненне сучасных тэхналогій на Жлобінскай ЦЭС, якія скарачаюць шкодныя выкіды. Дарэчы, сёлета ў раёне плануецца высадзіць 6,1 тыс. дрэў і кустоў.

## ШАНЦ НА АДРАДЖЭННЕ

**Трыста алтайскіх маралаў прывезлі на Лідчыну з Расіі ў лютым 2017 года. Карэспандэнт «Лідскай газеты» завітаў на ферму і спытаў, як жыве гэты незвычайны для Беларусі праект.**

У Лесніках засталіся толькі некалькі старых жыхароў. Але Ігар Андрушка дае населенаму пункту шанц. Ён вырашыў адрадзіць вёску, у якой жылі два пакаленні яго сям'і. Добрыя намеры знайшлі падтрымку і разуменне з боку многіх людзей. «Праект «Сібірскі падворак», менавіта так ён называецца, з'явіўся з мэтай далейшага развіцця кампаніі, якая існуе на рынку Беларусі шмат гадоў, — расказвае заснавальнік. — Ідэй было шмат. Але вырашылі спыніцца на стварэнні племянной гаспадаркі па развядзенні і ўтрыманні аднаго з падвідаў высакароднага аленя — алтайскіх маралаў. У студзені 2015 года звярнуліся ў Лідскі райвыканкам з прапановай аб рэалізацыі гэтага праекта на тэрыторыі раёна. У выніку ён знайшоў падтрымку і з боку мясцовай улады, і з боку намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Івана Жука. У бязвыплатнае карыстанне нам былі выдзелены зямельныя ўгоддзі плошчай 288 гектараў, што побач з вёскай Леснікі».

Кіраўнік праекта ўпэўнены, што з цягам часу ў Лесніках будуць створаны ўсе ўмовы для развіцця не толькі фермерскай гаспадаркі, але і экалагічнага турызму. «Мы разглядаем развіццё турыстычнага кірунку, а значыць, і будаўніцтва ў перспектыве жылога комплексу, іншых аб'ектаў інфраструктуры», — акцэнтаваў Ігар Андрушка.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ШЧУПАК — КАРОЛЬ ШЧУЧЫНА

**Неардынарнае дзейства пройдзе ў Шчучыне. У Дзень рыбака 8 ліпеня ў цэнтральны вадаём запусцяць жывы сімвал горада — шчупака.**

— Ідэя зрабіць шчупака адным з сімвалаў райцэнтра Шчучын выношвалася даўно, — падкрэслівае **старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК.** — Прычым гэта выглядае лагічна не толькі з пункту гледжання асацыятыўнага ўспрымання. У горадзе і раёне ў цэлым хапае водных аб'ектаў, у якіх водзіцца гэта рыба. Да таго ж за 22 кіламетры ад Шчучына ў лесе знаходзіцца невялікая вёска з назвай Шчукі. Сельскіх населеных пунктаў з аналагічнай назвай у нашай краіне ўсяго два — у Вілейскім раёне Мінскай вобласці і Бешанковіцкім Віцебскай. Пару гадоў таму мы далі нашай вёсцы новае жыццё, пабудаваўшы тут сучасную паляўніча-рыбалоўную гаспадарку «Каменскае». Ну і нельга не адзначыць, што адным з самых распаўсюджаных прозвішчаў у райцэнтры з'яўляецца Шчука.



Улічваючы, што менавіта шчупак здаўна лічыцца агульнапрызнаным сімвалам упэўненасці і сілы, чысціні і прыгажосці, магутнасці і высакароднасці, мы і вырашылі зрабіць яго своеасаблівым захавальнікам нашага горада, — падсумаваў Сяргей Васілевіч.

Калі паглыбіцца ў гісторыю, можна даведацца, што Шчучын заснаваў чалавек з прозвішчам Шчука. Праўда, пра яго і яго заслугі нічога невядома. На гербе горада значыцца манаграма зусім іншай асобы — надворнага маршалка Вялікага Княства Літоўскага Ігнацыя Сцыпіёна, які ўнёс значны ўклад у яго развіццё. Гэта стылізаваныя літары «I» і «S». Аднак рыбалоўная прырода горада і раёна ў цэлым агульнавядомыя. Пра яе сведчаць не толькі аповеды рыбакоў пра злоўленую рыбу, але і мноства сельскіх населеных пунктаў з мілымі рыбацкаму сэрцу назвамі. Акрамя Шчукі, гэта Рыбакі, Вайшчукі, Лешчанка, Карпанаўцы, Матылі, Прудцы, Патока і іншыя.

Статыстыка наглядна адлюстроўвае словы Сяргея Ложачніка. Прозвішча Шчука носяць 21 жыхар Шчучынскага раёна. Больш такіх прозвішчаў, што таксама цікава, толькі ў суседніх Мастоўскім (97) і Гродзенскім (28) раёнах, а таксама ў абласным цэнтры — 79.

Памятаючы, што прозвішчы ў даўніну на голым месцы не з'яўляліся, можна меркаваць, што шчупакоў у навакольных рэках і азёрах раней было хоць гаць гаці. Вось толькі сёння на карце Шчучынскага раёна адпаведных у гэтым плане водных аб'ектаў практычна няма. Рака Нёман мудрагеліста віхляе па паўднёва-ўсходняй мяжы, а ў азёрах пераважае іншая рыба. Пагаворваюць, што шчупакамі ў даўніну была перапоўнена рэчка Тураўка, якая з'яўляецца прытокам ракі Тур'я, што ўпадае ў Нёман. Але, зноў жа, пацвярджэння гэтаму няма.

Не сумняваючыся, што ўзнікненне Шчучына проста абавязана быць звязана з якой-небудзь «рыбнай» легендай, паспрабаваў яе адшукаць. Вывучэнне гісторыі і літаратуры ні да чога не прывялі, аднак дзякуючы добраму знаёмаму з ліку рыбакоў старой савецкай гвардыі пачуў невядомую раней займальную гісторыю паходжання райцэнтра.

Даўным-даўно на месцы сучаснага Шчучына быў дрымучы лес, праз які цякла рака. Неяк юнак, які вандраваў па свеце, прыйшоў да яе берагоў. Ад стомленасці, смагі і голаду сілы амаль пакінулі яго. У гэты момант на паверхні ракі паказаўся шчупак. Ён так моцна ўдарыў па вадзе хвастом, што на бераг вылецела мноства дробных рыб, а грунт, які абсунуўся, адкрыў дарогу крыніцы. Гэта выратавала юнаку жыццё. Каб аддзячыць, ён пацалаваў рыбу-выратавальніцу, якая тут жа ператварылася ў прыгожую дзяўчыну. Аказалася, пацалунак зняў з яе праклён злога духа за адмову выйсці замуж.

Зачараваны прыгажосцю дзяўчыны, юнак папрасіў у яе рукі і сэрца, атрымаўшы згоду. У каханні і радасці яны пражылі доўгае жыццё, заклаўшы ў месцы сустрэчы каля ракі паселішча. А назвалі яго ў гонар рыбы, якая зрабіла іх шчаслівымі. З часам у тых краях узнік горад Шчучын, шэраг жыхароў якога да гэтага часу носяць прыгожыя прозвішчы.

Як казаў мудрэц, легенда — прыёмная дачка гісторыі. Яна дарые ісціну, якая выходзіць за межы ўспамінаў. Таму яе не варта адхіляць.

Наогул, адзінства Шчучына і шчупака прадыктавала само жыццё. Нават калі прыгледзецца да герба райцэнтра, у літарах «I» і «S» можна разгледзець сакральныя рыбалоўныя сімвалы. «I» нагадвае вудзільна, а «S» — два састыкаваныя паміж сабой кручкі. Ну і цікавым дапаўненнем з'яўляецца той факт, што польскім горадам-пабрацімам беларускага Шчучына значыцца зноў жа Шчучын. Толькі з берагоў ракі Віса, што ў Падляскім ваяводстве. Пэўна, у яго таксама ёсць свая легенда, толькі зусім іншая.

**Сяргей ШАРШАНЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2018 года.**